Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

2 СНЕЖНЯ 2017 г. СУБОТА №233 (28597)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Справа дольшчыкаў
СТАР. 4

Які спектакль найлепшы?
СТАР. 9

Тэст-драйв Atlas
СТАР. 22

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:

«Прыёмы грамадзян важныя для ўдасканалення работы праваахоўных органаў. І з уласнага досведу магу сказаць, што зваротаў, асабліва крытычнага зместу, не бывае шмат там, дзе добра наладжана работа з людзьмі. Дарэчы, запатрабаванай стала электронная форма звароту. Жыхары часцей за ўсё звяртаюцца да праваахоўнікаў з пытаннямі, якія датычацца сферы дзейнасці міліцыі грамадскай бяспекі, — просяць аказаць дапамогу ў вышуку страчанай маёмасці і дакументаў, прыняць меры да асоб, якія злоўжываюць спіртным, выказваюць заўвагі і прапановы па арганізацыі і забеспячэнні бяспекі дарожнага руху».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.12.2017 г.

Долар ЗША	2,0114	▼
Еўра	2,3974	▲
Рас. руб.	0,0343	■
Укр. грыўня	0,0742	▲

ISSN 1990 - 763X

Узорныя адносіны і амбіцыйныя перспектывы

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Прэзідэнтам Таджыкістана

Фота БЕЛТА.

Гэты тыдзень выдаўся вельмі насычаным для палітычнага жыцця дзяржавы. Трэці дзень запар сталіца прымае лідараў іншых краін. Пасля перагавораў з Прэзідэнтам Казахстана, саміту АДКБ, у якім прынялі ўдзел лідары ўсіх краін — удзельніц Арганізацыі, кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з лідарам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам.

Перспектыў шмат

Гэтая горная краіна з Сярэдняй Азіі, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, гістарычна блізкая Беларусі. Як і наша краіна, сучасны Таджыкістан імкнецца да шматвектарнасці, да падтрымання добразычлівых і ўзаемавыгадных кантактаў як з экс-савецкімі краінамі, так і з дзяржавамі свайго рэгіёна, а таксама з геаграфічна больш аддаленымі партнёрамі.

СТАР. 2

«Дзень гімназіста» ў Траецкім

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску Ірына МЫШКАВЕЦ — распрацоўшчыца канцэпцый многіх экспазіцый, прысвечаных розным перыядам жыцця славутага паэта. Ірына Віталеўна — аўтар мастацка-дакументальнай выстаўкі «Дзень гімназіста», якая прадстаўлена на першым паверсе музея і распавядае пра перыяд 1902—1911 гадоў, калі будучы класік навучаўся ў гімназіях у Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі.

■ Побач з намі

У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Палкоўнік міліцыі Аляксандр Васільеў пра асаблівасці сваёй працы

Хто такі Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ, тлумачыць, напэўна, не трэба. Некалькі тыдняў таму яго прозвішча не сыходзіла з першых радкоў інфармацыйных сайтаў. У гісторыі з рабаваннем магілёўскага банка ён павёў сябе як сапраўдны герой. Адразу ж прапанаваў сябе ў якасці заложніка, каб вызваліць тых, хто трапіў на прыцэл злачынцы, і, можна казаць, цалкам прыняў удар на сябе. Нагодай для сустрэчы стала прыемная навіна. Кіраўніцтва Беларусбанка прыехала ва ўпраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама, каб перадаць падзячны ліст усім міліцыянерам, якія праводзілі беспрэцэдэнтную ў Беларусі аперацыю па вызваленні заложнікаў, і ўручыць імянны наручны гадзіннік першаму намесніку начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў, начальніку крымінальнай міліцыі Аляксандру Васільеву. Для супрацоўнікаў аддзялення, якое падверглася рабаванню, ён стаў чымсьці накшталт анёла-ахоўніка. Прыйшоў у той самы момант, калі сітуацыя магла скончыцца вельмі трагічна. У чытачоў «Звязды» ёсць магчымасць з першых вуснаў даведацца, чаго каштавала палкоўніку тая вытрымка.

— Гэта было ваша ўсвядомленае рашэнне — пайсці ў заложнікі? Ці проста так склаліся абставіны? — пацікавілася карэспандэнт «Звязды» пасля цырымоніі ўзнагароджання.

— Я ехаў затрымліваць злачынцу, і гэта была галоўная думка. А тое, што самому прыйдзецца выступіць, пра гэта нават не думаў.

— Як потым высветлілася ў ходзе следства, гэты чалавек праходзіў службу ў расійскіх міліцэйскіх войсках, а потым яшчэ працаваў у расійскай структуры МНС. Адчувалася, што перад вамі прафесіянал?

— Так. І па позірку, і па дзеяннях было бачна, што ён меў пэўныя навыкі.

СТАР. 8

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

КУПОН ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ на 5-й стар.

Узорныя адносіны і амбіцыйныя перспектывы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі казаць пра палітыку, дыпламатыю, то, прызнаўся Аляксандр Лукашэнка, яму складана ўзгадаць дзяржаву, з якой мы заўсёды так лёгка дамаўляемся:

— Ваш адзін званок, рэкамендацыя, просьба — мы заўсёды выконваем. Калі я вас папрашу, вы да дробязяў карэктныя і пунктуальныя. Таму дай бог, каб у нас такія адносіны складваліся з усімі.

Кіраўнік нашай краіны падзяліўся сваімі прапановамі, якія датычыліся эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з Таджыкістанам і яго суседам — Афганістанам.

— Мы шмат сустракаліся з кіраўніцтвам, бізнес-коламі, палітычнай элітай Афганістана, — адзначыў Прэзідэнт. — Яны просяць, каб мы дапамаглі ім з тэхналогіямі і адкрылі там вытворчасць. Людзі хочуць жыць, вайна рана ці позна скончыцца. Я падумаў, што, калі б мы з вамі пачалі ствараць гэтыя прадпрыемствы — у Таджыкістане, у Афганістане — менавіта з прыцягненнем вашых людзей, мы зрабілі б гэта імгненна.

Таджыкскія партнёры змаглі б стаць лепшымі кансультантамі і праваднікамі. Бо, як адзначыў беларускі лідар, лепш за таджыкаў «сітуацыяй у Афганістане ніхто не валодае».

Яшчэ адна прапанова кіраўніка нашай краіны датычылася стварэння сумесных з нашымі прадпрыемствамі вытворчасцяў на тэрыторыі Таджыкістана.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў Таджыкістана добры вопыт па замене вуглевадародаў на мясцовае паліва, на чыстую энергію, што цікава для Беларусі.

Электробусы для Душанбэ

Нягледзячы на няпростыя ўмовы, Таджыкістан развіваецца — і даволі актыўна. Дзяржава ўдзельнічае ў рэалізацыі маштабных праектаў па будаўніцтве ліній электрапередачы, гідраэлектрастанцый, сучасным уладкаванні сваёй сталіцы — Душанбэ.

— Моцная эканоміка служыць гарантам бяспекі краіны, лепшым шчытом ад знешніх пагроз — тэрарызму, экстрэмізму і іншых негатыўных з'яў сучаснасці, — заявіў падчас перагавораў у пашыраным складзе Аляксандр Лукашэнка.

Краіны могуць дапамагчы адна адной умацаваць эканомікі. Паказальна, што ў гэтым плане бягучы год — вынікоўвы для дзвюх краін. Сёлета ў горадзе Гісары (непадалёк ад Душанбэ) запрацавала зборачная вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі Мінскага трактарнага завода і акцыянернага таварыства «Бабруйскагрэмаш». Развіваецца супрацоўніцтва і ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

У Таджыкістана таксама ёсць шмат такога, што можа зацікавіць Беларусь. Так, у гэтай сярэднеазіяцкай краіне вядзецца вялікая работа ў сферы гідраэнергетыкі, у горназдабывальнай галіне. На завяршальны этап выйшла будаўніцтва Рагунскай ГЭС.

— Спадзяёмся, што нашы суб'екты гаспадарання не застануцца ўбаку і возьмуць самы актыўны ўдзел у праектах, што рэалізуюцца, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гатовы ў поўнай меры забяспечыць патрэбнасці Таджыкістана ў грузавых аўтамабілях, дарожна-будаўнічай, кар'ернай і іншай неабходнай тэхніцы.

Наш бок у сваю чаргу зацікаўлены ў прамых пастаўках высакаякаснага таджыкскага бавоўнянага валакна і гатовы разгледзець іншыя прапановы таджыкскіх вытворцаў. На думку беларускага лідара, неабходна актыўна развіваць цесныя кааперацыйныя сувязі, выпускаць вырабы, што карыстаюцца попытам, і прасоўваць іх на рынкі трэціх краін.

— Дарэчы, мы можам пашырыць наменклатуру прадукцыі, што вырабляецца ў Гісары, за кошт камунальнай, будаўнічай, пажарнай тэхнікі, — сказаў Прэзідэнт. — Трэба стварыць на базе гэтага зборачнага прадпрыемства шматфункцыянальны цэнтр, які забяспечыць комплексны падыход да сумеснага выпуску машын. Тут, акрамя зборкі, павінны вырашацца пытанні гарантыйнага і сэрвіснага абслугоўвання, якаснага навучання мясцовых спецыялістаў.

З улікам нашага вопыту мы, як запэўніў Прэзідэнт нашай краіны, гатовы таксама на базе аднаго з прафесійна-тэхнічных ліцэяў Таджыкістана адкрыць рэсурсны цэнтр, які б садзейнічаў павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўцы людзей па рабочых спецыяльнасцях.

Застаецца нерэалізаваным патэнцыял фармацэўтычнай галіны — гэтае пытанне, дарэчы, узняў сам кіраўнік Таджыкістана. Фармацэўтычная прадукцыя запатрабавана ў Таджыкістане, а наша краіна мае ўласныя прадпрыемствы і вырабляе якасныя лекі па невысокіх цэнах.

— Трэба прапрацаваць пытанне сустрэчных паставак лекавых сродкаў і расліннай сыравіны. Прапаную падумаць пра магчымую фасоўку беларускіх прэпаратаў у Таджыкістане. Гэтая практыка добра зарэкамендавала сябе ў іншых краінах, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Будзе новая «дарожная карта»

У нашага боку ёсць прапановы і на найбліжэйшую перспектыву па рэалізацыі названых праектаў.

— Мы дамовіліся, што ў найбліжэйшы час, можа быць, на вясне, арганізуем у Таджыкістане маштабную выстаўку нашых кампаній. Арганізуем з такім разлікам, каб разам выйсці на афганскі, пакістанскі рынкі. Таму што да нас прыязджаюць кіраўніцтва Афганістана, буйныя бізнесмены і просяць, каб мы арганізавалі пастаўкі тэхнікі, ды і прадуктаў, перш за ўсё туды і дапамаглі адкрыць там зборачныя вытворчасці. Безумоўна, нам вельмі хацелася б, каб да гэтага працэсу вы падключыліся.

Афганістан, з якім мяжуе Таджыкістан, — вялікая краіна з насельніцтвам больш за 30 мільёнаў чалавек. Прэзідэнт Таджыкістана падтрымаў праект па стварэнні вытворчасцяў, якія будуць працаваць на тры краіны.

Лідары таксама дамовіліся выпрацаваць «дарожную карту» адносін Беларусі і Таджыкістана. Гэта — даручэнне Беларуска-Таджыкістанскай міжурадавай камісіі.

Эмамалі Рахмон падтрымаў ініцыятывы кіраўніка нашай дзяржавы і канстатаваў паступальнае развіццё двухбаковых адносін на ўсіх сферах. Ён расказаў, што ў Таджыкістане традыцыйна вельмі шчыра, адкрыта ставяцца да Беларусі і беларусаў. Што да перспектыў супрацоўніцтва, то, на яго думку, трэба перш за ўсё пашыраць гандлёвыя і міжрэгіянальныя сувязі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

У тэму

Віталь ВОЎК, міністр прамысловасці Беларусі, нагадаў журналістам, што ў Таджыкістане адкрылася зборачная вытворчасць тэхнікі МТЗ. Ужо сабраны першыя трактары, абмяркоўваецца далейшае развіццё прадпрыемства:

— Перспектывы вялікія, цікавыя. У галіне прамысловасці і кааперацыі мы прасунемся вельмі сур'ёзна. Далей плануецца стварэнне свабоднай эканамічнай зоны паміж Таджыкістанам і Афганістанам. Тут таксама ёсць пэўныя інтарэсы, у тым ліку для гандлю з Афганістанам. На пасяджэнні міжурадавай камісіі з Афганістанам у будучым годзе гэтыя пытанні будуць абмяркоўвацца, што дазволіць яшчэ больш загрузіць магчымасці нашага сумеснага прадпрыемства і, можа быць, у перспектыве стварыць новае.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Германія і ЗША абмеркавалі ўвод міратворцаў ААН на Данбас

Міністр замежных спраў Германіі Зігмар Габрыэль абмеркаваў з кіраўніком Дзярждэпартамента ЗША Рэксам Тылерсанам адпраўку на ўсход Украіны міратворчай місіі ААН. «Блакітныя каскі» маглі б прасачыць за выкананнем перамір'я і адводам цяжкіх узбраенняў ад лініі размежавання паміж бакамі канфлікту ў Данбасе, заявіў кіраўнік нямецкай дыпламатыі ў Вашынгтоне.

Міністр адзначыў, што яго пазіцыя па пытанні магчымай адпраўкі місіі ААН на Данбас «у значнай ступені» супадае з пунктам гледжання яго амерыканскага калегі, перадае інфармацыйнае агенцтва AFP.

У той жа час Габрыэль сказаў пра «вельмі значныя» разыходжанні з Расіяй наконт таго, як павінна быць арганізавана такая місія.

Праект рэзалюцыі, унесены Масквой на разгляд ААН, прадугледжвае размяшчэнне «блакітных касак» са стралковай зброяй для абароны членаў Спецыяльнай маніторынгавай місіі АБСЕ на лініі размежавання на Данбасе пасля адводу цяжкага ўзбраення бакамі канфлікту. Склад місіі павінен быць узгоднены прадстаўнікамі Кіева і самаабвешчаных «рэспублік», лічаць у Крамлі.

Пры стральбе ў інтэрнаце ўніверсітэта ў Пакістане загінулі дзевяць студэнтаў

Група тэрарыстаў учыніла сёння стральбу ў інтэрнаце сельскагаспадарчага ўніверсітэта ў пакістанскім горадзе Пешавар (правінцыя Хайбер-Пахтунхва). Дзевяць студэнтаў загінулі, мінімум 37 чалавек атрымалі раненні.

Група тэрарыстаў у масках пранікла на тэрыторыю ўніверсітэцкага інтэрната і адкрыла агонь па людзях. Адзначаецца, што ў будынку інтэрната пражываюць звыш 100 студэнтаў, але большасць з іх паехалі дамоў на час рэлігійнага свята ў Пакістане.

Як паведамляе ТАСС, сілы бяспекі Пакістана ліквідавалі чатырох тэрарыстаў. Адказнасць за нападзенне ўзяла на сябе тэрарыстычная групоўка «Тэхрык-і-талібан Пакістан».

Ва Украіне забаранілі серыял «Сваты»

Папулярны серыял «Сваты» больш не будзе паказвацца ва Украіне. Пра гэта паведаміў кіраўнік Дзяржаўнага камітэта краіны па пытаннях кіно Філіп Ільенка.

Такое рашэнне тлумачыцца сітуацыяй, у якую трапіў акцёр Фёдар Дабранраваў, выканаўца галоўнай ролі ў серыяле.

22 лістапада Служба бяспекі Украіны (СБУ) на тры гады забараніла Дабранрававу ўезд у краіну. Пра гэта паведаміла спікер ведамства Алена Гітлянская. Паводле яе слоў, акцёр неаднаразова наведваў Крым і падтрымліваў далучэнне паўвострава да Расіі. У прыватнасці, у адным з інтэрв'ю, апублікаваным на YouTube-канале 1tvnetru, Дабранраваў заявіў, што «Крым павінен быў вярнуцца ў склад Расіі».

У адказ акцёр зняпраўдзіў наведванне паўвострава. У інтэрв'ю russian.rt.com ён заявіў, што не быў там пяць гадоў. 28 лістапада акцёр быў унесены ў спіс асоб, якія прадстаўляюць пагрозу нацыянальнай бяспецы Украіны.

■ Грамадскі кантроль

Рэпутацыя, ільготы і санітарныя санкцыі

Прафсаюз і пракуратура будуць разам разбірацца ў зваротах грамадзян

Першы сумесны прыём у складзе прадстаўнікоў абедзвюх структур прайшоў на Гродзенскім кансервавым заводзе. І невыпадкова. Правы работнікаў дадзенага прадпрыемства галіновы прафсаюз нядаўна абараняў у судзе.

Кадры пачынаюць і выйграюць

Дзмітрый Конюх некалькі месяцаў як на заводзе не працуе. Кажа, што звольніцца вымусілі адміністрацыйныя метады работы кіраўніка (цяпер былога). Дырэктар загадаў камерцыйнаму аддзелу, начальнікам якога быў Дзмітрый, любымі шляхамі даваць выручку ад рэалізацыі прадукцыі на суму 400 тыс. рублёў. А свайму намесніку, Віталю Кісялю — кантраляваць выкананне дадзенага даручэння.

Вядома, клопат аб эканамічным стане павінен праяўляць кожны кіраўнік. Стараліся і спецыялісты. Але выканаць план не маглі — выручка аказвалася ў 3—4 разы меншай. У шэрагу прычын Дзмітрый назваў адсутнасць сыравіны і тэхнічнай дакументацыі як на працэс вытворчасці, так і на саму прадукцыю. Між іншым, якасць кансерваванай агародніны і садавіны ў саміх работнікаў сумнення не выклікае. «Наша прадукцыя заўсёды была на вышыні, — сцвярджае Дзмітрый Конюх. — Але ў яе кошт закладзена вельмі многа выдаткаў. Ад гэтага тавар робіцца неканкурэнтным».

Нізкі ўзровень продажу адбіўся на зарплатах. У адрас адказных асоб гучалі пагрозы аб звальненні. Дзмітрый Конюх і Віталь Кісель вырашылі звярнуцца ў судовую інстанцыю. Іскавую заяву дапамаглі скласці ў абкаме прафсаюзаў работнікаў АПК.

— Іск аднаго з іх датычыўся адмены дысцыплінарнага спагнання і выплаты надбавак у памеры амаль 1 тыс. рублёў, — адзначыў **галоўны прававы інспектар працы Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў АПК Дзмітрый ЦІС.** — У ходзе судовага працэсу ўдалося адстаяць рэпутацыю работніка і дабіцца адмены вымоў. А вось за вяртанне выплат і надбавак прыйдзецца пазмагацца ў судзе.

Што датычыцца іншага работніка, судом Кастрычніцкага раёна Гродна была даказана незаконнасць яго звальнення.

Дарожны зігзаг

Яго спрабуе зрабіць бяспечным начальнік рамонтнага ўчастка Мікалай Банны, які працуе на кансервавым заводзе больш за 10 гадоў. Гэту праблему ён таксама ўзняў на сумесным прыёме прафсаюзаў і пракуратуры. Работнік лічыць, што дарожны зігзаг трэба неяк агарадзіць, бо на гэтым месцы вельмі кепскі агляд і можна трапіць пад машыну. Да таго ж віраж, які быў створаны падчас узвядзення будынкаў жылога мікрараёна, дрэнна асветлены ў цёмны час сутак.

На заводзе сутыкнуліся яшчэ з адной праблемай. У выніку падняцця глебы грунтовыя воды сцякаюць у тэхнічнае памяшканне. Кожны дзень ваду, узровень якой дасягае паўметра, неабходна адпампоўваць. Такія меры не вырашаюць праблему, бо трэба бетаніраваць падлогу. Але ва ўмовах пастаянных ападкаў падобныя работы весці немагчыма, а санітарныя службы рэгулярна наведваюць аб'ект і выпісваюць да 10 базавых велічынь штрафу.

У гэтай сітуацыі Дзмітрый Ціс раіць звярнуцца ў судовую інстанцыю і абгрунтаваць сваю пазіцыю тым, што прадпрыемства ў складаным фінансавым становішчы, а гідраізаляцыю праводзіць немагчыма з-за высокай колькасці ападкаў.

— Трэба правільна абараняцца, — лічыць прававы інспектар.

Зараз рычагоў для гэтага будзе больш, бо да прафсаюзаў далучылася пракуратура. Не так даўно, у верасні, было падпісана пагадненне аб узаемадзеянні паміж Генеральнай пракуратурай і Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі. У рамках супрацоўніцтва праходзяць сумесныя мерапрыемствы па наглядзе і грамадскім кантролі на розных узроўнях.

— У нас адна мэта — абарона законных правоў і інтарэсаў грамадзян, — адзначыла **пракурор аддзела пракуратуры Гродзенскай вобласці Алена ЧАРНЕЎСКАЯ.** — Такія прыёмы дапамагаюць вырашыць пытанне на дасудовай стадыі. Бо непаразуменне паміж работнікам і наймальнікам можна зняць шляхам перамоў, пошуку кампрамісаў. У большасці спрэчак так і адбываецца.

Работнікі завода прыйшлі на прыём з рознымі пытаннямі. Так, інваліду III групы растлумачылі, якія ён можа мець абмежаванні ў рабоце. Работніцы, якая хоча знайсці працу па сваёй спецыяльнасці бухгалтара, але на заводзе працуе аператарам на лініі, Дзмітрый Ціс параіў правільна скласці рэзюмэ, паказаць сябе ў выгадным святле. У той жа час наймальнік не мае права адказаць у працоўным месцы з-за таго, што ў жанчыны двое малых дзяцей. Прававы інспектар паабяцаў высветліць, якія ёсць вакансіі ў прафсаюзнай галіне. Былі дадзены рэкамендацыі тым, хто звярнуўся па жыллёвых праблемах.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога загадчыка аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД КАПЦЭВІЧА Аляксандра Георгіевіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога галоўнага рэдактара газеты «Звязда», старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па друку МАКАЛОВІЧА Івана Пятровіча і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім.

■ Наша гісторыя

НЕ ЗАБЫВАЮЧЫ ПАДЗЕІ МІНУЛАГА

Усебеларускі з'езд 1917 года паказаў каштоўнасці, важныя і да гэтага часу

Так сказана ў прывітанні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, якое ён адрасаваў гасцям і ўдзельнікам канферэнцыі «Падзеі 1917 года ў гістарычным лёсе Беларусі». Само мерапрыемства адбылося ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Прывітанне ва ўрачыстай абстаноўцы зачытаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.

«Падзеі 1917 года спрыялі імкненню беларусаў жыць у сваім доме. Ідэя самавызначэння Беларусі, якая ішла знізу, ад ініцыятывы народных мас, выявілася ў скліканні I Усебеларускага з'езда, — гаворыцца ў вітальным слове Прэзідэнта. — Гэты народны сход прадэманстраваў найважнейшыя каштоўнасці, значныя для нас да цяперашняга дня: сваю дзяржаву, яе сацыяльны характар і той факт, што толькі народ, яго воля, калектыўны розум і лідары могуць стаць сапраўднай крыніцай незалежнасці».

Прэзідэнт назваў і другі ўрок беларускай дзяржаўнасці. «Толькі адзінства ўсіх нас, усяго нашага беларускага народа з'яўляецца гарантам выбару і захавання самастойнага шляху развіцця», — адзначаецца ў прывітанні.

На Усебеларускім з'ездзе ў 1917 годзе выразна прагучала фундаментальная ідэя — стварэнне свайго ўніверсітэта. «Сёння мы яшчэ больш разумеем, што без адукацыі, без навукі не зможам умацаваць незалежнасць нашай дзяржавы. Бо асноўная ея мэта — стварэнне не толькі матэрыяльных, але і духоўных асноў для развіцця Чалавека», — адзначыў у прывітанні Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Максіма Рыжанкова, навукоўцы і спецыялісты адкрываюць зусім розныя бакі падзей 1917 года, калі закладваліся асновы беларускай дзяржаўнасці. «Але яны адзіныя ў меркаванні, што абраны тады шлях быў правільным», — дадаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Каментарый у тэму

Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Гэта была першая спроба артыкуляцыі беларускай нацыянальнай ідэі менавіта ў палітычным плане, стварэнне ўласнай дзяржаўнасці. Гэта вельмі важны нюанс.

Па словах Ігара Марзалюка, сімвалізм канферэнцыі «Падзеі 1917 года ў гістарычным лёсе Беларусі» заключаецца яшчэ і ў тым, што менавіта сто гадоў таму, у снежні 1917 года, на I Усебеларускім з'ездзе Беларусь была як ніколі адзіная.

Георгій АТАМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, прававпарадку і міжнародных сувязях, другі сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі:

— Камуністы прынялі самы непасрэдны ўдзел у станаўленні беларускай дзяржаўнасці. Паглядзіце, як развіваліся падзеі з сакавіка 1917 года. Міліцыя створана кім была? Першы гарадскі Савет дэпутатаў хто стварыў? А далей падзеі пачалі развівацца, зыходзячы з тых умоў, якія склаліся ў гісторыі нашай краіны. Ужо 30 снежня 1918 года ў Смаленску была абвешчаная БССР, а 1 студзеня была абвешчаная Камуністычная партыя Беларусі. Гэта надзвычай складаны перыяд — і трэба паказваць гэты час так, якім ён быў на самай справе.

— Гэта сапраўды інтэгральная падзея, якая адбылася і адбываецца ў сапраўдны момант, — такое меркаванне выказаў **рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ.** — Ідэя непарыўнай сувязі вядучага ўніверсітэта краіны і існавання беларускай дзяржаўнасці паказалі сваю жыццёздольнасць пры самых розных стыхіях. Сёння мы стаім перад неабходнасцю даць адказ на пытанне: а куды далей імкнецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт? Тым больш напярэдадні свайго стагоддзя.

На яго думку, дадзеная канферэнцыя аб'яднала мноства розных спецыялістаў з самых розных сфер: гэта і гісторыя, і права, і іншыя галіны. «Асаблівую ўвагу я ўдзяляю вынікам канферэнцыі, паколькі гэта павінны быць пэўныя рэкамендацыі, якія зафіксаваныя і ў форме канкрэтных прапаноў, і ў форме рэальных механізмаў», — дадаў Андрэй Кароль.

Пагадзіўся з рэктарам БДУ і **прафесар Аляксандр КАХАНОЎСКІ, дэкан гістарычнага факультэта БДУ**. Ён выказаў упэўненасць у тым, што матэрыялы, якія з'явяцца па выніках мерапрыемства, стануць асновай для будучых даследаванняў. «Перад гісторыкамі стаяць задачы па больш глыбокім асэнсаванні тых падзей», — адзначыў прафесар.

— Сапраўды, для Беларусі 1917 год быў асаблівы. Беларусь увогуле была ў вельмі складанай сітуацыі — фронт, розныя нацыянальныя рухі, — сказаў **дырэктар Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Пётр БРЫГАДЗІН.** — І ў гэтым становішчы беларусы зрабілі свой выбар. Ніхто не гаварыў пра самастойную Беларусь, усе казалі пра аўтаномію. Але ж гэта адбылося. І сёння, калі мы разглядаем 1917-ы, то гэта не толькі рэвалюцыі, гэта быў час самавызначэння, аб чым нам трэба памятаць. Трэба гаварыць пра тых людзей, якія зрабілі той выбар.

Дарэчы, больш за 120 навукоўцаў прынялі ўдзел у канферэнцыі. Мерапрыемства атрымалася міжнародным, паколькі сабраліся ўдзельнікі як з Беларусі, так і з Расіі, Польшчы і Чэхіі. Акрамя непасрэднага вывучэння падзей 1917 года, яны ацанілі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні, абмеркавалі сферу дзяржаўна-прававых палажэнняў: што памянялася ў ёй падчас рэвалюцыі, а таксама ў паслярэвалюцыйны перыяд.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«Мяне ніхто не прымушае пагаджацца!»

Таццяна БАРТКЕВІЧ, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Глыбоцкай раённай гімназіі:

— «Звязду» я выпісваю пастаянна, бо гэта мая прынцыповая пазіцыя: калі падтрымліваць, дык сваё, а з усіх беларускамоўных выданняў мне найбольш імпануе ваша газета. Яна для любога ўзросту: тут знаходзіцца месца артыкулам і пра моладзь, і пра іх творчасць, і пра людзей сярэдняга і сталага ўзросту. Напрыклад, з цікавасцю чытала пра тых, хто працягвае працаваць на ўзросце за 90 гадоў, захоўвае ясны розум і не губляе цікавасці ні да жыцця, ні да сваёй працы... Увогуле люблю рубрыку «Людзі і лёсы», героем якой можа быць як акадэмік, так і простая бабулька. Калі чытаю пра «жывога» чалавека, гэта заўсёды падкупляе. Такіх артыкулаў не знойдзеш у сецеве, бо гэта не інтэрнэт-фармат... З цікавасцю чакаю «Крынічку»: у нас ёсць некалькі сотак каля дома, і я заўсёды штосьці сярод вашых парад падгледжу і «вазьму на аловак». І нават, нягледзячы на існаванне інтэрнэту, выражу і захаваю ў сваім нататніку.

Але найперш, вядома, мяне цікавіць усё, што датычыцца школы. І вось тут я ўжо часта ручаюся ад інтэрнэту да выдання на папяровым носьбіце. Спачатку заўважаю артыкул, які мяне зацікавіў, у сацыяльных сетках, а потым ужо, вяртаючыся дадому, разгортваю газету. Бо часу не заўсёды хапае, каб яе чытаць штодня ад першай старонкі да апошняй. А тут саджуся мэтанакіравана і чытаю. Цікавыя тэмы, цікавыя погляды... Я, можа быць, і не заўсёды з усім згодная, але ж мяне ніхто і не прымушае пагаджацца, не навязвае свой пункт погляду, заўсёды прадстаўлены розныя пазіцыі.

Выкарыстоўвала я «Звязду і «Чырвоную змену» і на сваіх уроках. Выразала загалоўкі і прапаноўвала вучням напісаць пад імі свой артыкул, каб потым параўнаць з арыгіналам. Дзецям цікава было пафантазіраваць, што хаваецца за пэўным загалоўкам, таму і аповеды атрымаліся вельмі цікавыя. А «Чырвонка» потым пра нас яшчэ і напісала. Такім чынам мы і самі сталі героямі газеты. Дарэчы, нядаўна размаўлялі пасля ўрокаў з настаўнікамі пра падпіску. Аказалася, не толькі я аддаю перавагу вашаму выданню. Сышліся на тым, што «Звязда» мае свой твар... Таму я хачу пажадаць: няхай газета жыве! І пішыце больш пра нас, пра настаўнікаў...

Між іншым сёння на стале ў настаўніцкай убачыла выразку са «Звязды» пад загалоўкам «Паліто — на чатыры гады». Перачыталі, абмеркавалі і пажартавалі: зробім ксеракопію і будзем выкарыстоўваць як інструкцыю

■ Каляндар

КАЛІ БУДЗЕМ АДПАЧЫВАЦЬ?

Зацверджаны графік пераносу працоўных дзён у наступным годзе

Згодна з пастановай Савета Міністраў №903 ад 29 лістапада 2017 года працоўныя дні ў 2018-м пераносяцца наступным чынам:

з аўторка **2 студзеня** на суботу **20 студзеня;**

з пятніцы **9 сакавіка** на суботу **3 сакавіка**;

з панядзелка **16 красавіка** на суботу **14 красавіка;**

з панядзелка **30 красавіка** на суботу **28 красавіка**;

з панядзелка **2 ліпеня** на суботу **7 ліпеня**;

з панядзелка **24 снежня** на суботу **22 снежня**;

з панядзелка **31 снежня** на суботу **29 снежня**.

Арганізацыі, з улікам спецыфікі вытворчасці (работы), могуць пераносіць працоўныя дні ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Заўтра — Міжнародны дзень інвалідаў

Прайсці навучанне і адкрыць сваю справу

Абараніць людзей з інваліднасцю ад дыскрымінацыі ў любой сферы жыцця

У нашай краіне звыш паўмільёна людзей з рознай ступенню інваліднасці, і колькасць іх пастаянна расце. Гэтыя людзі маюць патрэбу ва ўвазе не толькі дзяржавы, але і ўсяго грамадства. Нам трэба зрабіць усё, каб яны не саромеліся сваёй інваліднасці і не адчувалі сябе ізгоямі.

Адна з найважнейшых умоў адчування сябе паўнавартаснай асобай — магчымасць рэалізавацца, і ў першую чаргу гэта датычыцца прафесійнага плана. «Для людзей з інваліднасцю гэта вельмі важна», — упэўнены **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** Ён адзначыў, што ў нашай краіне на сёння — больш за 180 тысяч інвалідаў працаздольнага ўзросту, і кожны трэці з іх працуе. Паводле слоў намесніка міністра, у Беларусі распрацаваны шэраг механізмаў дзяржаўнай падтрымкі інвалідаў у плане працаўладкавання. Напрыклад, у ліку іншых мер устаноўлена бронь на працаўладкаванне людзей з інваліднасцю на мясцовым выканаўчым і распарадчым узроўнях. «Штогод у органы дзяржаўнай службы занятасці звяртаюцца ў сярэднім 4,5 тысячы чалавек з інваліднасцю, — адзначыў Аляксандр Румак. — І ім аказваецца садзейнічанне».

У гэтых людзей ёсць магчымасць прайсці прафесійнае навучанне і адкрыць сваю справу. А ў спецыялізаваным адукацыйна-рэабілітацыйным цэнтры — падраздзяленні Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра ў Мінску для іх маецца магчымасць перанавучання, у тым ліку для інвалідаў-калясачнікаў. Яны могуць атрымаць прафесію аператара ПЭВМ, спецыяліста па рамонце абутку, для дзяўчат распрацавана праграма па навучанні манікюру.

Цяпер рыхтуюцца змены ў Працоўны кодэкс, якія прадугледжваюць рэгуляванне дыстанцыйных форм работы. Гэтае новаўвядзенне будзе вельмі карысным у тым ліку і для людзей з інваліднасцю.

У цэлым, як лічыць Аляксандр Румак, сведчанне таго, што сацыяльная абарона людзей з інваліднасцю — адзін з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі, з'яўляецца той факт, што ў Дзяржаўнай праграме «Сацыяльная абарона і садзейнічанне занятасці на 2016—2020 гады» з пяці падпраграм тры прысвечаныя праблемам інвалідаў. У цяперашні час ідзе вялікая праца па падрыхтоўцы новых законапраектаў, якія абарнялі б людзей з інваліднасцю ад дыскрымінацыі ў любой сферы жыцця.

А **намеснік дырэктара па навуковай рабоце «РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі» Дзіяна КАЗАКЕВІЧ** адзначыла, што медыкамі зараз распрацоўваецца новая мадэль устанаўлення інваліднасці. Паводле слоў спецыяліста, магчыма, у найбліжэйшай будучыні акрамя ўстанаўлення адной з трох груп інваліднасці дадаткова будзе праводзіцца ацэнка працэнта ступені страты працаздольнасці.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Учынак

НА ДАПАМОГУ ПРЫЙШЛІ АФІЦЭРЫ

У канцы апошняга дня лістапада ў мінскім метрапалітэне магло здарыцца непапраўнае. Пажылая жанчына, якая чакала свайго цягніка на платформе станцыі «Плошча Перамогі», раптоўна ўпала на рэйкі...

Фота ІА «Вясна».

Тыя самыя ратаўнікі: палкоўнік Дзяніс ФЁДАРАЎ і падпалкоўнік Сяргей ШОХАЎ.

Трагедыю прадухілілі мужчыны, якія стаялі побач. Сярод ратавальнікаў былі і афіцэры, якія пасля службы вярталіся дамоў. Як расказвае палкоўнік Дзяніс Фёдараў, мужчына, які першы скокнуў уніз, каб падняць жанчыну на платформу, з-за вышыні зрабіць гэта адзін не мог. Тады афіцэр учапіўся ў адзенне пацярпелай і выцягнуў яе наверх. Тым часам на дапамогу спяшаліся супрацоўнікі метрапалітэна, спыняючы па рацыі цягнік, які ўжо набліжаўся да станцыі.

— Аказалася, што жанчына проста не заўважыла краю платформы, — успамінае падзеі таго вечара падпалкоўнік Сяргей Шохаў. — Пакуль Дзяніс Аляксандравіч кінуўся ёй на дапамогу, я як мага хутчэй паведаміў аб здарэнні дзяжурнаму па станцыі, каб той спыніў цягнік.

На шчасце, імгненная рэакцыя і, безумоўна, неабыякавасць звычайных людзей прадухілілі трагедыю. Але ратаўнікі не бачаць у гэтым нічога геаічнага: у такой сітуацыі, на іх думку, так паступіў бы кожны афіцэр.

Як адзначыў **прэс-сакратар Мінскага метрапалітэна Андрэй КУЗЬМІН**, ваеннаслужачыя не толькі зрабілі добрую справу, але і правільна адрэагавалі на сітуацыю: паколькі кантактныя рэйкі маюць высокае напружанне, да іх нельга спускацца.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Неспрыяльныя дні і гадзіны ў снежні

2, субота, 4.00 – 22.30
4, панядзелак, 21.00 – 23.00
6, серада, 20.00 – 22.00
11, панядзелак, 5.00 – 7.00
13, серада, 14.30 – 16.00
15, пятніца, 4.30 – 24.00
16, субота, 0.00 – 3.00
18, панядзелак, 15.00 – 17.30
20, серада, 17.30 – 24.00
21, чацвер, 0.00 – 4.30
23, субота, 12.00 – 16.30
25, панядзелак, 5.00 – 24.00
27, серада, 23.00 – 24.00
28, чацвер, 0.00 – 8.30
29, пятніца, 16.00 – 24.00

■ Блізкая ўлада

ДОМ «НЕКАМФОРТ-КЛАСА»

Як дольшчыкі даўгабуда праўду шукалі

Сем разоў адмерай, адзін раз адрэж. Мабыць, менавіта гэтай прыказкай вырашылі скарыстацца пры будаўніцтве шматпавярховіка на сталічнай вуліцы Кальцова — толькі перайначыўшы яе на свой лад. Даўгабуд, узвядзенне якога пачалося яшчэ ў 2013 годзе, здалі ў эксплуатацыю толькі з сёмага разу. Дольшчыкам, многія з якіх трапілі з-за гэтага ў крытычную сітуацыю, нарэшце вырашыць праблему дапамог зварот у Адміністрацыю Прэзідэнта.

На выязны асабісты прыём у Першамайскім раёне Мінска да **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі КАЧАНАВАЙ** прадстаўнікі дольшчыкаў прыйшлі пасля шматлікіх звароатаў у адміністрацыю раёна, а таксама ў Мінгарвыканкам і Камітэт дзяржаўнага кантролю. Прыйшлі не з пустымі рукамі, а «ўзброіўшыся» калектыўным зваротам з 55 подпісамі. Усяго ж з-за моцна зацягнутага будаўніцтва 25-павярховіка не маглі атрымаць ключы ад сваіх кватэр 190 сем'яў. Абураныя гараджане, страціўшы ўсялякае цярпенне, нават запісалі відэазварот да Прэзідэнта. І калі расказ пра перыпетыі будаўніцтва выклікае спачуванне, то асабістыя гісторыі дольшчыкаў — шчыры жаль.

«Вырашыліся на трэцяе дзіця, толькі калі ўбачылі гатовы дом, заплаціўшы цалкам за кватэру. Зараз прыйдзецца туліцца ў 30 метрах нашым вялікім сямействам». «Каля 10 гадоў жылі з жонкай на здымнай кватэры і збіралі на сваё жыллё. Наша дзіця нарадзілася таксама на здымнай кватэры. Мы сабралі шмат грошай, улезлі ў даўгі, паспрабавалі вырашыць сваё кватэрнае пытанне, купілі кватэру, але на сёння ў нас няма ад яе ключоў». «Узялі крэдыт, але калі праз месяц не атрымаем ключы, то будзем плаціць павышаныя працэнты. А шматлікім маім суседзям наогул пагражае нямэтавае выкарыстанне крэдыту». І такіх гісторый — больш за паўтары сотні.

Пры гэтым дом быў цалкам гатовы ў гэтым чэрвені. Аднак раздаваць ключы стомленым ад чакання дольшчыкам ніхто не спяшаўся. Іх напаткала чарговая непрыемнасць — разбор паміж забудоўшчыкам і генпадрадчыкам. Справа ў тым, што будаўніцтва было падзелена на дзве чаргі: жылы дом і падземная аўтастаянка. У той час як шматпавярховік быў ужо цалкам гатовы, да будаўніцтва паркінга нават не прыступалі. Аднак генпадрадчык адмаўляўся ўводзіць дом у эксплуатацыю, пакуль не будзе цалкам завершаны ўвесь аб'ект.

Кампанія «Лайтстартэлекам», для якой дом па вуліцы Кальцова стаў першым праектам у сферы будаўніцтва, — да гэтага яна займалася тэлекамунікацыйнымі сеткамі — са сваімі задачамі справіцца не змагла. Як дольшчыкам расцлумачылі ў Мінгарвыканкаме, рэсурсаў, каб працягнуць работы, у кампаніі зараз няма. Таксама як і жаданне пакідаць будпляцоўку. Прычына гэтага «бунту» ў тым, што падрадчык быццам бы не атрымаў грошы за ўжо праведзеную працу ад забудоўшчыка «Фрэзіэйсэксім». Выйсце адно — судовыя разборы, якія, як вядома, могуць цягнуцца гадамі. І ўвесь гэты час дольшчыкі, якія, па сутнасці, маюць ужо гатовыя кватэры, не маглі б у іх засяліцца...

На радасць зараз ужо паўнавартасных уладальнікаў кватэр, пасля ўмяшання Адміністрацыі Прэзідэнта пытанне было вырашана станоўча — дом уведзены ў эксплуатацыю. Дарэчы, праблема са стаянкай таксама зрушылася з мёртвага пункта. Падрадчыка ўсё ж удалося змяніць — да работ ужо прыступіў ААТ «Мінскметрабуд».

Праўда, стаць жыхарамі «Утульнага квартала» тым, хто хутка пераедзе ў дом па адрасе Кальцова, 37, наўрад ці ўдасца. Шанцаў на рэалізацыю амбіцыйнага праекта па ўзвядзенні трох высотак, увага, «камфорт-класа», бізнес-цэнтра і паркінга няшмат. Добра хоць, што адзін дом давялі да розуму. Дарэчы, летась зямлю пад будаўніцтва ў няўдачлівага забудоўшчыка ўжо канфіскавалі.

Дольшчыкі ж, якія нарэшце атрымалі жаданае, выказваюць вялікую падзяку Адміністрацыі Прэзідэнта, аднак ад іншых каментарыяў адмаўляюцца — стаміліся ад падвышанай увагі да сябе. І іх можна зразумець: усе думкі цяпер толькі аб варыянтах рамонту і спосабах арганізацыі пераезду. Добра хоць з суседзямі не трэба наладжваць адносіны: усе паспелі пазнаёміцца адно з адным за гады сумеснай барацьбы. Наступны крок — наданне хоць бы двару статусу «ўтульнага», але ўжо сваімі сіламі.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

■ Разумныя грошы

ЗАХАВАЦЬ І ЗАРАБІЦЬ

Выбіраем дэпазіт, дзе будзем трымаць свае зберажэнні

Куды ўкласці «кроўныя», каб зарабіць, — над гэтым пытаннем задумваецца большасць людзей, незалежна ад колькасці нулёў на іх банкаўскім рахунку. Варыянтаў мноства, але яны залежаць ад сумы вашых назапашванняў. Самы першы варыянт, які прыходзіць у галаву большасці і даступны ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі мяняюцца. Давайце разбяромся, якія бываюць банкаўскія ўклады і колькі можна на гэтым зарабіць.

ДЗЯРЖАВА ГАРАНТУЕ

Самы зразумелы, просты і менш рызыкоўны спосаб інвеставаць грошы — адкрыць банкаўскі ўклад. Яго бясспрэчны плюс у тым, што гарантыі вяртання грошай пры любых абставінах дае не толькі банк, але і дзяржава. Варта задумацца аб адкрыцці дэпазіту, калі вы назапасілі суму, якую не збіраецеся расходаваць у найбліжэйшы час, а наадварот — хочаце захаваць і прымножыць. Вядома, максімальна прымножыць. Банкі прапануюць розныя ўмовы па ўкладах, і іх прыбытковасць залежыць і ад таго, які менавіта дэпазіт вы выбераце. Вось на што варта звярнуць увагу.

ДАКЛАДНЫ ТЭРМІН УДВАЯ ДАРАЖЭЙШЫ

Укладаў дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Нескладана здагадацца, што яны адрозніваюцца магчымасцю датэрмінова забраць свае грошы. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы, цалкам ці часткова. Калі вы здымаеце грошы датэрмінова, то моц набываюць іншыя правілы: працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, якая ніжэйшая за асноўную.

Безадзыўныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і забіраеце іх толькі па заканчэнні таго тэрміну, які пазначаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і раней датэрміновa вярнуць грошы, але для гэтага патрэбныя важкія падставы. Банк абавязкова разгледзіць ваша пажаданне, але дасць згоду толькі ў тым выпадку, калі палічыць вашыя аргументы вельмі сур'ёзнымі. Стаўкі па безадзыўных дэпазітах заўсёды прывабнейшыя і вышэйшыя. Давайце параўнаем: гадавая стаўка банка адзыўнага ўкладу на 5 месяцаў — 5%, безадзыўнага — ужо 10%. Адрозненні будуць заўсёды, незалежна ад тэрміну, на які вы кладзяце свае грошы ў банк.

ДОЎГАТЭРМІНОВЫ ЗАЎСЁДЫ ЛЕПШ

Яшчэ дэпазіты адрозніваюцца тэрмінамі: вы можаце выбраць уклад на адзін месяц, тры, пяць, сем, дзевяць месяцаў ці год. Вядома, можна адкрыць дэпазіт больш чым на адзін год, але складана рабіць эканамічныя прагнозы на доўгі час. Адпаведна, банкі прапануюць кароткатэрміновыя (да 3 месяцаў), сярэднетэрміновыя — (да 1 года) і доўгатэрміновыя (больш за 1 год) дэпазіты. Памер стаўкі напрамую залежыць ад тэрміну: чым даўжэй вашы грошы знаходзяцца ў банку, тым больш вы атрымаеце. Давайце прасочым, як змяняецца працэнтная стаўка. Возьмем безадзыўны дэпазіт на 5 месяцаў — 10%, 7 месяцаў — 11%, 9 месяцаў — 11,5%, на 12 месяцаў — 11,7%. (Мы тут прыводзім прыклады па максімальных працэнтах.)

Для ахвотных адкрыць доўгатэрміновы ўклад ёсць дадатковая перавага — не трэба плаціць падатак на ўклады ў памеры 13%. Гэта адносіцца да ўсіх, хто адкрывае доўгі безадзыўны ўклад на год ці больш — у беларускіх рублях, на два гады або больш — у валюце. Так што, калі хочаце зэканоміць на падатку, то лепш перадаць грошы ў банк на доўгі тэрмін.

Даход па дэпазіце з капіталізацыяй працэнтаў будзе вышэйшы, яшчэ большы ён будзе, калі працэнты выплачваюцца двойчы ў месяц.

Яшчэ адзін важны нюанс, на які варта звярнуць увагу, — ці дазваляе банк папаўняць уклад, г. зн. ці можна ўносіць на дэпазітны рахунак дадатковыя грошы на працягу тэрміну дзеяння дагавора. Калі такая магчымасць прадугледжана — для вас гэта выдатны спосаб назапасіць і яшчэ больш прымножыць свае зберажэнні.

РУБЛЁВЫ ВЫШЭЙШЫ, АЛЕ ЁСЦЬ НЮАНСЫ

Традыцыйна ўклады дзеляцца і па тыпе валюты: можна адкрыць рублёвы або валютны дэпазіт, натуральна, стаўкі па першым заўсёды вышэйшыя. Напрыклад, максімальная стаўка, якую можна знайсці на ўклад у беларускіх рублях, — 11,7% гадавых. Гэта безадзыўны дэпазіт тэрмінам на 12 месяцаў. Калі грошы вы назапашваеце на працягу года для мэтавай пакупкі ў айчыннай валюце, то лепш збіраць неабходную суму ў рублях.

Зусім іншы варыянт атрымліваецца, калі вы збіраецеся летам за мяжу або ўжо доўгі час збіраеце грошы на нерухомасць. У гэтым выпадку вам, мабыць, лепш выбраць валютны ўклад, тут ваш выбар залежыць ад дзейнай на сёння доларавай інфляцыі. Працэнты па валютным укладзе невялікія — да 2%, але ёсць варыянты.

«Прасунутым» карыстальнікам глабальнага сеціва фінансісты часам робяць даволі нядрэнныя прапановы, дзе даходнасць крыху большая. Напрыклад, банкі сёння прапануюць тэрміновы банкаўскі ўклад, які адкрывае для кліентаў магчымасць кіравання ўласнымі зберажэннямі праз інтэрнэт з выкарыстаннем сваёй банкаўскай плацежнай карткі. Сярод пераваг падобнай прапановы будзе адкрыццё і кіраванне ўкладам без наведвання структурнага падраздзялення банка. Вяртанне ўкладу пры надыходзе тэрміну ажыццяўляецца шляхам пераводу рэшткаў грашовых сродкаў з налічанымі працэнтамі на банкаўскую картку. Па гэтай сістэме пры выкананні пэўных умоў прадугледжана налічэнне і прэміяльных працэнтаў, а агульны даход можа скласці да 2,5% гадавых. Па падобнай схеме банк дае большы даход кліенту, бо абслугоўванне такіх укладаў фінансавай установе абыходзіцца значна танней, чым пры звычайных дэпазітах.

Знізілася даходнасць і па валютных аблігацыях. Яшчэ летась каштоўныя паперы ў валюце прыносілі іх уладальнікам нядрэнны даход. Уласныя валютныя аблігацыі сістэмных банкаў краіны прадугледжвалі спачатку 5,5%, а потым 5% гадавых. Сёння падобных каштоўных папер з такой даходнасцю ўжо няма. Цяпер існуюць толькі валютныя аблігацыі на прад'яўніка ў некалькіх банках, але ўжо пад 3,5% гадавых. Праўда, на фінансавым рынку з'явіліся бездакументарныя каштоўныя паперы і інтэрнэт-аблігацыі ў валюце і, зноў-такі, пад 3,5% гадавых. Аднак у насельніцтва яны пакуль вялікай папулярнасцю не карыстаюцца. Людзей сёння палохае той факт, што па гэтых каштоўных паперах у іх на руках ніякіх папяровых дакументаў не застаецца. А калі няма гэтай самай паперы, то і ў кліентаў часам узнікае ўражанне, што гарантыя вяртання іх грошай не зусім відавочная.

Яшчэ пры выбары дэпазіту ёсць сэнс разабрацца, як банк будзе выплачваць працэнты па ўкладзе. Ёсць паняцце «капіталізацыя працэнтаў», яшчэ яго называюць «працэнты на працэнты». Калі ва ўмовах укладу значыцца, што існуе штомесячная капіталізацыя працэнтаў, то гэта значыць, што па заканчэнні месяца захоўвання налічаныя працэнты за адпаведны перыяд далучаюцца да сумы дэпазіту. А ў наступным месяцы працэнты налічваюцца ўжо на ўсю суму, якая ляжыць на вашым рахунку. Даход па дэпазіце з капіталізацыяй працэнтаў будзе вышэйшы, яшчэ большы ён будзе, калі працэнты выплачваюцца двойчы ў месяц.

ВАЛЮТНЫЯ ЗАКРЫВАЮЦЬ, РУБЛЁВЫЯ — ПАПАЎНЯЮЦЬ

У кастрычніку ў Беларусі намінальна працягнулі расці рублёвыя ўклады, а колькасць дэпазітаў у валюце па-ранейшаму зніжаецца. Пра гэта сведчыць кастрычніцкая статыстыка Нацбанка па грашова-крэдытным рынку. За кастрычнік дэпазіты ў беларускіх рублях выраслі на 29,7 мільёна рублёў (за верасень — на 39,5 мільёна). На пачатак лістапада іх сума склала 3,31 мільярда рублёў.

Валютныя дэпазіты ў кастрычніку працягнулі скарачацца, за месяц яны ўпалі на 23,8 мільёна долараў (за верасень — на 39,3 мільёна) і склалі на пачатак кастрычніка 6 мільярдаў 766,7 мільёна «баксаў». Нагадаем, беларусы ў кастрычніку павялічылі продаж наяўнай валюты на 2,7% у параўнанні з вераснем да 647 млн долараў. Купля валюты вырасла больш значна — на 14,8%, да 468 млн долараў. Пры гэтым ужо дваццаць адзін месяц насельніцтва застаецца чыстым прадаўцом наяўнай валюты.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by



ЛЯТАЮЧАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Першы студэнцкі касмічны спадарожнік да палёту гатовы!

Пачатак 2000-х адзначыўся новым прарывам у асваенні космасу. Да народнага паняцця «вулічная астраномія» зараз можна смела прыплюсаваць «студэнцкае спадарожнікабудаванне». На жаль, мы не сталі тут піянерамі, а маглі б: 1990-я — час зараджэння ў сонечнай Каліфорніі (Каліфарнійскім політэхнічным і Стэнфардскім універсітэтах) ідэі малых спадарожнікаў (спецыфікацыя CubeSat) — у нас не назавеш слаўнымі. Дзякуючы ж каму і як нам удалося нагнаць упушчаны тады касмічны час?

Час адліку можна адмяраць ад 1979-га, калі тады яшчэ малады навуковец, а цяпер акадэмік Сяргей Абламейка (рэктар БДУ з 2008-га па 2017 год, а сёння прафесар БДУ) распачаў работу па стварэнні лічбавых картаў. Тэма на той час самая што ні ёсць сакрэтная, а значыць, і самая адказная. І ці можна назваць выпадковасцю той факт, што навуковай альма-матар будучага рэктара стаў Інстытут кібернетыкі АН Украіны, дзе эстафету маладому беларускаму навукоўцу перадаў сам акадэмік Віктар Глушкоў, які ў свой час заклаў асновы савецкай кібернетыкі.

У 1990-м Сяргей Абламейка там жа абараніў доктарскую дысертацыю. У 33 гады! Вось хто, а не амерыканцы, мог бы распрацоўваць і запускаць першы ў свеце малы штучны спадарожнік, каб не падзеі 1991 года, калі разваліўся Саюз. Але адчувальнага выніку для ўжо незалежнай беларускай дзяржавы доўга чакаць не давялося: у 2003-м наша краіна пачала работы па стварэнні ўласнага спадарожніка, у якіх Сяргей Абламейка, працуючы ў НАН Беларусі, прыняў самы актыўны ўдзел. У 2008 годзе на базе БДУ створаны Цэнтр аэракасмічнай адукацыі. У ліку трох прыярытэтных напрамкаў — акрамя падрыхтоўкі кадраў, апрацоўкі і выкарыстання даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, — распрацоўка звышмалога студэнцкага касмічнага апарата, як лятучай вучэбна-навуковай лабараторыі.

Трохі пра рэвалюцыю малых спадарожнікаў. Ужо стала неактуальным меркаванне — маўляў, з маленькімі спадарожнікамі ў вялікай навуцы і рабіць няма чаго. Нягледзячы на тое, што жывуць яны, не ў прыклад паўнаважкім, нядоўга (у найлепшым выпадку пяць гадоў супраць 10) ды і паломкі на іх не рэдкасць, ужыткоае прымяненне іх з кожным годам расце. Зразумела, «позірк» такіх спадарожнікаў накіраваны не ў глыбіні космасу — бо ўстанавіць на іх вялікую антэну практычна немагчыма, — а на Зямлю і ўглыб яе паверхні. З пачатку іх укаранення самыя смелыя ўніверсітэты свету ўзяліся запускаць такія спадарожнікі, памеры якіх былі меншыя, чым у сучаснай пральнай машыны. Вось для нагляднасці храналогія запуску першых універсітэцкіх спадарожнікаў па краінах, якая добра ілюструе цягу ўніверсітэцкай навукі да касмічных даследаванняў: Злучаныя Штаты Амерыкі (2002), Японія (2003), Германія (2005), Галандыя, Канада (2008), Швейцарыя, Турцыя (2009), Італія, Румынія, Польшча, Сінгапур (2012), Эстонія (2013), Украіна (2014).

Вось як апісвае **акадэмік Абламейка** пазіцыі Беларусі на сусветнай касмічнай карце і нацыянальную касмічную ўніверсітэцкую адукацыю: «Гэты кірунак у навуцы перш за ўсё абумоўлены развіццём нашай краіны. Яшчэ з часоў СССР навукова-прамысловы комплекс удзельнічаў у рэалізацыі многіх касмічных праграм. З гэтай мэтай у краіне былі пабудаваны новыя заводы, створаны навуковыя і канструктарскія арганізацыі, спецыялізаваныя вытворчасці, дзе распрацавана, выраблена і ўведзена ў эксплуатацыю ўнікальнае абсталяванне, асвоены сучасныя тэхналогіі вытворчасці і выпрабаванняў касмічнай тэхнікі і — самае галоўнае — сфарміраваны калектывы высококваліфікаваных навукоўцаў, інжынераў і рабочых, дзякуючы дзейнасці якіх мы маем унікальныя спадарожнікавыя сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і калязямной прасторы. Я прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы і запуску з касмадрома Байканур першага беларускага штучнага спадарожніка ў 2006 годзе, запуск якога, на жаль, не быў паспяховым. У 2009 годзе мы пачалі думаць над гэтым у БДУ. У 2012 годзе да распрацовак, але ўжо звышмалых касмічных спадарожнікаў, былі прыцягнутыя ліцэісты БДУ. Створаныя імі пікаспадарожнікі серыі БелСат пасля паспяховых атмасферных запускаў заваявалі другое, а ў 2014-м — першае месца на чэмпіянаце «CanSat у Расіі», які арганізоўвае НДІ ядзернай фізікі Маскоўскага дзяржуніверсітэта. У 2015 і 2016 гадах у рамках таго ж чэмпіянату былі ўпершыню запушчаныя нанаспадарожнікі, распрацаваныя студэнтамі і аспірантамі БДУ. З 2010 года ў БДУ вядзецца падрыхтоўка па спецыяльнасці «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі». Таксама мы ўвялі на геаграфічным факультэце кірунак «Космаэракартаграфія». Прыемна, што з кожным годам гэты прадмет завабіўвае ў моладзі ўсё большую папулярнасць — прахадны бал на гэтую спецыяльнасць заўсёды трымаецца на дастаткова высокім узроўні. У ноч з 4 на 5 чэрвеня 2013 года мы ў БДУ ўпершыню правялі прамы сеанс радыёсувязі з экіпажам Міжнароднай касмічнай станцыі. Вядома ж, гэта падзея дадала нашаму ўніверсітэту «касмічнай» папулярнасці. Я разумею усю адказнасць, калі прыняў рашэнне аб стварэнні студэнцкага нанаспадарожніка. Але ўздыхнуў з палёгкай, калі нас падтрымала і Міністэрства адукацыі, і Акадэмія навук. Я кіраваў працэсам як рэктар і як інжынер-матэматык. І, вядома ж, мне было не абысціся без парэктара па эканоміцы і іншавацыях Уладзіміра Панарадава. Для закупкі абсталявання выкарыстоўвалі бюджэтныя і пазабюджэтныя сродкі. Асноўную ж тэхнічную частку па распрацоўцы спадарожніка і работу з выкладчыцка-студэнцкай камандай узяў на сябе мой калега — загадчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій, дырэктар Цэнтра аэракасмічнай адукацыі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Уладзімір Саечнікаў».

***

З **прафесарам Саечнікавым** мы сустрэліся для размовы ў цэнтры касмічных даследаванняў, што размясціўся на 13-м паверсе сучаснага вучэбнага корпуса факультэта міжнародных адносін БДУ.

«Вось, палюбуйцеся: кітайскія таварышы даслалі ў падарунак макет ракеты, на якой павінен паляцець наш спадарожнік, — паказвае навуковец. — Для назвы спадарожніка прыдумалі адмысловы конкурс. БеКаС — прыгожая назва, і па-беларуску яна добра гучыць. Але калі сталі рэгістраваць яе ў міжнародных арганізацыях, яна не прайшла, бо пры перакладзе на англійскую мову ад першапачатковага сэнсу нічога не застаецца. Таму давялося змяніць назву.

— Ці існуе практыка назвы студэнцкіх спадарожнікаў уласнымі імёнамі?

— Так. Напрыклад, спадарожнік МДУ названы «Таццяна». Казахскія студэнты ўніверсітэта імя Аль-Фарабітак і назвалі свой спадарожнік «Аль-Фарабі». Па-сур'ёзнаму мы пачалі працаваць над спадарожнікам у канцы 2014 года. Вядучыя ўніверсітэты, якія займаюцца падрыхтоўкай студэнтаў для космасу і для аэракасмічных напрамкаў, даўно імкнуцца мець такую навуковую лятаючую рэальную лабараторыю. Гэта па сутнасці і ёсць навукова-вучэбная лабараторыя, таму што сігналы перадаюцца ў адкрытых кодах і прымаць іх можна, валодаючы толькі мінімальнымі сродкамі прыёму. Прымай сігнал, пакуль апарат пралятае над тваёй галавой на працягу 10 хвілін.

— На што ідзе большая частка затрат у спадарожнікавым праекце?

— І апаратнае забеспячэнне, і начынне — усё дорага.

— А як жа нашы айчынныя вытворцы?

— А хіба ў нас выпускаюць мікрапрацэсары?

— А знакаміты «Інтэграл»?

— «Інтэграл» выпускае, але гэта не тыя мікрапрацэсары, на якіх можна зрабіць гэты апарат. Іх выпускае ў дастатковай колькасці Кітай.

— Хоць нешта ў нас у Беларусі выпускаецца для гэтага апарата?

— Карысную нагрузку на яго мы паставілі айчынную: навігацыйны прыёмнік, радыяцыйны спектрометр, інфрачырвоныя фотадыёды. Апрацоўка інфармацыі ідзе тым софтам, які мы распрацавалі і інтэгравалі.

— За колькі часу вы разлічвалі зрабіць спадарожнік?

— Былі розныя варыянты. Калі б было вырашана пытанне з ракетаносьбітам, маглі б паспець справіцца і за год.

— Захочацца ўзяцца за другі?

— Ужо ўзяліся. Ён робіцца ў рамках сёмай падпраграмы нацыянальнай праграмы па космасе «Выкарыстанне даследавання касмічнай прасторы ў мірных мэтах». Трэці раздзел прысвечаны распрацоўцы і выкарыстанню наступнага ўніверсітэцкага нанаспадарожніка і поўнай наземнай інфраструктуры. Прычым інфраструктуры, якая была б даступная не толькі для нашага, а і для астатніх універсітэтаў.

— Нанаспадарожнік мае на ўвазе выкарыстанне ў ім нанаматэрыялаў?

— У касмічных апаратах класіфікацыя ідзе па іншай шкале. Ёсць міні, мікра, нана, піка і нават ужо фемта. Нанаклас — да 10 кг. Піка — менш за кілаграм, фемта — 100 грам і менш. Мікраспадарожнік — некалькі соцень кілаграмаў.

— Для вашага спадарожніка зараз усяго хапае?

— Усяго ніколі не хапае. Адзінае, што цяпер тармозіць, — гэта бюракратычная сістэма ў Бруселі. Не можам атрымаць дазвол на частоты — з нас патрабуюць грошы. Тлумачым: гэта вучэбны ўніверсітэцкі спадарожнік, і ён павінен рэгістравацца бясплатна. У адказ — гэта ў вас камерцыйны апарат, заплаціце 32 тысячы еўра. Які ж ён камерцыйны? Універсітэцкі, ды яшчэ працуе ў радыёаматарскім дыяпазоне.

— Колькі, па вашым разліку, спадарожнік можа паслужыць?

— Залежыць ад арбіты. Наша арбіта — сонечна-сінхронная — 650 кіламетраў. На ёй спадарожнік можа працаваць 5—7 гадоў, пакуль не апусціцца ніжэй і не згарыць у верхніх пластах атмасферы. Калі запускаць з міжнароднай касмічнай станцыі, то максімум паўгода. Там арбіта нізкая — 400 кіламетраў. Розныя варыянты прапрацоўваліся. А то вунь быў усплёск сонечнай актыўнасці, ён добра папсаваў розныя апараты. Для падобных выпрабаванняў намі набыты трэнажор. Яшчэ і ўласны зрабілі. Засталося высветліць, якая гэта будзе канкрэтна арбіта, таму што мы яшчэ не падпісалі канчатковы варыянт кантракта. А клопат аб частаце — гэта клопат нашай беларускай аматарскай радыёстанцыі. Для выхаду ў эфір у радыёаматарскім дыяпазоне мы павінны мець зарэгістраваную аматарскую радыёстанцыю са сваім дырэктарам. Гаворка, зразумела, ідзе пра тую старую савецкую школу радыёаматараў. А куды без гэтай старой школы? Калі мы яшчэ выгадуем новае пакаленне касмічных даследчыкаў?!»

Ігар САМОЙЛАЎ.



«ЗВЯЗДОЎСКІЯ» ПАДАРУНКІ ДЛЯ ВАШЫХ ПАЧАСТУНКАЎ!»

Калі вы падпісаліся на «Звязду» на I квартал або на I паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2018 года на адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2018 года будуць разыграны 7 мікрахвалевых печак Horizont, а таксама суперпрыз — газавая пліта Gefest. Вынікі розыгрышу прызоў будуць апублікаваны да 27 студзеня 2018 года ў газеце «Звязда». Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2018 года. Пасля гэтай даты выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на I квартал ці I паўгоддзе 2018 года.

Тэрмін правядзення рэкламнай гульні — з 1 снежня 2017 года па 31 сакавіка 2018 года. Умовы апублікаваны ў нумары 231 ад 30 лістапада 2017 года.

Даведкі па тэлефонах: (017) 337 44 04, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3164 ад 28.11.2017 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ПЛІТА ГАЗАВАЯ GEFEST 5100-02 T2 K

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2018 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

на I квартал або I паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) _____ (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

■ Падпіска-2018

«Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» цяплей у хаце!»

Прызнаў гэта адзін з нашых падпісчыкаў. І, вядома ж, не памыліўся. Проста час (а ён гэта можа!) уносіць свае карэктывы: у прыватнасці, са «Звяздой» у новым 2018-м будзе не толькі цяплей, але і... смачней. Што цалкам лагічна, бо сярод прызоў для адданых і новых падпісчыкаў — новая газавая пліта і сем мікрахвалевых печак.

Для таго каб выйграць іх — «Звяздоўскія» падарункі для сваіх пачастункаў!» (падрабязная інфармацыя ў нумары за 30 лістапада), — дастаткова аформіць падпіску на першы квартал альбо першае паўгоддзе, а потым запоўніць і даслаць у рэдакцыю картку ўдзельніка рэкламнай гульні.

Розыгрыш прызоў адбудзецца 17 студзеня.

Дарэчы, падпіска на «Звязду» можа стаць добрым навагоднім падарункам для вашых блізкіх.

■ За кулісамі прыёмнай кампаніі

НАСТАЎНІК — ПРАФЕСІЯ З ВЫСОКІМІ СТАЎКАМІ

Ці зацікавіла выпускнікоў педагагічных класаў дадзеная ім ільгота?

Сёлета адбыўся першы выпуск з моманту масавага адкрыцця педкласаў ва ўстановах адукацыі па ўсёй краіне — іх скончылі 1350 чалавек. Таксама ўпершыню ў Правілах прыёму ў ВНУ для гэтай катэгорыі абітурыентаў быў прапісаны асобны пункт, дзе прадугледжвалася магчымасць залічэння выпускнікоў педкласаў пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці без здачы ЦТ, толькі па выніках гутаркі. У грамадстве ўвядзенне такой прывілеі ўспрынялі па-рознаму. У прыватнасці, выказваліся думкі, што выпускнікам педкласаў далі занадта вялікія льготы. Маўляў, у педагагічны ўніверсітэт пойдуць усе без разбору, у тым ліку і тыя, хто не можа добра здаць цэнтралізаванае тэсціраванне.
Пра тое, як прайшла сёлета прыёмная кампанія ў БДПУ, на калегіі Міністэрства адукацыі расказаў рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, прафесар Аляксандр ЖУК.

Уводзіны ў прафесію

— Усе мы добра разумеем: ад таго, які абітурыент прыйдзе сёння вучыцца да нас, залежыць, які настаўнік прыйдзе заўтра ва ўстановы адукацыі. Сістэмная і мэтанакіраваная работа па прыцягненні на педагагічныя спецыяльнасці моцных і матываваных абітурыентаў распачалася яшчэ ў 2014 годзе, калі пераможцы абласных алімпіяд, медалісты і ўладальнікі дыпломаў ССНУ з адзнакай атрымалі права залічвацца на педагагічныя спецыяльнасці без уступных экзаменаў. Такая палітыка, безумоўна, стала прыносіць свой плён, — паведаміў Аляксандр Жук. — Напрыклад, у БДПУ колькасць сярод абітурыентаў медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай за чатыры гады выраслa амаль у дзевяць разоў — з 20 да 175. Заўважу, што гэта яшчэ і заканамерны вынік сістэмнай работы па прыцягненні лепшых выпускнікоў у нашу ВНУ. Сярэдні бал гэтай катэгорыі студэнтаў па выніках чатырох здадзеных сесій складае 7,5, а на гуманітарных спецыяльнасцях ён вагаецца ад 8,5 да 9 балаў.

Яшчэ адным важным фактарам павышэння «якасці» абітурыентаў стала ўвядзенне профільнага педагагічнага навучання ў старшай школе. Больш за два гады таму БДПУ выступіў з адпаведнай ініцыятывай, а ў 2015/2016 навучальным годзе першыя педагагічныя класы і групы з'явіліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. У наступным навучальным годзе іх колькасць павялічылася больш чым удвая: у краіне дзейнічалі ўжо 319 педагагічных класаў і груп, у якіх навучаліся больш за 3,5 тысячы чалавек. У новым навучальным годзе колькасць педагагічных класаў і груп узрасла на 122 і склала больш за 440. У іх навучаюцца зараз 4700 чалавек. Лідарамі з'яўляюцца Мінская вобласць (амаль тысяча навучэнцаў і каля 100 педкласаў), сталіца (больш за 800 навучэнцаў і амаль 50 педкласаў) і Гродзенская вобласць (амаль 700 вучняў і больш чым 80 класаў).

«У БДПУ сёлета прыйшлі моцныя абітурыенты: сярэдні бал атэстата — не ніжэй 8,5 бала».

Навучэнцы ў педагагічных класах і групах вывучаюць два-тры вучэбныя прадметы на павышаным узроўні. Як правіла, гэта тыя прадметы, настаўнікамі якіх яны плануюць стаць у будучыні. Акрамя таго, старшакласнікі павінны абавязкова засвоіць праграму факультатыва «Увядзенне ў педагагічную прафесію» аб'ёмам 140 вучэбных гадзін за два гады. На думку Аляксандра Жука, гэта цудоўная магчымасць для прафесійнага самавызначэння моладзі яшчэ ў час навучання ў школе, а таксама для фарміравання пазітыўнай установкі на выбар педагагічнай прафесіі.

Вынікі першага года

Што датычыцца атрымання так званай ільготы: права паступаць на выніках гутаркі ёсць толькі ў тых выпускнікоў педагагічных класаў, хто мае па ўсіх прадметах у атэстаце адзнакі ад 7 да 10 балаў, а па профільных прадметах, якія вывучаюцца на павышаным узроўні, — не менш як 8 балаў. «Гэта патрабаванне задае высокую планку, — упэўнены рэктар БДПУ. — Да таго ж вучні павінны былі атрымаць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю педагагічнага савета ўстановы адукацыі для паступлення, заверaную ў раённым упраўленні (аддзеле) адукацыі, спорту і турызму. Да выдачы такіх рэкамендацый падышлі на месцах вельмі адказна.

А цяпер непасрэдна пра вынікі прыёму: правам паступаць у галоўны педагагічны ўніверсітэт краіны без экзаменаў скарысталіся 107 выпускнікоў педагагічных класаў, з іх каля 40 працэнтаў з'яўляюцца выхаванцамі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці і яшчэ каля 30% — выпускнікамі сталічных навучальных устаноў. Усяго ў БДПУ ў гэтым годзе было залічана 130 выпускнікоў педкласаў (яшчэ 23 чалавекі паступалі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання). А гэта складае толькі 10 працэнтаў ад усіх выпускнікоў педагагічных класаў.

Аляксандр Жук таксама праінфармаваў, што студэнтамі ВНУ сталі 672 выпускнікі педагагічных класаў з 1350 чалавек, гэта значыць палова. З іх 369 чалавек (каля 55%) вучацца сёння ў ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў для сістэмы адукацыі. Непасрэдна на педагагічныя спецыяльнасці паступілі 230 выпускнікоў педкласаў, дзве траціны з якіх скарысталіся правам ільготнага паступлення (166 чалавек або 72%). Адпаведна, амаль траціна (64 чалавекі) былі залічаны на педагагічныя спецыяльнасці па выніках ЦТ.

З выпускнікоў педагагічных класаў за кошт сродкаў бюджэту на педагагічных спецыяльнасцях навучаюцца 93%, гэта значыць, што праз чатыры гады большасць з іх прыйдуць працаваць ва ўстановы адукацыі па размеркаванні.

Другая палова (303 чалавекі) выбрала ВНУ непедагагічнага профілю. Прычым найбольшая колькасць паступіла ва ўстановы вышэйшай адукацыі тэхнічнага профілю (46%), на другім месцы ідуць эканамічныя і медыцынскія ВНУ (14%).

Аляксандр Жук канстатаваў, што падобныя вынікі былі прадказальныя для першага выпуску з педагагічных класаў: «Звесткі маніторынгу, які мы сістэматычна праводзілі, карэлююць з выбарам выпускнікоў. У ходзе праведзенага ў мае бягучага года апытання толькі траціна адзінаццацікласнікаў выказала намер паступаць на педагагічныя спецыяльнасці. Але, павінен адзначыць, што вынікі першага года непаказальныя. Трэба ўлічваць, што наступныя наборы ў педагагічныя класы (у 2016/2017 і ў 2017/2018 навучальных гадах) праходзілі пры больш высокай зацікаўленасці вучняў і іх бацькоў. Сёння ў педкласах навучаюцца больш моцныя і матываваныя школьнікі, чым гэта было напачатку, а ў некаторых школах нават склаўся конкурс на залічэнне ў педагагічныя класы».

Па словах рэктара БДПУ, вынікі прыёмнай кампаніі гэтага года дазваляюць зрабіць шэраг высноў. Па-першае, створаная сістэма паспяхова працуе на дасягненне стратэгічнай мэты — усвядомленага выбару педагагічнай прафесіі. Асновы фарміравання будучай прафесійнай педагагічнай эліты закладваюцца яшчэ ў школе.

— Для нас асабліва важна, што хлопцы і дзяўчаты, якія прыйшлі да нас, гэта насамрэч адмысловая катэгорыя абітурыентаў. Іх выбар старанна прадуманы і ўсвядомлены. Яны добра праінфармаваныя пра спецыфіку педагагічнай працы, складанасці педагагічнай прафесіі, пра яе плюсы і мінусы. Галоўнае, што яны паспрабавалі сябе і прыйшлі ў ВНУ, ужо маючы першасны педагагічны вопыт, — падкрэсліваe Аляксандр Жук. — Па-другое, дзякуючы сістэмнай прафарыентацыйнай рабоце і павышэнню прэстыжу педагагічнай прафесіі ў грамадстве растуць і прахадныя балы на педагагічныя спецыяльнасці. У БДПУ сёлета прыйшлі моцныя абітурыенты: сярэдні бал атэстата — не ніжэй 8,5 бала. Істотны рост ёсць па ўсіх спецыяльнасцях (ад 20 да 50 балаў). А па пяці спецыяльнасцях прахадныя балы былі больш за 310! Колькасць сярод першакурснікаў ліцэістаў і гімназістаў за тры гады павялічылася ў шэсць разоў (!) і склала 350 чалавек (з 800 студэнтаў дзённай бюджэтнай формы навучання яны складаюць больш за 40 працэнтаў).

«Бонус» да прывілеі

— Яшчэ адна важная выснова, якую мы зрабілі па выніках прыёмнай кампаніі, — устанаўленне пяцігадовага тэрміну адпрацоўкі для выпускнікоў педкласаў з'яўляецца істотным стрымліваючым фактарам, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Аказалася, што не ўсе абітурыенты гатовыя да такой «даваўжкі» ў выглядзе абавязковай пяцігадовай адпрацоўкі. З аднаго боку, такія ўмовы прыраўноўваюць выпускнікоў педагагічных класаў да «мэтавікоў», а мы ведаем, што апошнія часта маюць далёка не самыя высокія балы. У той час, як сярэдні бал атэстата ў выпускнікоў педкласаў, якія да нас паступалі, быў ад 9 і вышэйшы. З іншага боку, маладыя людзі плануюць сваю будучыню і робяць гэта свядома: чатыры гады вучобы плюс пяць гадоў адпрацоўкі па размеркаванні на пэўным месцы — вельмі далёкая перспектыва, а ніхто не ведае ў 17 гадоў, як складзецца яго жыццё. Таму мы лічым, што дадзеная мера немэтазгодная. Яна можа прывесці да адваротнага эфекту і дыскрэдытаваць ідэю фарміравання абітурыентаў з добра падрыхтаваных і матываваных выпускнікоў педагагічных класаў. Мабыць, варта абмеркаваць магчымасць скарачэння тэрміну адпрацоўкі пасля размеркавання для выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў, якія навучаліся ў педкласах, з пяці да двух ці трох гадоў, як мы гэта і прапаноўвалі. Альбо наогул прапрацаваць пытанне аб адмене мэтавых накіраванняў на педагагічныя спецыяльнасці.

■ Будзь у курсе

ХТО ЗМОЖА СТАЦЬ МАГІСТРАНТАМ-ЗАВОЧНІКАМ?

Паступаць у магістратуру на завочную і вячэрнюю форму навучання змогуць толькі тыя, у каго працоўны стаж складае не менш за 10 месяцаў. Адпаведная норма была ўнесена ў Правілы прыёму асоб для атрымання вышэйшай адукацыі II ступені пастановай Савета Міністраў.

Як паведамілі ў галоўным адукацыйным ведамстве, дакументам урада ўдакладняецца парадак правядзення ўступных выпрабаванняў. Таксама ўводзіцца льгота на паступленне ў магістратуру без уступных іспытаў для асоб, узнагароджаных нагруднымі знакамі «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольных навучэнцаў і студэнтаў» і «Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі».

Адначасова быў дапоўнены пералік катэгорый грамадзян, якія карыстаюцца пераважным правам на паступленне: для навукова-арыентаваній магістратуры гэта асобы, якія маюць больш высокі сярэдні бал дыплома аб вышэйшай адукацыі I ступені або дакумента аб адукацыі; для практыка-арыентаваній магістратуры — асобы, якія атрымалі па заканчэнні I ступені вышэйшай адукацыі дыплом з адзнакай або маюць больш высокі сярэдні бал дыплома аб вышэйшай адукацыі I ступені ці дакумента аб адукацыі.

Паступаць у магістратуру можна будзе толькі па арыгінале дыплома аб вышэйшай адукацыі — мяркуецца, што гэта дапаможа пазбегнуць выпадкаў залічэння аднаго студэнта ў магістратуру некалькіх ВНУ.

Таксама па змененых правілах у конкурсе на паступленне ў магістратуру дзяржаўных ВНУ на бюджэтныя месцы змогуць удзельнічаць замежныя грамадзяне, якім у Беларусі было прадастаўлена прыстанішча. Такім чынам яны будуць мець роўныя з беларусамі правы на атрыманне адукацыі. Для іншаземцаў і асоб без грамадзянства, якія ў Беларусі часова знаходзяцца або часова тут пражываюць, уведзена дадатковае субяседаванне па вучэбных дысцыплінах, што будзе спрыяць прыцягненню для навучання ў магістратуры найбольш падрыхтаваных спецыялістаў з гэтай катэгорыі асоб.

Таксама ўведзена норма, якая прадугледжвае давядзенне да ведама грамадскасці інфармацыі аб колькасці бюджэтных месцаў у магістратуры ў дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі.

Матэрыялы падрыхтавала
Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Подразделение департамента: Управление по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Уполномоченный орган: отдел принудительного исполнения по Железнодорожному району г. Витебска.

Лот №1. Незарегистрированное капитальное строение площадью 230,8 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 24010000000200 площадью 0,1500 га, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 6-я Загородная, 109А. Начальная цена: 156 600 рублей. Задаток: 15 660 рублей. Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Дата, время и место проведения аукциона: 04.01.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 04.12.2017 с 8.30 по 03.01.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни.

Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в уст. порядке заявление на участие в аукционе (по форме, определенной Организатором аукциона), предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами по продаваемому предмету аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), с приложением следующих документов: негосударственные юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о государственной регистрации, копии учредительных документов, доверенность представителю негосударственного юридического лица, в случае, когда негосударственное юридическое лицо представляет его руководитель – документ, подтверждающий полномочия; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63.

Условие – наличие не менее 2 участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5% (Претендент на покупку). Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного предмета аукциона не позднее 20 раб. дней со дня подписания протокола о результатах аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Гос. регистрация создания недвижимого имущества, реализованного на аукционе, возникновения, перехода, прекращения прав, ограничений (обременений) прав на него, осуществляется на основании представляемых победителем аукциона заявления, протокола о результатах аукциона, копии решения суда об обращении недвижимого имущества в доход государства (иного документа, являющегося в соответствии с законодательством основанием для постановки имущества на последующий учет), акта передачи имущества, а также технического паспорта, составленного организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним.

Организатор аукциона вправе снять лот с аукциона по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным. **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о внесении дополнений в извещение о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества Лиозненского РАЙПО, опубл. в газетах «Звязда» **25.11.2017 г.**, «Сцяг перамогі» **25.11.2017 г.**; «Витебские вести» **25.11.2017 г.**: Победителю аукциона (Претенденту на покупку) может быть предоставлена рассрочка оплаты недвижимого имущества.

УНП 390477566

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

Продавец: ОАО «Нафтан», 211441, Витебская обл., г. Новополоцк, тел. (0214) 55-73-74.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №252/D-94055 площадью 20,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Парковая, 1В-1, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. **Нач. цена**: 2 734,43 руб. без НДС. **Задаток:** 273,44 руб.

Лот №2. Изолированное помещение с инв. №252/D-94056 площадью 21,7 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Парковая, 1В-2, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. **Нач. цена**: 2 908,67 руб. без НДС. **Задаток:** 290,87 руб.

Лот №3. Изолированное помещение с инв. №252/D-94058 площадью 21,7 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Парковая, 1В-4, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. **Нач. цена**: 2 908,67 руб. без НДС. **Задаток:** 290,87 руб.

Лот №4. Изолированное помещение с инв. №252/D-94059 площадью 19,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Парковая, 1В-5, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. **Нач. цена**: 2 600,39 руб. без НДС. Задаток: 260,04 руб.

Лот №5. Изолированное помещение с инв. №252/D-94060 площадью 18,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Парковая, 1В-6, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. **Нач. цена**: 2 519,96 руб. без НДС. Задаток: 252 руб.

Повторный аукцион состоится 20.12.2017 в 09.00 по адресу: Витебская обл., г. Новополоцк, в ОАО «Нафтан». Срок внесения задатков и приема документов: с 04.12.2017 с 8.30 по 19.12.2017 до 17.30. Шаг аукциона – 5% от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, IBAN MTBKBY22, УНП 390477566, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок заключения договора купли-продажи: 15 календарных дней со дня проведения аукциона. **Условие аукциона:** победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Валюта платежа при заключении договора купли-продажи: с резидентами Республики Беларусь – белорусский рубль; с нерезидентами Республики Беларусь – российский рубль, евро. Покупателю по его письменному заявлению может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества на срок не более года. С подробными условиями предоставления рассрочки и порядком проведения расчетов при заключении договора купли-продажи можно ознакомиться на сайте marketvit.by. Победитель аукциона (Претендент на покупку) несет расходы по гос. регистрации договора купли-продажи и гос. регистрации перехода права на недвижимое имущество в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», оформлении долевой собственности на земельный участок. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 14.10.2017; газета «Новополоцк сегодня» 13.10.2017 г.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего рег. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр.лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. **Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан**: перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, указанные в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Осмотр имущества осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по месту нахождения имущества, конт. тел.: (033) 398-02-64. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. №401/С-23829 (назначение – здание специализированное для общественного питания, назначение – бар «Агат»), обшей площадью 104,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 72А
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый № 422050400002002469, площадью 0,0213 га (назначение – для обслуживания здания бара «Агат»), расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 72А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2
Начальная цена продажи	17 500 руб. (семнадцать тысяч пятьсот рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	1 750 руб. (одна тысяча семьсот пятьдесят рублей)
Условия аукциона	Аукцион без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 13 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.07.2017 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 8 декабря 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. №401/С-31767 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский сад), площадью 1610,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422050400001000128 (назначение – для обслуживания здания детского сада), площадью 0,5434, расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Первомайская, 27. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0802 га
Начальная цена продажи	45 565,44 руб. (сорок пять тысяч пятьсот шестьдесят пять рублей сорок четыре копейки) с учетом НДС
Сумма задатка	2 278 руб. (две тысячи двести семьдесят восемь рублей)
Условия аукциона	Реконструкция и модернизация объекта
Продавец	ОАО «Скидельский сахарный комбинат», 231752, г. Скидель, ул. Первомайская, 1, 977-814
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	100% предварительная оплата
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 12 декабря 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.16.09.2017 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 6 декабря 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

Проведение первых повторных торгов по продаже имущества ИЧПУП «Нордальфа-Бел»

№ лота	Наименование лота	Начальная цена, руб. (без НДС)	Сумма задатка, руб.	Шаг торгов 5%, руб.
1	Кран подъемный прицепной коленчато-телескопический PAUS PTK 31	104 608,80	10 460,88	5 230,44
2	Коленчатый прицепной подъемник PAUS GT 18A	51 269,40	5 126,94	2 563,47
3	Коленчатый прицепной подъемник PAUS GT 18A	51 269,40	5 126,94	2 563,47
4	Профилегибочный станок SCOTTSDALE модель 6453 50	95 435,10	9 543,51	4 771,76
5	Пневмоукладчик «Тайфун»	8 758,80	875,88	437,94
6	Агрегат для вымешивания краски	3 894,30	389,43	194,72

Цена указана без НДС.

Местонахождение лотов: **Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 38.**

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY: начало – **20 декабря 2017 г.** в 9.00, окончание – 20 декабря 2017 г. в 17.00.

Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подается по 18.12.2017 г. на адрес электронной почты управляющего: ooo.business.way@gmail.com и организатора торгов: torgi24@tut.by.

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10% от его начальной цены и должен быть перечислен по **18.12.2017 г.** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **20.12.2017 г.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел. 8 029 670-30-84.

Продавец: **ИЧПУП «Нордальфа-Бел»,** в лице управляющего ООО «БизнесУэй», тел. 8 029 165-33-65.

Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. 8 029 6703084.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by и на сайте **WWW.TORGI24.BY**

У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што адчувае чалавек, калі яму да галавы прыстаўляюць пісталет?

— Прыемнага мала. Я разлічваў, што на той момант ён не будзе спяшацца пазбавіцца ад мяне. У любым выпадку яму трэба было кудысьці прыехаць. Быў толькі адзін момант, калі я не зусім разумеў яго логіку. Гэта калі ён запатрабаваў, каб выключылі сістэму відэаназірання. Якая мэта, калі чалавек ужо быў зафіксаваны на гэтай відэакамеры? Нешта задумаў, падалося мне. Потым, калі ён запатрабаваў дастаць цвёрды дыск, яго матыў стаў зразумелы.

— У інтэрнэце гэту гісторыю расклалі, як той казаў, па костачках. Нават была думка, што злачынца і не збіраўся страляць, маўляў, і пісталет у яго быў не баявы.

— Магу адназначна сказаць, што пісталет быў не цацачны. Больш за тое, у яго быў зняты засцерагальнік і дастаткова было націснуць на курок...

— А як атрымалася, што ён так лёгка вас адпусціў, калі ўбачыў пагоню?

— Ён загадаў, каб я выйшаў, і папрасіў яго не пераследаваць, а я скарыстаўся момантам. Ён проста страціў пільнасць. Думаю, што трымае сітуацыю пад кантролем. Упэўненасць у яго ўсяліла і тое, што я сябе паводжу бездакорна.

— Па адчуваннях, як доўга цягнуўся час у ролі заложніка?

— Паўгадзіны падаліся даўжынёй з жыццё.

— Па ўсім адчуваецца, што вы наогул прыйшлі ў міліцыю па клічы душы.

— Так яно і было. Я загарэўся гэтай марай яшчэ ў школьным узросце. У мяне далёка не мяккі і спакойны характар. Я пастаянна нешта шукаю, мне цікава разнастайнае жыццё. У 1992 годзе паступіў на Магілёўскі факультэт Акадэміі міліцыі МУС РБ. Савецкая форма, галіфэ, юхтовыя боты, фуражка — усё як трэба.

— Цяжка было вучыцца?

— Не лёгка. Мы адносімся да катэгорыі вайскоўцаў, і адсюль усё вынікае: страявы статут, казарменнае жыццё, жорсткая дысцыпліна, рэжым, нарады і гэтак далей. Усё гэта прысутнічала. Вучыцца было цяжка, але было б жаданне. Я наогул скончыў гэтую ўстанову з адзнакай.

— Як бацькі падтрымлівалі сына?

— Так атрымалася, што праз тры тыдні пасля таго, як я паступіў, памёр бацька. Прыходзілася, наадварот, падтрымліваць маці.

— Будучы курсантам, удзельнічалі ў нейкіх аперацыях?

— Нас прыцягвалі да аховы парадку яшчэ на 1 курсе. Спачатку была адміністрацыйная практыка, а потым крымінальна-прававая. Пасля першага курса стажыроўка ў аддзеле па барацьбе з крадзяжом сацыялістычнай маёмасці Ленінскага РАУС, аператыўная стажыроўка ў Цэнтральным РАУС. Калі паступаў, больш хацелася стаць экспертам-крыміналістам. Мне падабалася фатаграфаваць, меў сур'ёзныя навыкі па фотасправе, але пасля стажыроўкі ў крымінальным вышуку Цэнтральнага РАУС з'явілася выразнае памкненне застацца ў гэтай службе. Вельмі паўплываў на маё жаданне стаць сышчыкам старшы оперупаўнаважаны былога Цэнтральнага РАУС Яўген Лазаковіч. Для мяне ён быў вельмі ўразлівым прыкладам. Ён жа асабіста хадайнічаў за мяне перад начальнікам упраўлення крымінальнага вышуку Мікалаем Алейнікам. Сказаў: гэты хлопец на стажыроўцы зарэкамендаваў сябе сышчыкам. Яму трэба застацца ў вышуку. Мяне тады перавялі ў Кастрычніцкі РАУС, дзе начальнікам крымінальнага вышуку быў Аляксандр Рабыка.

— Тое, што на вас ускладалі вялікія надзеі як на сышчыка, перашкаджала або дапамагала?

— Надавала адказнасці. Калі мяне, маладога лейтэнанта, назначылі на падпалкоўніцкую пасаду — старшым оперупаўнаважаным па асабліва важных справах, некаторыя сумняваліся, маўляў, зялёны яшчэ, не справіцца. Мне тады быў усяго 21 год.

— З якімі злачынствамі прыходзілася мець справу?

— Памятаю выпадак, калі мы на чале з Аляксандрам Рабыкам выязджалі на месца злачынства. Амаль на ўскрайку Магілёва была знойдзена тазасцегнавая частка цела. Паведамленне, што хтосьці прапаў без вестак, не было, хто перад намі — не ведалі, шукай як хочаш. Гэта было ў выхадны дзень, а раніцай мне заданне — бяры машыну і едзь працуй па гэтай справе. У выніку да вечара я ўжо ведаў імя забойцы. Была адна маленькая прыкмета, па якой я дазнаўся. І вечарам ужо дакладаў начальніку, хто забітая і хто падазроная асоба. Гісторыя дастаткова бытавая. Забіла дачка. Маці моцна піла, і яна не вытрымала. Гэта было маё першае раскрытае за 1,5 года службы асабліва цяжкае злачынства.

— Каб мець справу з расчлянёнымі трупамі, патрэбны стальныя нервы.

— Для спецыяліста гэта звычайная справа. Падчас вучобы нас вазілі на ўскрыцці трупаў — вытрымаў, атрымаў аўтаматам залік па судмедэкспертызе. Не — ідзі, здавай тэорыю.

— А часта прыходзілася рызыкаваць па службе?

— У 90-я гады супрацоўнікі міліцыі рызыкавалі амаль штодзённа. Мы і на работу хадзілі, і спаць клаліся, лічы, з табельнай зброяй. Страляць не стралялі, але пагрозы былі, нажы таксама. І я карыстаўся зброяй пры затрыманні злачынцаў.

— І з крымінальнымі аўтарытэтамі мелі справу?

— Гэта былі хутчэй не аўтарытэты, а рэцыдывісты, якія пражывалі на тэрыторыі, якую я абслугоўваў. Але на той момант яны адчувальна ўплывалі на крымінагенную абстаноўку. Вызваляліся з месцаў пазбаўлення волі і дня не маглі пражыць без нейкіх там супрацьпраўных дзеянняў. Злодзейскія традыцыі, законы, сходкі, перадзел сфер уплыву, аўтабізнес, разбоі, крадзяжы кватэрныя — увесь крымінальны букет. Памятаю забойства, калі ахвяр закідвалі ў люк. Праводзім следчы эксперымент, а злачынца нечакана паказвае месца, дзе схаваў яшчэ адзін труп. Адкрываем — і там сапраўды забіты чалавек, на якога ў нас нават няма звестак, што ён стаў ахвярай злачынства. Такіх прыкладаў у 90-я было болей чым дастатокава. Мы нават не паспявалі іх раскрываць.

— Зараз вашым калегам-пачаткоўцам працаваць лягчэй?

— Раней крыху іншы прынцып быў. Я абслугоўваў некалькі мікрараёнаў — досыць вялікую тэрыторыю. І, калі нешта здарылася, накіроўвалі не следча-аператыўную групу, як зараз, а занальнага інспектара вышуку. Маўляў, ты ведаеш сваю тэрыторыю, ідзі і разбірайся. Раней аператыўнік збіраў матэрыял і цалкам займаўся справай. У мяне на стале ляжала больш за 20 такіх матэрыялаў праверкі, трэба было займацца ўсімі імі адначасова і паспяваць прымаць працэсуальнае рашэнне ва ўстаноўленыя законам тэрміны. Складанасці былі дастаткова сур'ёзныя. Таму, калі сёння нехта пачынае казаць, што яму цяжка, мне так хочацца нагадаць, як было раней. Раней нават машыну была праблема знайсці, каб з'ездзіць на месца забойства. Ідзі як хочаш і раскрывай. Шмат было расчлянёных забойстваў. У парку ў гонар 60-годдзя Кастрычніка забілі дзяўчыну, і злачынца вазіў па горадзе часткі яе цела і раскідваў. Зачэпак амаль ніякіх не было, але я знайшоў злачынцу. Гэта было забойства на бытавой глебе.

— Як вас адзначалі за раскрыццё найбольш складаных злачынстваў?

— Ёсць узнагароды — медалі трэцяй і другой ступені «За бездакорную службу» і «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку». Але не за канкрэтны від злачынстваў, а ў комплексе. Цягам апошніх двух гадоў вынік работы магілёўскай крымінальнай міліцыі — адзін з лепшых у рэспубліцы. А вось знак, якім я асабліва ганаруся, гэта «За адзнаку ў службе». Ён дадзены за выяўленне злачынных груп, асуджаных за бандытызм, якія здзейснілі асабліва цяжкія злачынствы. Першае — нападзенне, спалучанае з забойствам, а другое — разбойны напад на аб'екты гандлю.

— Раскажыце крыху пра сваю сям'ю.

— Жанаты, маю двух дзяцей. Старэйшы Павел сёлета паступіў у Акадэмію МУС. Гэта было цалкам яго рашэнне. Адгаворваць не стаў, але сказаў, што лёгка не будзе.

— Як падтрымліваеце фізічную і баявую форму?

— Па меры магчымасці праплываю па кіламетры ў басейне. Як і ўсе міліцыянеры, перыядычна здаю залік па стральбе ў ціры.

— Вы вельмі патрабавальны кіраўнік?

— Калі чалавек не хоча працаваць, прыходзіцца прымаць меры. Я сам прайшоў увесь міліцэйскі шлях, не ўсё адразу атрымлівалася, таму ведаю, што перш-наперш чалавеку трэба дапамагчы. Але, калі ўсе формы і метады вычарпаны, на жаль, прыходзіцца развітвацца. Або прапаноўваць іншую пасаду, іншыя формы працы. Некаторыя самі потым прызнаюцца: гэта было не маё. Роля кіраўніка вельмі вялікая. Мне ў жыцці шчасціла з настаўнікамі, цяпер гэта ўжо ветэраны, а ў мінулым начальнік Цэнтральнага РАУС Аляксандр Церахаў, ужо згаданы мной начальнік аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РАУС Аляксандр Рабыка, начальнік Кастрычніцкага РАУС Эдуард Марозаў, мой настаўнік па крымінальнай міліцыі Эдуард Барабанаў і шмат хто яшчэ.

— Вы так шмат ужо пабачылі ў сваёй працы, што можна пісаць кнігу.

— А я ўжо пішу, пакуль, праўда, мемуары, сёе-тое для будучай кнігі.

— Рамантычнае ўяўленне пра службу ў міліцыі з цягам часу не прайшло?

— Не. Проста змяніліся сітуацыя і абставіны.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

P. S. Упраўленне Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці паведаміла, што адноўлена інфармацыя з цвёрдага дыска камп'ютара аддзялення банка, дзе былі захоплены заложнікі. Гэты дыск з запісамі відэакамер назірання падазраваны ў рабаванні захапіў з сабой. Спецыялісты кажуць, што інфармацыя істотна дапаможа следству аднавіць дакладную карціну таго, што адбылося ў банку. Акрамя гэтага, следствам прызначныя балістычныя экспертызы прылады злачынства. У ходзе папярэдняга агляду ўстаноўлена, што па знешніх прыкметах гэта дакладная копія пісталета Макарава з унесенымі канструктыўнымі зменамі. Да таго ж устаноўлена, што пісталет заклінавала пры спробе выстраліць.

■ Прававая гасцёўня

ТВАЯ — МАЯ — ДЗЯРЖАЎНАЯ СПАДЧЫНА

Як вярнуць замежную маёмасць

— Я пяць гадоў была замужам за італьянцам. Жылі ў Неапалі, набылі там за грошы мужа невялічкую кватэру, нарадзілі сына. Пасля мы скасавалі шлюб, я з малым вярнулася на радзіму. Ці маю я нейкае права на тую маёмасць і ці можа наш сын разлічваць на спадчыну італьянскага бацькі?

Вольга Д., *г. Мінск.*

На пытанне адказвае **Марына ЖАНДАРАВА, начальнік аддзела выканання міжнародных дагавораў упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі**:

— Права на замежную маёмасць, згодна з дагаворамі аб прававой дапамозе, рэгулюецца законамі дзяржавы, на тэрыторыі якой яна знаходзіцца. Дагаворы аб прававой дапамозе рэгулююць вялікі спектр пытанняў: прызнанне дзеяздольным ці адсутным без вестак, устанаўленне факта смерці, заключэнне або скасаванне шлюбу, вызначэнне асабістых і маёмасных праваадносін мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей у змешаных шлюбах, атрыманне спадчыны, прызначэнне апекі, кампенсаванне шкоды і іншыя.

Узнікненне або спыненне права ўласнасці ці іншага маёмаснага права на маёмасць абумоўліваецца законам краіны месца знаходжання гэтай маёмасці на той момант, калі меліся абставіны, што сталі падставай такога права. Калі ж маёмасць з'яўляецца прадметам здзелкі, то ўзнікненне ці спыненне права ўласнасці вызначаецца законам краіны, дзе яна была здзейснена (калі іншае не прадугледжана пагадненнем бакоў).

А вось права ўласнасці на транспартныя сродкі, якія падлягаюць унясенню ў дзяржаўныя рэестры, вызначаецца, напрыклад, законам дзяржавы, дзе гэты сродак зарэгістраваны.

Дзякуючы міжнародным дагаворам беларусы могуць атрымаць замежную спадчыну на тых жа ўмовах і ў тым жа аб'ёме, што і ўласныя грамадзяне краіны. Права атрымання ў спадчыну вызначаецца законам апошняй краіны, дзе жыў спадчынадавец. У дачыненні да нерухомай маёмасці дзейнічаюць законы краіны, дзе яна знаходзіцца.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых ведамстваў мы будзем шукаць на іх адказы.

■ Кантрабанда

ЯБЛЫКІ І ПШАНІЦА ТРАПІЛІ ПАД АРЫШТ

Магілёўскія мытнікі прадухілілі спробы вывезці стратэгічны харчовы запас за межы краіны. У прэс-службе паведамілі, што пры выездзе з Магілёва быў прыпынены рух аўтамабіля ДАФ, у якім знаходзілася 18 тон польскіх свежых яблыкаў. Кіроўца збіраўся іх везці ў Расію па несапраўдных таварасуправаджальных дакументах. У выніку «вітаміны» агульным ацэначным коштам 45 тысяч беларускіх рублёў канфіскаваныя.

А на пшаніцу, якую мытнікі знайшлі пры аглядзе грузавой машыны «мерседэс» у Мсціслаўскім раёне, наогул не было дакументаў. 25 тон збожжа агульным ацэначным коштам каля 7,8 тысячы рублёў таксама канфіскаваныя.

Супрацоўнікамі Магілёўскай мытні пачаты адміністрацыйныя працэсы ў адпаведнасці з часткай 4 артыкула 12.17 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэнне правілаў гандлю і аказання паслуг насельніцтву).

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Дзяржкантроль

КУДЫ ЦЯКУЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ

На адным з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці выяўлены факты нерацыянальнага выкарыстання малака.

На паперы сітуацыя ў жывёлагадоўлі ўнітарнага прадпрыемства «Мажэйкава» выглядае не горш за мінулагодняе, паведамілі ў **Лідскім міжраённым камітэце дзяржкантролю**. Але ў ходзе праверкі ўстаноўлены факты прыпісак як па малаку, так і па мясе.

У ходзе інвентарызацыі на малочнатаварных фермах прадпрыемства ўстаноўлена нястача 53 тыс. кг малака на суму 20 тыс. рублёў. Праверка паказала, што расход цэльнага малака на ўласныя патрэбы гаспадаркі завышаны, а статак утрымліваецца ў нездавальняючых умовах. Не выконваецца план па прыбаўленнях, наадварот, гэты паказчык з году ў год зніжаецца. Калі буйную рагатую жывёлу пераважылі, выявілася нястача жывой вагі больш за 360 тон.

Устаноўлена, што за апошнія тры гады рэалізацыя жывёл жывой вагой камерцыйным арганізацыям адбывалася па цане ніжэйшай за сабекошт, страты склалі 534 тыс. рублёў.

Матэрыялы праверкі накіраваны ў праваахоўныя органы, дзе будзе дадзена прававая ацэнка дзеянням службовых асоб прадпрыемства.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

МІЖ НАВУКАЙ І МАСТАЦТВАМ

Унікальныя работы выстаўкі «Рабізна нябачаных палёў»

Замест палатна — тэхнічныя прыстасаванні, замест фарбы і пэндзля — выпраменьванне і ўласцівасці матэрыі. Напрыканцы Года навукі ў Беларусі ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася непаўторная выстаўка работ Эвяліны Домніч і Дзмітрыя Гельфанда «Рабізна нябачаных палёў», дзе размываецца мяжа паміж навукай і мастацтвам.

Для стварэння сваіх работ Эвяліна Домніч і Дзмітрый Гельфанд выкарыстоўваюць хімію ды фізіку, аб'яднаўшы гэтыя навукі агульнай мастацкай ідэяй. На сутыкненні дакладнага і ўяўнага прасочваюцца з'явы, якія ў звычайных умовах застаюцца недаступнымі няўзброенаму воку. Нездарма творцы — уладальнікі ганаровых прэмій *Japan Media Arts (Японія, 2007 год) і Ars Electronica (у 2007, 2009, 2011, 2013, 2017 гадах)*.

Эвяліна Домніч, якая мае дыплом аб заканчэнні філасофскага факультэта БДУ, нарадзілася ў Мінску, Дзмітрый Гельфанд — у Санкт-Пецярбургу, але ступень бакалаўра выяўленчых мастацтваў (кіно і відэа) атрымаў у Нью-Ёркскім універсітэце. У 1997 годзе Эвяліна і Дзмітрый сустрэліся ў ЗША і разам пачалі ствараць інсталяцыі і перформансы з дапамогай навуковых ведаў. Досвед мастакоў для творчых людзей незвычайны, бо, акрамя ўдзелу ў буйных міжнародных выстаўках сучаснага мастацтва, яны маюць багаты вопыт супрацоўніцтва з прэстыжнымі навукова-даследчымі лабараторыямі: Інстытутам сучасных навук і тэхналогій *(Японія)*, факультэтам фізікі і астраноміі *Vrije Universiteit (Нідэрланды)*, *Drittes Phisikalishes Institut* Гетынгенскага ўніверсітэта *(Германія)* ды іншымі. З 2008 па 2011 год Эвяліна Домніч і Дзмітрый Гельфанд працавалі ў лабараторыі *«Optofonica»*, а ўжо ў 2012 годзе адкрылі ў Амстэрдаме ўласную лабараторыю *«Synergetica»*.



Лазерна-электрахімічная інсталяцыя «Вадародзіна» Віктара Ведзеня.

Выстаўка «Рабізна нябачаных палёў» — гэта заклік да пазнання свету, бачнага і нябачнага, ключ да якога хаваецца ў навуковых ведах. У кожнай зале галерэі — па адным аб'екце. Натуральна, калі глядзіш на аб'екты, здаецца, што паміж магіяй і навукай няма мяжы: настолькі фантастычна выглядаюць экспанаты. Што цікава, экспанаты, створаныя з улікам нябачных працэсаў, міжволі абуджаюць цікавасць да бясконцага космасу. Прыкладам, лазерна-электрахімічная інсталяцыя «Вадародзіна», дзе ў ваду падаецца слабы электрычны ток, які расшчапляе яе, вызваляе бурбалкі вадароду. Вадарод узнімаецца на паверхню ў дзівосных завітках, якія перакручваюцца чароўнымі ўзорамі. Натуральна, правобразы галактык з мірыядамі зорак змясціліся ў «Вадародзіне»! Вадарод — гэта самы пашыраны ў сусвеце элемент, паліва для зорак. Як засцерагчыся ад касмічных асацыяцый?

Яшчэ адзін цікавы аб'ект — гука-хімічная абсерваторыя «Camera lucida». Напачатку гледача на некалькі хвілін пакідаюць у абсалютнай цемры, каб вочы адаптаваліся да ўспрыняцця светлавых канфігурацый гукавых палёў. Дарэчы, гэта таксама незвычайны ў сучасным асяродку досвед: ці часта жыхарам мегаполіса даводзіцца сустракацца з абсалютнай цемрай? Пасля адаптацыі можна падысці да празрыстага шара, напоўненага вадой: надзвычайныя, гіпнатычныя з'явы, што адбываюцца ўнутры, — гэта трансфармацыя гукавых хваляў у светлавыя, вынік працэсу гукалюмінісцэнцыі.

У межах закладзенай канцэпцыі, пад уздзеяннем аўтарскай думкі фізічныя феномены на выстаўцы пераўтвараюцца ў цэласны арт-аб'ект. Ці не такім бачылі мастацтва XXI стагоддзя нашы папярэднікі?

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

■ Фестываль

КРОПКАВЫ ЎДАР

Беларуская драматургія: найлепшыя спектаклі вызначалі ў Бабруйску

Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі — свята не частае. Асноўная яго задача — даваць штуршок айчынным аўтарам пісаць пра тое, што актуальна для нашага грамадства. Але і для тэатраў задаецца тон: ставіць пра сваё, весці з гледачом размову пра той свет, у якім ён існуе, які можа ствараць вакол сябе. Выбіраць было з чаго ў дзвюх намінацыях. Але рашэнне журы на чале з драматургам і старшынёй Саюза тэатральных дзеячаў Аляксеем Дударавым шмат у чым падаецца нечаканым. І ў першую чаргу вынікам па асноўных узнагародах: фактычна іх сабраў адзін спектакль.

Сцэна са спектакля «Кропкі на часавай восі».

Яго паказалі на фестывалі гаспадары з Магілёўскага абласнога тэатра імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, што ў Бабруйску. Можна было б сказаць тут пра дом і сцены, якія дапамагаюць. Але Бабруйскаму тэатру сапраўды дапамаглі — драматург Дзмітрый Багаслаўскі і запрошаны з Мінска рэжысёр Таццяна Траяновіч, якая паставіла спектакль «Кропкі на часавай восі», што ў выніку быў прызнаны найлепшым спектаклем Рэспубліканскага фестывалю нацыянальнай драматургіі.

Бабруйчане паспелі падрыхтаваць гэтую прэм'еру літаральна напярэдадні фестывалю. Рыхтаваліся адмыслова. Разумелі, што трэба. Тым больш што гэтую п'есу Дзмітрый Багаслаўскі прадставіў ужо на славутай «Лібімаўцы», атрымаў добрыя водгукі...

Тут дакументальная аснова: разглядаючы старыя фота (прызнаныя найлепшымі за апошнія 100 гадоў), можна паспрабаваць аднавіць (прыдумаць) гісторыі герояў, адлюстраваных на іх. Героі — родам з розных мясцін (прасторы, зямель, краін), іх звязвае хіба што час, у які глядач назірае за імі. І яшчэ тое, што ўсе мы — людзі — аднолькава адчуваем, разумеем, перажываем, незалежна ад таго, дзе і ў які час жывём. Тэма, актуальная ў перыяд, адзначаны глабальнымі тэндэнцыямі, адгукнулася нават у беларускім Бабруйску — дабрыня і чалавечнасць вышэй за ўсё...

Таму п'еса Дзмітрыя Багаслаўскага «Кропкі на часавай восі» перамагла ў сваёй намінацыі. А рэжысёра Таццяну Траяновіч назвалі найлепшым рэжысёрам сярод пастаноўшчыкаў у намінацыі тэатра драмы. Сярод мастакоў-пастаноўшчыкаў таксама адзначана сцэнограф гэтага спектакля Валянціна Праўдзіна.

На што маглі разлічваць у такіх умовах іншыя тэатры, што разглядаліся ў конкурснай праграме «Спектакль тэатра драмы»? Напрыклад, на выдатную акцёрскую ігру. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага атрымаў узнагароду за найлепшую мужчынскую ролю ў спектаклі «Пясняр» паводле п'есы Васіля Дранько-Майсюка: адзначаны артыст Сяргей Жбанкоў. У спектаклі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Сіндром Медзі» паводле Юліі Чарняўскай былі адзначаны адразу дзве актрысы: Людміла Сідаркевіч — у намінацыі «Найлепшая жаночая роля», Гражына Быкава — у намінацыі «Найлепшая жаночая роля другога плана».

Больш намінацый і больш конкурсных праграм — больш тэатраў, што атрымліваюць узнагароды, адпаведна. У праграме «Эксперымент» усё аказалася не так адназначна. Тут, на дзіва, была адчувальная перавага лялечнікаў нават па колькасці ўдзельнікаў. І сапраўды, беларускія лялечнікі здольныя здзіўляць не толькі айчынную публіку, а яшчэ і журы...

Рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра лялек Ігар Казакоў, які ўмее ўражваць, на гэты раз здзівіў зваротам да Уладзіміра Караткевіча: яго спектакль «Сіняя-сіняя» прызнаны найлепшым сярод экспериментальных пастановак. Зрабіла сваю справу ў гэтым і сцэнаграфія Таццяны Нерсісян, якая атрымала сваю ўзнагароду. У гэтым жа спектаклі звярнулі ўвагу на працу акцёра Мікалая Сцешыца — гэта «Найлепшая мужчынская роля».

Гродзенскі абласны тэатр лялек з «Камедыяй Юдзіфі» Сяргея Кавалёва не застаўся без узнагарод у эксперыментальным конкурсе дзякуючы выдатнай актрысе Ларысе Мікуліч — за ёй «Найлепшая жаночая роля».



Сцэна са спектакля «Сіняя-сіняя».

Дзіўна, што скарынаўская тэма на фестывалі адзначана вельмі сціпла. «Скарына» Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра ў пастаноўцы Мікалая Рудкоўскага і Саўлюса Варнаса адзначаны за мужчынскую ролю другога плана — Майстра, якога іграе акцёр Васіль Галец. Але слава Скарыны, відаць, патрабуе часу і ў тэатры, як не адразу даходзіў да людзей сэнс яго спраў і слоў.

Класікі больш блізкія і больш зразумелыя. Як Уладзімір Караткевіч: ён пакінуў багатую спадчыну, што можа быць запатрабаванай у наш час у тэатры. Тым больш з такой вечнай тэмай, што гучыць у «Ладдзі роспачы». Рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Аляксей Ляляўскі знайшоў сучасны падыход да інтэрпрэтацыі, за што быў адзначаны ў намінацыі «Найлепшая рэжысура». Фактычна класік у эксперыментальным конкурсе.

Наогул, звяртае на сябе ўвагу цікавасць да класікі на сучасным фестывалі: да Скарыны, Купалы, Караткевіча... Магчыма, таму, што мы дагэтуль не ўсе іх ідэі зразумелі? І ёсць яшчэ што асэнсоўваць з тых, былых эпох? Можа, таму наш новы сучасны тэатр так складана адваёўвае сваё месца ў сэрцах і розумах людзей? І патрэбны яшчэ не адзін тэатральны фестываль, каб людзі — не толькі ў Бабруйску — зразумелі: гэты час і гэты пункт на карце варты даследаванняў і эксперыментаў зараз. Яны дапамагаюць намацваць шлях да наступнага пункта, які стане важным у будучыні.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Кінакрокі: фільм, што не атрымаўся

ХЛОПЕЦ ЕДЗЕ — НУ І ШТО?

Калі за кіно выдаецца тое, што кіно не з'яўляецца

У пытанні арганізацыі паказаў беларускага кіно ў Мінску ёсць адзін, можна сказаць, беспрэцэдэнтны праект — «Сваё кіно», што ў Арткінатэатры перыядычна арганізуе паказы фільмаў беларускіх рэжысёраў і іх абмеркаванне з аўтарамі. На шчасце, паказваць нам ёсць што, і «Сваё кіно» гэта часта пацвярджае. Нават дыскусіі сапраўды адбываюцца — прага гледача да абмеркавання ўбачанага, асабліва калі гэта тэрытарыяльна яго датычыцца, відавочная, што ёсць адной з прычын, чаму названы праект прыцягвае да сябе ўвагу. Але часам, калі ты прыходзіш на паказ і бачыш не фільм, а толькі на яго прэтэнзію, раптам успамінаеш, што беларускі кінематограф — у зацяжным крызісе. І калі амаль што адзіны ў своеасаблівай канцэпцыі праект паказвае нават не дылетанцкае кіно, а проста відэа, гэта шмат пра што кажа.

Гэтым разам, 29 лістапада, у Арткінатэатры мы глядзелі паўгадзінную карціну «Коля едзе», якая чамусьці называецца яшчэ і «антыпакемонным фільмам». Гледзячы на назву, адразу ўспамінаецца больш прыстойны праект — кнігу кругасветнага падарожніка Рамана Свечнікава «Рома едзе», што можа быць наўмысна адсылкай. Адзін з прадзюсараў Леанід Каліценя (яго калега і спадарожніца па жыцці — Наталля Бружнік) перад паказам распавёў, што карціна стала вынікам імпэту стварыць фільм на сярэдзіне паміж глядацкім кіно і артхаусам, то-бок у цікавай форме, але і з думкай. Сцэнарый напісаў Сяргей Анцалевіч. Рэжысёрам стаў дзеяч барысаўскай тэатральнай сферы Сяргей Сергіенка, для якога, дарэчы, работа «Коля едзе» стала амаль што дэбютнай. Фільм аказаўся заснаваным на рэальным здарэнні (але ж ці кожнае рэальнае здарэнне вартае экрана? — зразумела, не). У выніку ў рамках праекта «Сваё кіно» адбылася прэм'ера стужкі.

Фільм аказаўся заснаваным на рэальным здарэнні (але ж ці кожнае рэальнае здарэнне вартае экрана? — зразумела, не).

Сумна тое, што праект, які павінен выхоўваць давер да беларускага кіно і паказваць яго найлепшыя ўзоры, паказаў карціну «Коля едзе».

Фільм ахоплівае падзеі аднаго дня. Бацькі святкуюць гадаўшчыну; хлопец Жэня — іх сын — са сваёй дзяўчынай тусуецца ў тату-майстэрні; у аднаго з сяброў Жэні дзень нараджэння, але Коля, малодшы брат Жэні, «падлетак з ментальнай інваліднасцю», губляецца ў вялікім горадзе. Уласна на працягу амаль усяго фільма мы глядзім, як персанажы нервова шукаюць Колю, а ён гэтым часам едзе ў аўтобусе альбо сядзіць на прыпынку і ў цэлым адчувае сябе нармальна.

У стужцы няма ні ўцямнай ідэі, ні канфлікту, ні кінематаграфічнага «соку», затое тут дастаткова непатрэбных дэталяў. Гэта незразумелыя праявы эмоцый Жэні, пачуцці паміж парамі, праява дабрыні з боку інспектара ДАІ альбо напружанасць рабочага дня ў аддзяленні міліцыі, сунічнае мыла, якое муж дорыць жонцы на гадаўшчыну, крыжаванкі, якімі займаецца супрацоўніца сацыяльнага цэнтра і якія спешна хавае перад прыходам заклапочаных бацькоў Колі. Кожны персанаж нясе з сабой непатрэбную інфармацыю, якая не толькі нічога не дадае галоўнай канве фільма, але і сама па сабе не складваецца ў нейкую лагічную карціну.

Падчас абмеркавання было агучана, што стваральнікі карціны «Коля едзе» хацелі паказаць, як праз пошук зніклага хлопца і эмацыянальнае ўзрушэнне падлеткі становяцца дарослымі, а з дарослымі, магчыма, таксама нешта адбываецца, але нічога такога ў фільме заўважана не было. Падлеткі застаюцца такімі ж і ў канцы фільма — гэта такі камедыйны момант, — не заўважаюць, як Коля садзіцца ў сацыяльнае таксі і з'язджае. Калі аўтары сапраўды імкнуліся паказаць эвалюцыю герояў, то апошні эпізод гэта імкненне перакрэслівае. Драматургіі фільма дапамагло б знаходжанне ў невядомасці, што з Колем і дзе ён знаходзіцца. Уключэнне ў карціну эпізоду, дзе хлопец катаецца на аўтобусах і прапануе выпадковым людзям яблыкі, пазбаўляе карціну магчымасці хоць у нечым зачапіць гледача. Улічваючы відавочныя і невідавочныя «касякі», карціна «Коля едзе» атрымалася зусім няўдалай. Што казаць — кіно тут няма. Затое мы памятаем адзін з найлепшых фільмаў апошняга часу «Душы мёртвыя», прадзюсарамі якога таксама сталі Леанід Каліценя і Наталля Бружнік.

У стужцы няма ні ўцямнай ідэі, ні канфлікту, ні кінематаграфічнага «соку», затое тут дастаткова непатрэбных дэталяў.

Што найбольш сумна ў гэтай гісторыі — гэта не няўдалы фільм, ой, колькі іх ствараецца кожны год. Сумна тое, што праект, які павінен выхоўваць давер да беларускага кіно і паказваць яго найлепшыя ўзоры, паказаў карціну «Коля едзе», што падаецца адным з найцікавейшых сучасных беларускіх фільмаў. Ва ўмовах, што склаліся ў беларускім кінематографе, мы не можам сабе дазволіць дрэнны адбор ■

■ Кінакрокі: фільм, што атрымаўся

ДАЛІКАТНАЯ ДЗЁРЗКАСЦЬ

КІНО ПРА ФАНАТА ЯК ЗНАК СТАНУ КОНТРКУЛЬТУРЫ

Слава Андрэя Кудзіненкі робіць яго, магчыма, адным з найвядомейшых сучасных беларускіх рэжысёраў. Вучань Віктара Турава, прызёр міжнародных кінафестываляў, стваральнік жанру «бульбахорар», аўтар фільмаў «Акупацыя. Містэрыі», «Розыгрыш» і «Масакра», рэжысёр, што свядома адмовіўся ад прыбытковай працы над расійскімі серыяламі, нарэшце, арганізатар праекта «Хранатоп» і аўтар філасофіі-не філасофіі, але ідэі «хронотопи», у якой трэба памерці, каб нарадзіцца ў новай якасці. Дык вось, Андрэй Кудзіненка, які да гэтага меў справу толькі з ігравым кіно, зняў сваю першую дакументальную работу. Фільм «Фанат» пра заўзятара «Дынама Брэст» Васю-пешахода ўпершыню шырокай публіцы быў паказаны на кінафестывалі «Лістапад». І мы ўбачылі не наўмысна, але андэграўндную карціну, літаральна прасякнутую адпаведным мысленнем.

«Фанат» — фільм без прэтэнзій на складанасць, ён не ахоплівае вялікі прамежак часу, не імкнецца закрануць нешта глабальнае, эпахальнае, сацыяльнае. Дакументальная карціна цікавая якраз духам ледзь бачнага бунтарства, контркультуры, альтэрнатыўных правілаў існавання. Глядзіце самі: магутны фанацкі рух, што значыць неўтаймаваную сілу, эмоцыі і ўласныя законы; храбрасць і імкненне галоўнага героя да мэты; знакі пустэльніцтва, беспрытульнасці і чалавечага супрацьстаяння непадуладнаму духу (хваробе); існаванне ў своеасаблівым адарваным ад рэальнасці свеце і так далей.

З Васем усё ў парадку, а нюанс, што характарызуе фанацкі рух у Беларусі, контркультуру і андэграўнд у тым ліку, адбыўся.

Вася-пешаход — гэта Васіль Нікалаеў, што хварэе за футбольны клуб «Дынама Брэст» і ходзіць на футбол пешшу. Разам з Андрэем Кудзіненкам мы бачым яго дваццаты пешаходны трып на матч — гэтым разам на фінал кубка ў Гродне, за які збіраецца змагацца брэсцкае «Дынама». За спінай у галоўнага героя — больш за пяцьдзясят з паловай тысяч пераадоленых кіламетраў. Больш за тое, Васілю яшчэ перад захапленнем пешымі падарожжамі паставілі дыягназ і з несуцяшальным прагнозам, маўляў, жыць засталося не больш за два гады. Але заўзятар памяняў стыль жыцця і стаў хадзіць — менавіта хадзіць — на матчы з удзелам «Дынама Брэст». Гэта было пяць гадоў таму.

У фільме мы суправаджаем Васіля Нікалаева на шляху ўздоўж праспекту, лясоў і вёсак, падчас размоў з мясцовымі жыхарамі, у час наладжвання лагера на ноч і сціплай вячэры (што нейкім чынам пераклікаецца з іншым фільмам Нацыянальнага конкурсу «Лістапада» «Вакол Беларусі на веласіпедах з маторамі» — адной з найлепшых карцін праграмы). У прынцыпе нецікавы працэс падарожжа лагічна павінен быць аздоблены займальнымі эпізодамі пра тое, што ў гэтым падарожжы здараецца. І ў «Фанаце» ён аздоблены — вельмі лёгка, пункцірна, другарадна — ненавязлівымі паралелямі, у якіх быццам і адлюстроўваецца краіна, але на гэтым дакладна не робіцца акцэнт, бо інакш той своеасаблівы фанацкі свет перастане быць першасны.

Гэтым разам на экране вельмі каларытны мужчына — жыхар вёскі Навасёлкі — у майтках і з палкамі для скандынаўскай хадзьбы.

Затое гэтыя элементы абавязкова падтрымаюць цікаўнасць гледача. Напрыклад, размова з каларытнымі вясковымі бабулямі, адна з якіх прызнаецца, што ў маладосці таксама была заўзяткаркай і ведала імёны ўсіх італьянскіх футбалістаў. Альбо паводзіны Васіля, што паказваюць, здаецца, на імкненне пры кожным зручным выпадку расказаць пра колькасць пераадоленых кіламетраў. Выбар новай палкі з рагаткай на канцы, бо бабулі не зацанілі тую, з якой Васіль прыйшоў да іх. Альбо размова з мужчынам на стадыёне — я, праўда, не ведаю, хто ён, — які цвяроза ацэньвае сітуацыю ў футболе і кажа, што «на гэта ўсё патрэбны час». Не апошнюю ролю тут іграе гісторыя самога Васіля — яго вялікая сям'я і пэўныя складанасці з айчымам, дыягназ, расставанне з дзяўчынай.

Самым адметным эпізодам, што разбаўляе мернасць падарожжа Васіля, з пункту гледжання спосабу здымак, а не зместу фільма, будзе, канешне ж, «кліп» на песню «Дай дарогу» аднайменнага гурта, нечакана ўстаўлены ў складны рытм «Фаната». Уласна ў гэтай сцісламе лепш за ўсё праяўляецца блазенства рэжысёра: рапід, перавернуты экран, канцэнтрацыя на дэталях, мантаж джамп-кат, зваротнае здымманне, аб'яднанне розных па часе падзей... і адразу новая сустрэча. Гэтым разам на экране вельмі кінематаграфічна «стыльны» мужчына — жыхар вёскі Навасёлкі — у майтках і з палкамі для скандынаўскай хадзьбы, які прыўносіць ў падзеі нейкі камічны сюр.

Шэраг планаў, дзе камера здымае галоўнага героя праз нейкую рамку (створаную сценамі, праёмам у бетонным мануменце ці нечым яшчэ) папярэднічае ўвогуле сэнсастваральнаму эпізоду, у якім супрацоўнікі АМАП падыходзяць да Васі-пешахода і некуды вядуць. З Васем усё ў парадку, а нюанс, што характарызуе фанацкі рух у Беларусі, контркультуру і андэграўнд у тым ліку, адбыўся.

Васілю яшчэ перад захапленнем пешымі падарожжамі паставілі дыягназ з несуцяшальным прагнозам, маўляў, жыць засталося не больш за два гады.

На фоне апошніх ураджанняў ад фільмаў маладых і немаладых рэжысёраў, прасякнутых альбо штампаваным мысленнем альбо абмежаваным кругаглядам, варта ацаніць вельмі далікатнага, ураўнаважанага, але ўсё ж такі дзёрзкага «Фаната». Вы гэтай дзёрзкасці можаце і не заўважыць: ну, ідзе чалавек і ідзе, трапляе на матч, радуецца забітым галам любімага футбольнага клуба. Галоўнае, што і сам рэжысёр, магчыма, гэтага не заўважае, але свой першы дакументальны фільм робіць знакам альтэрнатыўнага мыслення. У першую чаргу таму што сам мысліць у гэтым рэчышчы і сумяшчае ў фільме любімыя сталкерамі закінутыя пабудовы і каларытныя вясковых бабуль, фанацкую культуру і чалавечую адзіноту, эмацыянальны катарсіс і суправаджэнне амапаўцамі. Зусім нездарма Андрэй Кудзіненка — адзін з найвядомейшых беларускіх рэжысёраў ■

Матэрыялы падрыхтавала
Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

Курс на моцную эканоміку

Жлобінскі раён мае ўсе неабходныя ўмовы для дынамічнага развіцця.

Сёння на яго тэрыторыі працуе 16 прамысловых прадпрыемстваў. Вядучай галіной, безумоўна, з'яўляецца чорная металургія. **Намеснік старшыні Жлобінскага райвыканкама па пытаннях эканомікі Валянцін УНДРУЛЬ** адзначае, што асноўны ўплыў на фарміраванне паказчыкаў па вытворчасці прамысловай прадукцыі, экспарту, імпарту, выручцы, прыбытку, заработнай плаце, энергазберажэнню аказвае ААТ «Беларускі металургічны завод»:

— Аб'ёмы вытворчасці прадукцыі на 91% сфармаваны за кошт БМЗ. Аднак у нас развітыя таксама харчовая, дрэваапрацоўчая, лёгкая прамысловасці. У сферы спажывецкіх тавараў самую вялікую ўдзельную вагу (каля 53%) займае «Жлобінскі мясакамбінат». Увогуле ж па раёне за дзесяць месяцаў бягучага года аб'ём вытворчасці роўны 1 млрд 412 млн бел. руб. Гэта 104,2% да адпаведнага перыяду мінулага года. Больш 70% прадукцыі, якая ў нас вырабляецца, ідзе на экспарт. Геаграфія замежнагандлёвай дзейнасці прадпрыемстваў раёна ахоплівае 60 краін свету. Сёлета наладжаны сувязі яшчэ з дзесяццю краінамі, з якіх экспарт пачаў ажыццяўляцца ў пяць. Нашы асноўныя гандлёвыя партнёры — Расія, Італія, Польшча, Вялікабрытанія, Германія, ЗША, Латвія... Прадукцыю туды адгружаюць адкрытыя акцыянерныя таварыствы «БМЗ», «Белфа», «Жлобінскі мясакамбінат», таварыствы з абмежаванай адказнасцю «Ака», «Завод тканых і зварных сетак», закрытае акцыянернае таварыства «Таніс» і іншыя.

Жлобінскі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці па вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. На тэрыторыі раёна 156 населеных пунктаў. Тут пражывае 102,2 тысячы чалавек, у тым ліку ў Жлобіне — 75,7 тысячы. Жлобін з'яўляецца адным з самых буйных чыгуначных вузлоў Рэспублікі Беларусь. Гэта дазваляе рэгіёну мець актыўныя стасункі з Расіяй, Польшчай, Украінай, рэспублікамі Прыбалтыкі і Закаўказзя.

Менавіта Жлобін адпраўляе на экспарт звыш чвэрці ўсіх паставак Гомельскай вобласці. Высокімі тэмпамі ў раён прыцягваюцца і інвестыцыі ў асноўны капітал. Вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ў раёне ажыццяўляюць 19 сельгасарганізацый. Агульны аб'ём вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі за дзесяць месяцаў года склаў 108,8% пры заданні 103% (гэта 94 912 тыс. бел. руб.).

— Як вы ацэньваеце прадпрымальніцкую актыўнасць?

— У нас зарэгістравана 607 суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, індывідуальных прадпрымальнікаў — звыш 2100 чалавек. За гэты год у раёне створана 23 новыя прадпрыемствы, дзе цяпер працаўладкаваны 241 чалавек. Да таго ж, самастойна зарэгістравалі прадпрымальніцкую дзейнасць 222 чалавекі. Некаторым беспрацоўным са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва аказана садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці.

— Як у раёне развіваецца спажывецкі рынак?

— Даволі паспяхова. У нас 640 гандлёвых аб'ектаў. За дзесяць месяцаў уведзена ў эксплуатацыю яшчэ 16 гандлёвых аб'ектаў (плошча 1533 кв. м). Дарэчы, сярэднямесячная заработная плата ў Жлобіне цяпер складае 739,7 бел. руб. Тэмп росту да адпаведнага леташняга перыяду склаў 118,8%. Па ўзроўні заробку раён займае трэцяе месца ў вобласці.

— У чым вы бачыце перспектывы развіцця раёна?

— Нам трэба павышаць эфектыўнасць працы прадпрыемстваў, ствараць новыя працоўныя месцы. Важна, каб павышэнне заработнай платы адбывалася адначасова з ростам прадукцыйнасці працы. Мы збіраемся максімальна нарошчваць экспартны патэнцыял, весці актыўную інвестыцыйную дзейнасць. У тым ліку працягваць мадэрнізацыю прадпрыемстваў і прыцягненне прамых замежных інвестыцый.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЛЕПШ АДЗІН РАЗ ПАКАШТАВАЦЬ

Торт «Жлобінскі» і хлеб «Краюшкі духмяныя» атрымалі залаты медаль на рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смакота-2017». Летась ганаровае золата жлобінскім хлебапёкам прынеслі хлеб заварны подавы «Легенда» і хлеб катэгорыі люкс «Залатая восень». І гэта толькі самыя апошнія дасягненні, а ўвогуле іх безліч. Жлобінскі хлебазавод пастаянна атрымлівае ўзнагароды не толькі на конкурсах, якія праводзяцца ў Беларусі, але і на высокіх міжнародных спаборніцтвах.

Дырэктар Жлобінскага хлебазавода Рыгор КЛІМАЎ гаворыць: штодзень з канвеера сыходзіць каля 40 найменняў розных хлябоў.

— На любы густ ёсць. Белы і чорны хлеб робім, у тым ліку з зерневымі дабаўкамі і ў рознай расфасоўцы. Кандытарскіх вырабаў — да 50 найменняў кожныя суткі. Гэта і мяккія торты і пірожныя, і кексы, і рулеты, і ласункі цукровыя, мучныя... Вырабляем пячэнне, сухія кісялі, шчарбеты, казінакі, паніровачныя сухары, ромавую бабу... Мы выпускаем і нізкакаларыйную кандытарскую прадукцыю, і зерневыя дабаўкі, і пасыпкі. Разумеем, што пакупніка пастаянна трэба нечым новым прывабліваць. Асартымент вялікі, а ўся выпечка па смаку падобная на дамашнюю.

Кандытар Ніна ЯКАЎЧУК.

Пекар Галіна БІЛАН.

У рэспубліканскім конкурсе «Ласунак», які штогод праходзіў у межах міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «Хлебная і кандытарская справа», жлобінскія хлебапёкі стала прымалі ўдзел. Як і ў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя тэхналогіі і абсталяванне для хлебапякарнай і кандытарскай вытворчасці». І без узнагарод ніколі не вярталіся. Медалі высокай вартасці маюць хлябы «Асалода», «Жлобінскі на мёдзе», «Абляпіхавы», «Лаватэра», «Дабранскі», «Барок», «Баляслаўскі», «Бабулін пачастунак»...

Начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі прадпрыемства Любоў ГАНЧАРОВА ведае ўсе сакрэты:

— Ёсць розныя схемы прыгатавання хлеба. Напрыклад, з выкарыстаннем малочнакіслых бактэрый. Такі хлеб гатуецца каля 20 гадзін. Ён павінен назапасіць водар і смак да таго, як трапіць на стол спажыўца. Хлябы могуць быць з дабаўкамі: канцэнтратам кваснага сусла, мёдам, сухафруктамі, насеннем сланечніка, арэхамі... Гэта багатыя хлябы, яны нятанныя, але запатрабаваныя. Ёсць людзі, якія любяць менавіта такую нашу прадукцыю. Увогуле ж прапануем шмат рознай прадукцыі: і таннай, і больш дарагой. І вага — ад 50 грам да 1 кілаграма. Шмат нашых распрацовак цяпер выкарыстоўваюць і іншыя хлебакамбінаты краіны.

Жлобінскі хлебазавод корміць хлебабулачнымі і кандытарскімі вырабамі каля 105 тысяч жыхароў горада і прыгарада. Штодня на прылаўкі крам горада паступае каля 10 тон хлебабулачных вырабаў. Тут прымаюць як калектыўныя, так і індывідуальныя заказы.

Асобным радком трэба сказаць пра кандытарскія вырабы са Жлобіна. Заказваць іх менавіта сюды едуць аж з Мінска! А ўсё таму, што тут працуе **кандытар Ніна ЯКАЎЧУК**. Менавіта ў яе руках цукровая мастыка ператвараецца ў кветкі, герояў мультфільмаў і увогуле у што пажадаеце. Тры гады таму Ніна Юр'еўна стала сярэбраным прызёрам Сусветнага кулінарнага кубка — 2014 у Люксембургу. Летась паспяхова прадстаўляла Беларусь на Сусветнай алімпіядзе кандытараў — 2016 у нямецкім горадзе Эрфурце. Яе салодкая кветкавая кампазіцыя пад назвай «Натхненне» была ацэнена зноў серабром.

І вось, нарэшце, даўно заслужанае золата. Творчая работа «Подых восені» Ніны Якаўчук у намінацыі «Цукровыя кветкі» ацэнена самай вышэйшай узнагародай конкурсу кандытараў «Трыумф стылю і смаку — 2017», які сёлета прайшоў у межах міжнароднага хлебнага салона.

Сціплая Ніна гаворыць, што выпадкова і нават нечакана для сябе самой трапіла ў прафесію. Але ж сёння яе ні за што не памяняе. Салодкая творчасць дастаўляе ёй самой неймавернае задавальненне, а жлобінскаму камбінату забяспечвае заказы. Торты ў яе руках ператвараюцца ў сапраўдныя шэдэўры, якія ніколі не паўтараюцца двойчы.

Калектыў жлобінскага хлебазавода, дзе цяпер працуюць 180 чалавек, штодня прыкладае шмат намаганняў, каб на стол да жыхароў вялікага райцэнтра трапіў самы свежы і самы смачны хлеб. Тут ручаюцца за якасць прадукцыі. Бо, самае галоўнае, — яна робіцца з душой.

УНП 400173506

СЛАВУТАСЦІ ЖЛОБІНШЧЫНЫ

Палацава-паркавы ансамбль у Красным Беразе

У Красным Беразе захаваўся ўнікальны помнік палацава-паркавай архітэктуры другой паловы XIX стагоддзя. Былы маёнтак належаў генерал-лейтэнанту інжынерыі Міхаілу Гатоўскаму. Ён аддаў будынак у якасці пасагу дачцэ Марыі, якая выйшла замуж за Вікенція, сына расійскага алігарха Альфонса Козел-Паклеўскага. Вікенцій стаў асноўным нашчадкам не толькі багацця паспяховага бацькі-прадпрымальніка, але і маёнтка ў Красным Беразе. Палац, пабудаваны ў 1893 годзе ў стылі, які спалучае неаготыку і неарэнесанс, сёння адкрыты для наведванняў. Кожная зала мае сваю стылістыку — «раманскую», «арабскую», «рэнесансную»...

Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Смычок»

Ландшафтны заказнік плошчай 2635 гектараў прызначаны захаваць унікальныя прыродныя комплексы з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл, занесеных у «Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь». Ён размяшчаецца там, дзе Бярэзіна зліваецца з Дняпром. На тэрыторыі заказніка сустракаецца каля 40 рэдкіх, занесеных у Чырвоную Кнігу відаў птушак. Сярод іх чорны бусел, вялікі і малы бугай, лебедзь-шыпун, гогаль, пустальга, сокал-каршачок, зімародак, рэмез і іншыя. Сучасная рачная іхтыяфаўна басейна Дняпра ўключае 38 відаў рыб. На тэрыторыі заказніка распрацаваны турыстычныя маршруты. На тэрыторыі запаведніка знаходзіцца велізарны курган, пра які расказваюць шмат легендаў.

Цэнтр алімпійскага рэзерву па хакеі з шайбай і плаванні

Спартыўны комплекс у Жлобіне архітэктурна аб'ядноўвае тры спартыўна-аздараўленчыя ўстановы: лядовы палац, плавальны басейн і аквапарк. На лядовай арэне праводзіцца шмат спартыўных спаборніцтваў, у тым ліку міжнароднага ўзроўню, канцэрты, масавыя катанні на каньках... У плавальным басейне на 50 метраў трэніруюцца прафесіяналы, а таксама праходзяць заняткі па акваэробіцы і хуткасным падводным плаванні. Аквапарк спраектаваны на аснове найлепшых замежных аналагаў. У яго забаўляльную зону ўваходзяць два басейны, водная горка даўжынёй 76 метраў, горная рака, гейзеры, джакузі. У 2010 годзе адкрыта вяслярная база.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

ШТУЧНАЕ НЕ ГОРШАЕ ЗА НАТУРАЛЬНАЕ

ААТ «БЕЛФА»: УВАЖЛІВА СОЧЫМ ЗА ТЭНДЭНЦЫЯМІ МОДЫ І ХУТКА ЎВАСАБЛЯЕМ ІХ У СВАІХ ВЫРАБАХ

Заснаванае амаль 40 гадоў таму, жлобінскае прадпрыемства з'яўляецца адным з лідараў вытворчасці штучнага футра ў краінах СНД. У аснове вытворчай стратэгіі ААТ «БЕЛФА» — выкарыстанне якаснай сыравіны, пашырэнне і абнаўленне асартыменту прадукцыі, індывідуальны падыход у рабоце з партнёрамі. Генеральны дырэктар ААТ «БЕЛФА» Алена КЛІЦУНОВА гаворыць, што інтарэсы спажыўцоў трэба не толькі цалкам задавальняць, але і пераўзыходзіць іх чаканні ў якасці:

— На фабрыцы штомесяц вырабляюць 250—300 тыс. кв. метраў ворсавага трыкатажнага палатна. Асноўны асартымент прадпрыемства налічвае больш за 500 узораў. Іх выкарыстоўваюць як непасрэдна для вытворчасці адзення, так і для іншых вырабаў. Наша палатно можна знайсці як падшэўку ці аздабленне верхняга адзення. Яно можа знаходзіцца і ўнутры абутку. Наша штучнае палатно звязана з натуральнай воўны. Таму яно і цёплае, і практычнае, і не такое дарагое, як натуральная аўчына. Менавіта таму многія прадпрыемствы па вытворчасці абутку аддаюць перавагу нашым палотнам з натуральнай воўны.

— Алена Паўлаўна, раскажыце больш падрабязна пра асартымент.

— Мы вырабляем штучнае футра для верхняга адзення: пад норку, пад аўчыну, пад цыгейку, жакардавае. Ёсць палатно для адзення спецпрызначэння. Яго закупляюць для стварэння вопраткі як беларускіх, так і расійскіх вайскоўцаў. Застаецца актуальным футра для вырабу цацак. Для дэкаратыўных вырабаў робім футра як з сінтэтычных валокнаў, так і з дабаўкай ваўняных. На фабрыцы шыем з нашых палотнаў самыя розныя рэчы: жаночае адзенне, маскарадныя касцюмы, камізэлькі, палярыны і жакеты вясельныя, дэкаратыўныя дываначкі, коўдры, падушкі і нават папулярныя ў моладзі зверашапкі. Сертыфікацыя, дарэчы — сур'ёзная частка выдаткаў пры вытворчасці нашых тавараў, але інакш сёння проста нельга працаваць на рынку. Мы даём гарантыю наконт бяспекі і экалагічнасці нашых палотнаў.

— Якім чынам на прадпрыемстве заахвочваюць людзей?

— Мы ганарымся людзьмі, многія з якіх маюць адзіны запіс у сваёй працоўнай кніжцы: ААТ «БЕЛФА». Сапраўды, у нас працуюць сямейнымі дынастыямі. Такім чынам вопыт, тонкасці тэхналогій і дбайныя адносіны да свайго прадпрыемства перадаюцца ад бацькі да сына, ад маці да дачкі. Сёння мы маем вялікі тэхнічны, тэхналагічны і кадравы патэнцыял. Цэнім кожнага спецыяліста, а іх у нас сёння 730 чалавек. Дарэчы, усе кіраўнікі выраслі на прадпрыемстве, многія прайшлі шлях ад майстроў да галоўных менеджараў. Вопыт і веды персанал набываў менавіта тут, на фабрыцы. На працягу мінулага года мы пераглядалі ўмовы кантрактаў і пастаянна павышалі заробкі персаналу. Мы не пагоршылі ўмовы калектыўнага дагавора, які наноў прынялі нядаўна. Згодна з ім, выплачваем людзям усе важныя сацыяльныя дапамогі. Вельмі шануем сваіх ветэранаў і заўсёды шукаем нагоду, каб іх павіншаваць ці арганізаваць сустрэчу. Яны, між тым, вельмі ўважліва сочаць за лёсам прадпрыемства.

— Якія задачы ставіць прадпрыемства на найбліжэйшую перспектыву?

— За дзевяць месяцаў года з вытворчага канвеера прадпрыемства сышло больш за 2,5 млн кв. м ворсавага палатна. Між тым попыт на рынку ў гэтым сектары эканомікі патрабуе пастаяннага абнаўлення і хуткага змянення ўласцівасцяў прадуктаў. Таму наша задача — пачаць выраб прынцыпова новага трыкатажу. Для гэтага спатрэбіцца ўсталяваць новую лінію і асвоіць складаныя тэхналагічныя працэсы. Гэта амбіцыйны праект, разлічаны на выпуск да 5 млн метраў такога палатна ў год, але сёння інакш не выжыць. Патэнцыял у прадпрыемства добры. Мы будзем развівацца і супрацьстаяць тым выклікам, якія ёсць як на знешнім, так і на ўнутраным рынку.

Ад 64 да 70% прадукцыі ААТ «БЕЛФА» сёння экспартуецца ў Расію, Польшчу, Літву, Малдову, Арменію, Азербайджан, Казахстан і Грузію. Рост экспарту сёлета складае 105%. Галоўным пакупніком штучнага футра са Жлобіна (90%) з'яўляюцца расійскія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці.

Ствараючы штучнае футра рознага прызначэння, спецыялісты прадпрыемства імкнуцца максімальна задаволіць запатрабаванні кліентаў. Дапамагае ім у гэтым шматгадовы вопыт, глыбокія веды, а таксама тэхналогіі вытворчасці, якія ўдасканальваюцца бесперапынна.

Штучнае футра для прафесіяналаў мае назву «палатно ворсавае трыкатажнае машыннага вязання». Тут ствараюць прадукт, які мае ўласцівасці, максімальна набліжаныя да ўласцівасцяў натуральнага футра. Унікальныя спалучэнні сінтэтычных і натуральных валокнаў забяспечваюць высокія цеплаахоўныя якасці. Пры гэтым не парушаюць працэсы тэрмарэгуляцыі чалавечага арганізма і практычна выключаюць назапашванне статычнай электрычнасці.

Такія матэрыялы забяспечваюць добрую ўстойлівасць формы і эластычнасць, што дазваляе значна пашыраць асартымент.

«БЕЛФА» сёння прапануе калекцыю адзення з футра, якое імітуе натуральнае.

Зусім нядаўна на прадпрыемстве наладзілі вытворчасць палатна новага пакалення. Калекцыя папоўнілася ўзорамі з інавацыйнымі аптычнымі люмінесцэнтнымі валокнамі. Эфект «гульні святла» дае магчымасць малюнак візуальна ўспрымаць як аб'ёмны. Гэта адкрывае шырокія перспектывы для палёту фантазіі дызайнераў.

Між тым пакупнік ужо сёння можа набыць актуальныя падарункі да навагодніх свят. Першая партыя падушак з 3D-выявай сабакі — сімвала 2018 года — ужо ў продажы. Да таго ж на ААТ «БЕЛФА» раюць сустрэць Новы год у карнавальным гарнітуры. Тут прапануюць шырокі асартымент строяў для Дзедаў Марозаў і Снягурак. Безліч касцюмчыкаў, у якіх дзеці адчуюць сябе персанажамі казак ці мультфільмаў. Ёсць зайчаняты, лісічкі, мядзведзікі, пчолкі, бэтмены, чалавекі-павукі... У крамы краіны да канца лістапада такіх маскарадных касцюмаў паступіць каля 20 тысяч штук.

УНП 400076540.

КАБ ЧЫГУНКА БЫЛА БЯСПЕЧНАЙ

Лакаматыўнае дэпо «Жлобін» адлічвае сваю гісторыю ад лістапада 1873 года, калі быў адкрыты рух цягнікоў на ўчастку Бабруйск — Гомель. Такім чынам, налета гэтаму прадпрыемству Беларускай чыгункі споўніцца 145 гадоў.

Сёння дэпо цалкам задавальняе запатрабаванні дарогі ў капітальных рамонтах цеплавозаў серыі 2ТЭ10 і ЧМЭ-3, а таксама выконвае работы па падаўжэнні гэтым машынам тэрміну службы. Для патрэб іншых дэпо менавіта ў Жлобіне выконваюць капітальны рамонт электрычных машын (цягавых электрарухавікоў, галоўных генератараў, двухмашынных агрэгатаў і іншых) і дапаможнага абсталявання дызеляў цеплавозаў.

Акрамя таго, тут засвоена мадэрнізацыя цеплавозаў серыі 2ТЭ10У па замене дызеляў 10Д100 на больш эканамічныя тыпу 1А-9ДГ з усталёўкай сістэмы мікрапрацэсарнага кіравання і рэгуляванні электрычнай перадачы цеплавоза УСТА, абсталяванне сістэмамі бяспекі КЛУБ-У, новымі пультамі кіравання (УПУ), зменай інтэр'ера кабін машыніста.

Усё робіцца ў тым ліку для таго, каб машыністам, якія адказваюць за некалькі соцень людзей, працаваць было камфортна і бяспечна. **Начальнік лакаматыўнага дэпо «Жлобін» РУП «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі» Юрый РАГІН,** які сам прайшоў 22-гадовы шлях ад брыгадзіра і да кіраўніка, кажа, што машыністаў на прадпрыемстве каля 250 чалавек — гэта больш, чым трэцяя частка ад усяго калектыву:

— Заўсёды лічылася, што машыністы — гэта эліта сярод чыгуначнікаў. У іх звычайна адзіны запіс у працоўнай кніжцы. Гэта складаная праца, паважаная, яе добра аплачваюць. Але яна і вельмі адказная. Уявіце: машыніст часам трапляе ў экстрэмальныя сітуацыі. На іх ён павінен рэагаваць імгненна і аптымальна. Таму з кожным прэтэндэнтам я праводжу персанальную гутарку. У нас ёсць машыністы-інструктары, якія таксама сочаць за сітуацыяй. Да таго ж у штаце дэпо псіхолаг, які пастаянна тэсціруе на ўвагу, на стрэсаўстойлівасць... Медкамісія для машыністаў амаль такая ж строгая, як для касманаўтаў. І гэта абгрунтавана. Чалавеку даверяюць вагі састаў, у якім едуць людзі, або знаходзяцца часам небяспечныя грузы. У сучасных электрацягніках, дзе машыніст працуе адзін, ёсць спецыяльныя сістэмы кантролю за станам здароўя. Напрыклад, бранзалет, які рэгіструе асноўныя параметры работы арганізма і перадае іх на спецыяльны камп'ютар. Калі раптам зафіксаваны збоі, адразу ж прымаюцца меры. У лакаматывах таксама ёсць сістэма бяспекі. Калі машыніст раптам пачне засынаць, адразу ж загараецца лямпачка на пульце. Калі своечасова не нажаць кнопку, загараецца яшчэ адна. Калі і гэтага машыніст не зробіць, гучыць свісток. У тым выпадку, калі не прачнуўся, спрацуюць тармазы. Разумееце, калі гэта адбылося, чалавек машыністам працаваць ужо не будзе. Мы абавязкова маніторым адпачынак лакаматыўных брыгад. Да таго ж цяпер пастаянна змяняецца тэхніка, і таму спецыялістам бесперапынна прыходзіцца ўдасканальваць свой прафесійны ўзровень.

У лакаматыўным дэпо «Жлобін» новае абсталяванне, і тэхналагічныя працэсы ўкараняюцца пастаянна. Гэта трэба рабіць, каб павысіць якасць рамонту, арганізаваць бяспечны рух цягнікоў, эканоміць матэрыялы і запасныя часткі, дамагчыся прадукцыйнасці працы. Пашыраецца таксама наменклатура дэталяў і вузлоў цеплавозаў, якія аднаўляюцца і выраблюцца. Паспяхова вядзецца работа па рацыяналізацыі і вынаходніцтве.

Дзяжурны па лакаматыўнаму дэпо «Жлобін» Васіль СЕЛІВОНЧЫК.

Пошук шляхоў зніжэння выдаткаў, новыя спосабы ажыццяўлення якаснага рамонту, выкананне правілаў аховы працы і зніжэнне негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе — традыцыйна сярод прыярытэтаў. Таму прадпрыемства мае ўсе неабходныя сертыфікаты адпаведнасці.

— Сёлета мы набылі абсталяванне, якое дазваляе знізіць сабекошт рамонту, — гаворыць Юрый Міхайлавіч. — Мы асвоілі правядзенне звычайнага агляду колавых пар цеплавозаў. Актыўна займаемся энергазберажэннем: памянялі асвятленне ў вытворчых памяшканнях і дасягнулі значнай эканоміі сродкаў. Галоўнае, зразумела, гэта дабрабыт кожнага з членаў нашага калектыву. Па выніках 2017 года нашае прадпрыемства выканае заданне па сярэднямесячнай заработнай плаце ў 1000 рублёў, даведзенае кіраўніком дзяржавы. Задача наступнага года — асвоіць бягучы рамонт дызельнага рухавіка Д-49 для цеплавозаў 2ТЭ10-УК, МК, для гэтага трэба закупіць неабходнае абсталяванне. Транзітныя перавозкі — гэта асноўная крыніца нашых прыбыткаў. У другой палове гэтага года яны значна вырасліся. Спадзяёмся, што тэндэнцыя будзе замацавана.

Дэпо ажыццяўляе цягавае абслугоўванне грузавога руху на ўчастках: Жлобін — Калінкавічы — Асіповічы, Жлобін — Калінкавічы — Барбароў. Пасажырскага і прыгараднага — на ўчастках Жлобін — Мінск, Жлобін — Калінкавічы — Корасцень, Жлобін — Гомель, Жлобін — Бабруйск — Рабкор.

У дэпо сёння працуюць прадстаўнікі звыш 22 дынастый. Агульны працоўны стаж некаторых з іх налічвае 110 і больш гадоў. Супрацоўнікі лакаматыўнага дэпо годна прадстаўляюць прадпрыемства на розных спартыўных і культурных мерапрыемствах. Сярод іх – «Клуб вясёлых чыгуначнікаў» і «Што? Дзе? Калі?». Прафсаюзны камітэт прадпрыемства пастаянна клапоціцца пра тое, каб сем'і жлобінскіх чыгуначнікаў адпачывалі разам. Для гэтага арганізуюцца калектыўныя выхады на канцэрты, у аквапарк, удзел у шматлікіх спартыўных мерапрыемствах.

УНП 400071536.

ВЫТВОРЧАСЦЬ, ЯКАЯ АБАГНАЛА ЧАС

Лінія вытворчасці катанкі.

Самы буйны інвестыцыйны праект Беларускага металургічнага завода за мінулую пяцігодку — драбнасортна-драцяны стан 370/150. Яго ўрачысты пуск адбыўся два гады таму пры наведванні БМЗ Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам. Сёння пры расказе пра новы праект металургі робяць акцэнт не на планах, а на поспехах, якіх змаглі дасягнуць.

Генеральны дырэктар ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» Анатоль САВЯНОК.

Другое жыццё адліваных загатовак

На працягу гісторыі прадпрыемства вытворчасць пракатнай прадукцыі БМЗ была меншая за вытворчасць бесперапыннаадліванай загатоўкі. Таму лішкі загатоўкі — металапрадукцыі з найменшым коштам — рэалізоўваліся спажыўцам. У сувязі з гэтым кіраўніцтвам завода было прынята рашэнне пра будаўніцтва новага пракатнага цэха, які забяспечыў стапрацэнтнае выкарыстанне адліванай загатоўкі, якая вырабляецца на прадпрыемстве.

Пастаўшчыком абсталявання і тэхналогіі вытворчасці была выбрана італьянская кампанія DANIELI, якая з'яўляецца сусветным лідарам у праектаванні і стварэнні абсталявання для металургіі.

Вытворчая магутнасць стана ў залежнасці ад асартыменту складае да 700 000 тон пракату ў год. Арыгінальныя тэхнічныя рашэнні дазваляюць ажыццяўляць на стане вытворчасць самага шырокага асартыменту металапрадукцыі: катанкі дыяметрам 5,5—22,0 мм, сартавога пракату ў бунтах дыяметрам 20,0—50,0 мм, сартавога пракату ў прутках дыяметрам 20,0—80,0 мм.

2017 года калектывам цэха быў пастаўлены новы рэкорд: выраблена 61 586 тон прадукцыі, адзначае кіраўнік прадпрыемства:

— Сёння не засталося скептыкаў, якія сумняваліся ў своечасовасці прынятага калісьці рашэння пра стварэнне гэтай вытворчасці. Мы здолелі рэалізаваць гэты праект у перыяд, калі металургія перажывала вельмі складаныя часы: скарачаўся попыт, абвальваліся цэны... Вядомая рэч, вынікі работы ў такіх умовах з улікам крэдытнай нагрузкі, якая павялічылася з-за рэалізацыі інвестыцыйнай праграмы, балюча адбіліся на нашым прадпрыемстве. Але ў той жа час, да моманту ажыўлення на рынку мы ўжо былі гатовыя прапанаваць новую прадукцыю, якая цяпер карыстаецца попытам і мае высокую дабаўленую вартасць.

Са склада загатоўкі падаюцца ў награвальную печ. Дасягнуўшы тут патрэбнай тэмпературы, яны паступаюць на стан. З гэтага моманту пачынаецца актыўны працэс пераўвасаблення стальной загатоўкі ў высакаякасны пракат. Пад характэрнае пастукванне валкоў расплаўлены метал чырвонай стужкай імчыцца па стане, памяняецца пасля кожнай пройдзенай клеці ў дыяметры і, адпаведна, дадае ў даўжыні. На выхадзе, у залежнасці ад таго, якая з наяўных трох ліній працуе, з яго атрымаецца катанка, пракат у бунтах, будаўнічая арматура ці круглы пракат для аўтамабілебудавання.

Хуткасць пракаткі ў некаторых месцах можа дасягаць 120 метраў за секунду. Гэта значыць да моманту, пакуль чалавек пераадолее шлях ад награвальнай печы да халадзільніка — месца, дзе астывае выраблены пракат, стан паспее прайсці ўжо не адна загатоўка. Такім чынам яна ператвараецца ў прадукцыю, фактычна гатовую да адгрузкі.

Праўда, у залежнасці ад патрабаванняў кантракта, як гэта, напрыклад, бывае з металам для аўтамабілебудавання, перш, чым пайсці да спажыўца, яго чакае тэрмаапрацоўка, дэталёвае сканаванне ўльтрагукам і апрацоўка паверхні. Пільны кантроль за якасцю ажыццяўляецца на ўсіх этапах вытворчасці. Толькі пераадолеўшы ўсе пералічаныя этапы, пракат паступіць на склад гатовай прадукцыі, дзе ўжо і будзе чакаць адгрузкі. Дарэчы, толькі сёлета СПЦ-2 адгружаў сваю прадукцыю ў 33 краіны свету.

Новы цэх з'яўляецца самым буйным на прадпрыемстве.

Ідзе адгрузка сартавога пракату.

У пачатку 2017 года па рашэнні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях і Нацыянальнай акадэміі навук БМЗ быў нададзены статус навуковай арганізацыі. Менавіта даследчая дзейнасць, якой на працягу ўсёй гісторыі Беларускага металургічнага завода ўдзяляецца асаблівая ўвага, дапамагае прадпрыемству паспяхова выводзіць на міжнародныя рынкі прадукцыю новага цэха па вытворчасці сартавога пракату. Сёння спецыялісты заводскага даследчага цэнтра і тэхнічнага ўпраўлення актыўна займаюцца пытаннямі ўдасканальвання вытворчасці і распрацоўкі новых відаў прадукцыі, спажыўцамі якой у тым ліку з'яўляюцца і замежныя прадпрыемствы аўтамабілебудаўнічай галіны.

Ад сыравіны да спажыўца

Адпраўным пунктам вытворчага ланцужка сортапракатнага цэха №2 з'яўляецца склад загатовак. Сюды метал у выглядзе сталёвых брускоў рознага дыяметра прывозяць са сталеплавільных цэхаў. Складзеныя невялікімі стосікамі, для звычайнага чалавека яны фактычна нічым не адрозніваюцца. Але толькі не для металургаў. Кожная партыя мае свае асаблівыя характарыстыкі па складзе. Ад іх залежыць, як сталь паводзіць сябе пры пракатцы, якія ўласцівасці ўрэшце атрымае прадукт, выраблены канчатковымі спажыўцамі. Менавіта таму ў працу загатоўкі падаюцца выключна з улікам патрабаванняў, што прад'яўляе тэхналогія.

Сістэма кіравання якасцю

Паралельна з засваеннем вытворчых магутнасцяў спецыялісты БМЗ вядуць работу па засваенні новых навукаёмістых экспартаарыентаваных відаў прадукцыі.

Для развіцця паставак і забеспячэння высокай якасці прадукцыі пачынаючы з 2015 года сістэма кіравання якасцю на стане 370/150 была сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням ISO 9001, СТБ ИСО 9001, ISO/TS 16949. **Генеральны дырэктар ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» Анатоль САВЯНОК** расказвае, што ў сувязі з распрацоўкай і ўкараненнем новага міжнароднага стандарту для аўтамабільнай прамысловасці IATF 16949:2016 у канцы 2017 года на прадпрыемстве будзе праходзіць сертыфікацыйны аўдыт на адпаведнасць яго патрабаванням.

— З моманту пуску новага цэха для ацэнкі БМЗ у якасці надзейнага пастаўшчыка якаснага металапракату больш як 30 кампаній правялі аўдыт працэсу вытворчасці і сістэмы менеджменту якасці. Па выніках атрыманы высокія ацэнкі. Толькі ў другой палове 2017 года наша прадпрыемства для правядзення аўдыту працэсу вытворчасці наведалі спецыялісты такіх кампаній, як Hirschvogel Automotive Group — аднаго з самых буйных міжнародных вытворцаў аўтакампанентаў, альянсу «Рэно-Нісан» — лідара на сусветным рынку аўтавытворцаў па колькасці прададзеных машын, і іншыя. Работа, якая праводзілася, у выніку дазволіла выйсці на рэалізацыю прадукцыі стана 370/150 больш чым 120 розным спажыўцам. У тым ліку для такіх прэміяльных сегментаў, як аўтамабілебудаванне, вытворчасць падшыпнікаў і дакладнае машынабудаванне. Уся прадукцыя, якая вырабляецца на стане, рэалізавана на два—тры месяцы наперад. На складзе адсутнічаюць запасы гатовай прадукцыі.

Драбнасортна-драцяны стан 370/150 прызначаны для вытворчасці катанкі і сартавога пракату са спецыяльнай апрацоўкай. Ён дазваляе збалансаваць вытворчасць сталі з яе паглыбленай перапрацоўкай, а таксама павялічыць аб'ёмы выпуску метызнай прадукцыі ў сталедротавых цэхах ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» і ААТ «РМЗ». За кошт мадэрнізацыі і рэканструкцыі, праведзенай у 2013—2015 гадах, завод павялічыў патэнцыял сталеплавільнай вытворчасці да 3 млн тон у год. Пры існуючай структуры пракатных магутнасцяў БМЗ лішак бесперапыннаадліванай загатоўкі і блюмаў неўзабаве складзе каля 700 тыс. тон у год. Менавіта гэты аб'ём і будзе перапрацоўвацца на новым стане.

УНП 400230362.

Адабрэнне пастаўшчыкоў атрымана

Ужо атрымана адабрэнне і вядуцца серыйныя пастаўкі сартавога пракату ў прутках у адрас еўрапейскіх спажыўцоў Mahindra Forgings AG (Германія), Amtek Tekfor (Германія), Schondelmaier (Германія), Kuznia Matrycowa Lublin (Польшча), SEW Eurodrive (Германія), URANIE International (Францыя) і іншых, якія з'яўляюцца пастаўшчыкамі камплектуючых для вядучых аўтамабільных канцэрнаў (DAIMLER, VW, BMW, MAN і інш.) і розных машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Таксама пастаўкі прадукцыі ажыццяўляюцца ў адрас вядомага расійскага вытворцы грузавых аўтамабіляў — ПАТ «Камаз».

Работа па засваенні БМЗ вытворчасці пракату для аўтамабілебудаўнічай галіны напачатку 2017 года атрымала высокую ацэнку Міністэрства прамысловасці. Работа «Распрацоўка і засваенне на ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» тэхналогіі вытворчасці гарачакатанага круглага пракату для вытворцаў аўтакампанентаў у Заходняй Еўропе» стала лаўрэатам прэміі Міністэрства прамысловасці ў галіне навукі і тэхнікі за 2016 год.

Перспектыўным кірункам для паставак прадукцыі стана 370/150 з'яўляецца пракат з падшыпнікавых марак сталі. Зараз завершана адабрэнне і ажыццяўляюцца прамысловыя пастаўкі пракату новага стана для кампаніі TIMKEN, вядуцца работы па амалагацыі БМЗ у якасці пастаўшчыка пракату для кампаній SKF і Schaeffler Group (FAG), якія з'яўляюцца сусветнымі вытворцамі падшыпнікаў.

Адобраны пастаўкі пракату ў бунтах для вядучых еўрапейскіх вытворцаў такой прадукцыі — кампаній Marcegaglia S.p.A. (Італія), Stilma S.p.A. (Італія), Stalma SA (Польшча), WDI GmbH (Германія), Ausa Europe Special Steels, S.A. (Іспанія) і іншых. Асноўнае прызначэнне пракату — вытворчасць калібраваных ці абточаных пруткоў для далейшага вырабу розных дэталяў на станках з лічбавым праграмным кіраваннем (для аўтамабілебудавання, робатабудаўнікі, сельскай гаспадаркі і інш.).

Завершана праца па амалагацыі БМЗ у якасці пастаўшчыка катанкі для кампаній Mubea (Muhr und Bender KG) — самага буйнога сусветнага вытворцы спружын амартызатараў для аўтамабілебудавання.

Засвоена вытворчасць і вядуцца прамысловыя пастаўкі высокавуглярадзістай катанкі вытворцам спружын для мэблевай прамысловасці ў Польшчы і Літве. Гэтыя кампаніі з'яўляюцца пастаўшчыкамі вырабаў для такіх вядомых сусветных брэндаў, як IKEA, HOFF і іншых.

Таксама ў 2017 годзе БМЗ быў адобраны ў якасці пастаўшчыка катанкі для вядомага нямецкага вытворцы мацаванняў для чыгункі — кампаніі Vossloh.

Новая прадукцыя замяняе імпарт

У склад новага цэха, акрамя пракатнага стана, уваходзяць участак фінішнага аздаблення пракату з самым сучасным у свеце абсталяваннем для неразбуральнага кантролю якасці гатовай прадукцыі, участак для тэрмаапрацоўкі гатовага пракату (наяўнае абсталяванне дазваляе праводзіць змякчальны (+А), ізатэрмічны (+FP) і сферыдызіруючы (+АС) адпал сартавога пракату ў прутках і бунтах для забеспячэння фізіка-механічных уласцівасцяў і мікраструктуры), участак абточвання пруткоў.

Усё гэта дае магчымасць задаволіць запатрабаванні шырокага кола кліентаў, вырабляць прадукцыю самай высокай якасці з вялікай дабаўленай вартасцю, — адзначае генеральны дырэктар ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» Анатоль Савянок:

— Прадукцыя новага стана з'яўляецца імпартазамяшчальнай. Пуск стана дазволіў забяспечыць прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь такой новай прадукцыяй, як арматурны пракат дыяметрам 6—16 мм у бунтах (ужываецца будаўнічымі арганізацыямі), гарачакатаны круглы пракат у прутках дыяметрам 20—80 мм і бунтах 20—50 мм, а таксама катанкі для вытворчасці зварачнага дроту (выкарыстоўваюцца ў машынабудаванні).

Цяпер прадукцыя стана пастаўляецца вялікай колькасці спажыўцоў Рэспублікі Беларусь, напрыклад, ААТ «МАЗ», ААТ «Рэчыцкі метызны завод», ААТ «Мінскі трактарны завод», ААТ «Гомсельмаш» і іншым.

У прадпрыемства яшчэ шмат планаў і амбіцыйных задач. На БМЗ пастаянна нарошчваюць вытворчыя магутнасці, што і забяспечвае ўпэўнены рух наперад. Ну а шматпрофільнасць дазваляе ўтрымліваць пазіцыі на сусветным рынку і заваёўваць новыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

Фота з архіва прадпрыемства.

«ФРАНТішка» з бездакорным густам

Галоўнае, вядома, часта крыецца ў дробязях. Калі гаворка ідзе пра адзенне для дзяцей, тут важныя не толькі дарослы погляд і зацвярджэнне мастацкім саветам. Трэба яшчэ праверыць, як самі малыя адчуваюць сябе ў строях, прыдуманых дызайнерамі і канструктарамі Жлобінскай швейнай фабрыкі. Па тварах дзетак відаць, што ім зручна і прыемна ў касцюмчыках, сарафанчыках і куртачках брэнда «ФРАНТішка». Так-так, элегантны «ФРАНТішка» родам са Жлобіна. Але ж фірменныя крамы, дзе такое адзенне можна набыць, сёння ёсць не толькі ў гэтым горадзе, але і ў сталіцы Беларусі. Пакупнікі чакаюць, што Гомель, а можа, і іншыя абласныя цэнтры будуць неўзабаве ашчасліўлены вытанчанымі і ўтульнымі строямі ад жлобінскіх швейнікаў. Аднак да дробязяў.

Патаемная кішэня для флікера

Ці даводзілася вам пераконваць сваё дзіця, што трэба насіць святлоадбівальныя элементы, больш вядомыя як флікеры, на верхнім адзенні? А ці не сутыкаліся вы з сітуацыяй, калі юны нашчадак па нейкіх, вам не зразумелых, прычынах сароміцца надзяваць яскравую павязку на руку? Ці раптам губляе яе пры нявысветленых абставінах? Дык вось, з юнацкай курткай «ФРАНТішка» такі нумар не пройдзе. На яе рукаве ёсць патаемная кішэня. У ёй замацавана і хаваецца святлоадбівальная стужка, якая пры неабходнасці вымаецца і ператвараецца ў сродак бяспекі. Такім чынам і бацькі будуць спакойныя, і ў дзіцяці новая гульня з'явіцца. Дзеці ж вельмі любяць таямніцы і схованкі.

Начальнік швейнага цэха Таццяна МІРАНОВІЧ.

Мабільнік за экраніруючай тканінай

Без мабільніка сёння, вядома, — ні туды і ні сюды. Але ж тэлефон, на думку клапатлівых бацькоў, не толькі сродак сачэння за дзіцем, але і пэўная небяспека. Куды яго лепш пакласці? Дыскусіі ідуць дагэтуль, але ж, што датычыцца адзення «ФРАНТішка», тут вытворцы звялі ўсе рызыкі да нуля. Нагрудныя кішэні, куды часцей за ўсё трапляюць тэлефоны школьнікаў, зроблены са спецыяльнай экраніруючай тканіны — для абароны ад негатыўнага ўздзеяння электрамагнітных палёў. Дарэчы, такая тканіна зроблена з сінтэтычных ці натуральных нітак з дабаўкай металу. Яна валодае антысептычнымі і антыстатычнымі ўласцівасцямі, пры гэтым не мае ніякага паху. Да таго ж устойлівая да ўздзеяння як нізкіх, так і высокіх тэмператур. Такую кішэню вельмі проста вылічыць сярод іншых — на ёй вышыты спецыяльны знак.

Клімат-кантроль для верхняга адзення

Курткі «ФРАНТішка», як добры аўтамабіль, маюць функцыю клімат-кантролю. Матэрыялы, з якіх зроблены ўцяпляльнік, могуць паглынаць вільгаць з паветра. Пры гэтым яны застаюцца паветрапранікальнымі і валодаюць супраціўленнем да тэмпературных перападаў. Калі коратка: у іх ваша дзіця і не замерзне, і не сапрэе. Ну і для алергікаў гэтыя модныя куртачкі — якраз тое што трэба.

Экалагічныя і вясёлыя

Што датычыцца верху адзення для дзяцей, жлобінскія швейнікі закупаюць для яго спецыяльныя тканіны фірмы «ЮНСЕН». Яны не толькі абараняюць ад дажджу і снегу, а яшчэ і лёгка чысцяцца, не камечацца. Увогуле, доўга выглядаюць як толькі з крамы. Пра колеры, што цяпер на самым піку моды, добра вядома дызайнерам. Яны клапоцяцца, каб юныя асобы былі толькі ў трэндавых адценнях. Ультрамодныя ў гэтым сезоне, напрыклад — фуксія, ментол, каралавы, фіялетавы, біруза, маліна, вінаград, гарчыца, аліва. Апетыт ад адных назваў разыграецца — і ўжо хочацца купіць менавіта «ФРАНТішка».

Сіні для кансерватараў

Між тым не забыты жлобінскімі швейнікамі і тыя, хто прынцыпова не любіць усе адценні вясёлкі ў адзенні. Для юных кансерватараў у палітры «ФРАНТішка» знойдуцца традыцыйныя шэры, чорны, хакі, карычневы і самы-самы любімы ўсімі беларусамі — сіні колер. Праводзіліся даследаванні наконт таго, якія адценні любяць нашы суайчыннікі. Дык вось, нават тыя, хто радуецца, калі бачыць на подыуме рознакаляровасць, пры куплі ўсё роўна выбіраюць сіні. 80% працэнтаў! З нацыянальнымі густамі трэба лічыцца. І дызайнеры лічацца. Практычнасць пры гэтым не супярэчыць наяўнасці стылю. Бездакорнага стылю «ФРАНТішка».

Хутка расці дазваляецца

Ад чаго лямантуюць бацькі ў канцы вучэбнага года часцей за ўсё? Ад таго, што дзіця раптам выцягнулася і штаны сталі вышэй за шчыкалаткі. Тое ж самае са спадніцамі дзяўчатак. Дык вось, адзенне «ФРАНТішка» дакладна хопіць не на адзін сезон. Тут добра ведаюць вечны бацькоўскі боль і даюць запас на імклівы рост падлетка. Прычым не толькі ў вышыню, але і ў аб'ёме. Для гэтага робяцца спецыяльныя рэгулятары ў школьным адзенні. Для дадзенай мэты незаўважна служаць спецыяльныя манжэты-адвароты. Яны дазваляюць любімай мадэлі расці разам з дзіцем.

Каб разабрацца і выкарыстоўваць з розумам усе «фішкі», прыдуманыя для дзіцячага адзення дызайнерамі Жлобінскай швейнай фабрыкі, патрэбна спецыяльная інструкцыя. І яна, абяцаюць на прадпрыемстве, хутка з'явіцца побач з традыцыйнымі этыкеткамі.

Злева направа: галоўны тэхнолаг Наталля УГАЛЕВА, вядучы канструктар Вера ЛУКАШЭВІЧ, мадэльер-канструктар Ганна БУСЕЛ, мастак-канструктар Марына АРХІПАВА.

Святлана БАБРОЎСКАЯ, дырэктар Жлобінскай швейнай фабрыкі:

— Мы заўсёды робім абмежаваныя партыі нашых тавараў для дзяцей. Каб паспяхова канкурыраваць на рынку, выпускаем ад 300 да 500 адзінак, да таго ж кожную мадэль — звычайна ў чатырох колеравых рашэннях. Удзел у рэспубліканскім праекце «Школа будучыні» даў нам магчымасць прапанаваць адзенне дзелавога стылю для навучальных устаноў Беларусі. Тры гады, як мы паспяхова працуем са жлобінскай гімназіяй №1. У нашых рэчах — школьнікі трох мінскіх устаноў адукацыі. Сёлета выканалі мэтавы заказ для навучэнцаў Светлагорска і Светлагорскага раёна. Цяпер многія школы заказваюць свае фірменныя знакі на адзенне. У нас ёсць спецыяльнае абсталяванне, якое дазваляе якасна зрабіць такія шэўроны. Часам складана задаволіць разнастайныя запыты, але мы імкнёмся і ў нас атрымліваецца. Зразумела ж, экалагічнасць і якасць вырабаў для дзяцей — заўсёды на першым месцы. На прадпрыемстве ўкаранёная сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням СТБ ISO 9001-2009, а таксама праведзена добраахвотная сертыфікацыя ў Нацыянальнай і Расійскай сістэмах сертыфікацыі. «ФРАНТішка» — адзенне для любога патрабавальнага пакупніка. У тым ліку апранаем дзяцей з нестандартнымі аб'ёмамі — аж да 56 памера ўключна.

Людміла БОРУХАВА, начальнік эксперыментальнага цэха Жлобінскай швейнай фабрыкі:

— Бомберы, джэмперы, тунікі, байкі, світшоты... Мы шыем усё, што сёння актуальна. Тым больш што дзеці пільна сочаць за тэндэнцыямі ў свеце моды. Увогуле ж, мне здаецца, бацькі — пакупнікі нашага адзення — дзеляцца на два тыпы. Першыя бачаць дзіцячую вопратку як дарослую, толькі меншую памерам. Іншыя матулі, наадварот, хочуць абавязкова бачыць нешта лялечнае: стразікі-банцікі-рушыкі. Спрабуем задаволіць абедзве катэгорыі. Для дашкольнага ўзросту ў нас ёсць адзенне з футару. Калі хто не ведае, футар — гэта адна з самых далікатных і прыемных для цела баваўняных тканін. Натуральная, гладкая з вонкавага боку, мяккая і далікатная — з унутранага, дзякуючы чаму вельмі камфортная. Ну а вырабы, самі бачыце, атрымліваюцца прыгожымі і ўтульнымі. Дарэчы, калі мы прывозім свае вырабы на шматлікія замежныя выстаўкі, многія здзіўляюцца, што яны зроблены на такім высокім ўзроўні. У нашых планах стварацца калекцыі капсульнага адзення. Распрацаваць лінейку тавараў з некалькіх мадэляў, аб'яднаных агульнай тэмай. Каб, зайшоўшы ў нашу краму, можна было б стыльна апрануць дзіця з ног да галавы. Нам вельмі важна, каб брэнд «ФРАНТішка» выхоўваў сапраўдных франтаў.

УНП 400075743

Жлобінская швейная фабрыка была арганізавана ў 1961 годзе на базе арцелі «Аб'яднаная праца», створанай у 1945 годзе. У першыя пасляваенныя гады самай запатрабаванай прадукцыяй былі фуфайкі. Потым тут шылі піянерскую і школьную форму, рабочае адзенне...

Сёння ААТ «Жлобінская швейная фабрыка» стварае адзенне для дзяцей ад нараджэння і да старэйшага школьнага ўзросту. Спецыялізаванае абсталяванне дазваляе шыць складаныя вырабы, у тым ліку зімовы асартымент. Кожная рэч праходзіць шлях ад распрацоўкі мадэлі, вырабу ўзора-эталона да серыйнай вытворчасці.



РАМАНТУЕМ ВАГОНЫ НА ЎЗРОЎНІ СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАЎ

Жлобінскае вагоннае дэпо з'яўляецца буйным рамонтна-эксплуатацыйным прадпрыемствам Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі. Яно спецыялізуецца на тэхнічным абслугоўванні, бягучым, дэпоўскім і капітальным рамонтах грузавых вагонаў. Дэпо — гэта вытворчасць з новымі цэхамі, сучасным тэхналагічным абсталяваннем, якое дазваляе якасна рамантаваць рухомы састаў. Сучасныя тэхналогіі тут укараняюцца пастаянна. Начальнік дэпо Анатоль ЧАЙКОЎСКІ — кіраўнік з вялікім вопытам работы ў галіне, і ён добра ведае аб тым, якая важная бяспека на чыгунцы. Таму, гаворыць, заўсёды ў дэпо імкнуцца максімум увагі ўдзяліць абнаўленню вытворчасці. Вось і сёлета атрымалася набыць новае абсталяванне.

Анатоль ЧАЙКОЎСКІ — начальнік Жлобінскага вагоннага дэпо.

Галоўныя крытэрыі працы — якасць і бяспека. За адносна непрацяглы час на прадпрыемстве ўкаранілі сістэмы стандартаў менеджменту якасці СТБ 9001-2009, сістэмы стандартаў па ахове працы ІСО 18001-2009 і сістэмы стандартаў СТБ ІСО 14001-2005 па кіраванні навакольным асяроддзем, атрымаўшы пры гэтым адпаведныя сертыфікаты.

У дэпо арганізавана лабараторыя неразбуральнага кантролю: на кожным участку працуе дэфектаскапіст па магнітным і ўльтрагукавым кантролі. Ён пільна сочыць за выкананнем тэхналогіі рамонту і вырабам дэталяў. Схаваныя дэфекты звычайнай візуальнай праверкай не выявіць. Гэта пад сілу складанаму і дарагому дыягнастычнаму абсталяванню. Сертыфікаваная лабараторыя здольная правесці дыягностыку па сямі метадах неразбуральнага кантролю і абгрунтавана павялічыць тэрмін службы дэталяў, адзначае начальнік дэпо Анатоль Чайкоўскі:

— Дыягностыка ўключае ў сябе праверку якасці тых дэталяў вагонаў, якія паступаюць у рамонт. У нашай справе вельмі важна выяўляць дэфекты своечасова і вызначаць: рамантаваць дэталь ці здаваць у металалом. Важна, каб не было расколін ці какавін. Мы сёлета набылі чатыры адзінкі новага тэхналагічнага абсталявання, якое дазваляе рабіць дыягностыку на ўзроўні сусветных стандартаў. У лабараторыі неразбуральнага кантролю цяпер усталяваны дэфектаскоп Magnaflux Y1, устаноўка дэфектаскапіі свабодных кольцаў падшыпнікаў тыпу УМДП-01, зроблена мадэрнізацыя стэнда для вібрадыягностыкі падшыпнікаў колавых пар.

Акрамя таго, па праграме «Энергазахаванне» набыта чатыры адзінкі зварачнага абсталявання. Гэта азначае, што мы будзем ажыццяўляць рамонт вагонаў яшчэ больш якасна.

Прыярытэтным кірункам дзейнасці Жлобінскага вагоннага дэпо з'яўляецца максімальнае прыцягненне замежных уласнікаў для размяшчэння заказаў на рамонт грузавых вагонаў і іх вузлоў з мэтай атрымання валютных сродкаў — пры безумоўным выкананні плановых заданняў упраўлення Беларускай чыгункі па капітальным і дэпоўскім рамонце грузавых вагонаў.

Дэфектаскапісты лабараторыі неразбуральнага кантролю Зінаіда КАЗЛОВА і Таццяна ГАНЧАР.

Майстар аўтакантрольнага ўчастка Віктар ЛАБУЦЬ.

— Гадавы план па рамонце прыватных вагонаў мы выканалі ўжо 1 верасня, — адзначае Анатоль Мікалаевіч. — Мы змаглі зрабіць у два разы больш вагонаў, чым было запланавана.

За 10 месяцаў гэтага года адрамантавана 3007 грузавых вагонаў, у тым ліку 2206 вагонаў інвентарнага парку Беларускай чыгункі і 801 вагон — уласнікаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Прыбытак ад рамонту прыватных вагонаў склаў 1,4 млн руб. Ужо сфарміраваны партфель дагавораў на наступны год, і мы працягваем над гэтым працаваць.

Найбліжэйшыя перспектывы развіцця Жлобінскага вагоннага дэпо — удасканаленне тэхналогіі рамонту вагонаў і іх вузлоў. Гэта будзе ажыццяўляцца за кошт абсталявання сучаснымі высокапрадукцыйнымі, энергазберагальнымі прыборамі, аптымізацыі вытворчых працэсаў, рэалізацыі праграмы па «беражлівай вытворчасці», укаранення мадэрнізацыі розных вузлоў вагонаў з мэтай павышэння міжрамонтнага прабегу грузавых вагонаў.

Авангард калектыву — людзі, чыя праца невыпадкова адзначана высокімі галіновымі ўзнагародамі. Знак «Ганаровы чыгуначнік» маюць слесар-рамонтнік Уладзімір Сурабка і аглядчык-рамонтнік вагонаў Казімір Стэльмачонак. Апошні атрымаў яго зусім нядаўна. Гаворыць, працуе ў Жлобінскім дэпо з 1990 года, работа яму дагэтуль вельмі падабаецца за разнастайнасць.

Намеснік начальніка па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях Пётр Богдан адзначае, што супрацоўнікі прадпрыемства не замыкаюцца на адной працы. Вось зусім нядаўна наладзілі выстаўку творчых работ, якія выклікалі сапраўднае захапленне ўсяго калектыву. Высветлілася, што жанчыны прадпрыемства — яшчэ тыя майстрыхі на ўсе рукі.

— Яшчэ адзін важны кірунак нашай дзейнасці — абнаўленне вытворчых і бытавых памяшканняў, — гаворыць начальнік вагоннага дэпо Анатоль Чайкоўскі. — Мы правялі рамонт душавых і санітарна-бытавых памяшканняў на першым паверсе, плануем у найбліжэйшы час тое ж зрабіць у колава-ролікавым участку. Закончылі двухгадовую работу па ўцяпленні фасадаў будынка. Таму, можна сказаць, мы ўпэўнена крочым наперад.

Слесар рухомага саставу Мікалай ШАПАВАЛАЎ.

У Жлобінскім вагонным дэпо ажыццяўляецца дэпоўскі і капітальны рамонт:

- **грузавых вагонаў, іх вузлоў і дэталяў;**
- **запасных частак і іх адналанне шляхам наплаўкі з наступнай механічнай апрацоўкай;**
- **абточванне колавых пар, сярэдні і бягучы рамонт колавых пар;**
- **адліваных дэталяў;**
- **аўтасцэпных прылад з наплаўкай і механічнай апрацоўкай зношаных паверхняў;**
- **грузавых цялежак.**

«Ад сістэмнасці ў якасці — да стабільнасці і бяспекі» — вось дэвіз калектыву ў штодзённай рабоце. Сапраўды, супрацоўнікі вагоннага дэпо — згуртаваны атрад прафесіяналаў, здольных вырашаць самыя складаныя вытворчыя і арганізацыйныя задачы. Бяспека руху, зразумела, галоўная з іх.

УНП 400071975



Аглядчык-рамонтнік вагонаў, ганаровы чыгуначнік Казімір СТЭЛЬМАЧОНАК.

ПМК-71: НЕ ЦУРАЕМСЯ НІЯКАЙ РАБОТЫ

Жлобінская ПМК-71, нягледзячы на складаныя ўмовы на рынку, сёлета не толькі забяспечыла поўную занятасць людзей і тэхнікі, нарасціла аб'ёмы вытворчасці, але і здолела абысціся без аптымізацыі колькасці кадраў. Больш за тое, у гэтым годзе працу атрымалі яшчэ 52 чалавекі, гаворыць дырэктар ПМК-71 Уладзімір БАДЗІЛОЎСКІ, які сам працуе на прадпрыемстве больш за 40 гадоў:

— Няпростым быў 2017-ты, але ж мы загадзя пайшлі па шляху пошуку дагавораў за межамі Беларусі. Згаджаліся на любую працу, каб мець прыбытковасць вытворчасці і захаваць калектыў. Удзельнічалі ў тэндарных конкурсах і ў большасці выйшлі пераможцамі. Менавіта гэта дало працу нашым спецыялістам на працягу ўсяго каляндарнага года.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Жлобінская ПМК-71» з'яўляецца дачыннай арганізацыяй РУП "Калінкавічывадбуд». Перасоўная механізаваная калона адлічвае сваю гісторыю ад 1950 года. Менавіта тады было прынята рашэнне пра стварэнне ў Жлобіне меліяратыўнай станцыі. Вытворчасцю гідрамеліяратыўных, культуртэхнічных, водагаспадарчых і будаўнічых работ тут займаюцца і цяпер. Але ж наменклатура значна пашырылася. Асвоены самыя розныя віды дарожнага, прамысловага, сельскагаспадарчага і грамадзянскага будаўніцтва.

Пашырана асабістая вытворчасць, пастаянна абнаўляецца парк машын і механізмаў, укараняюцца самыя сучасныя тэхналогіі будаўніцтва і кіравання сістэмай менеджменту якасці будаўнічых работ. Сіламі калектыву на тэрыторыі раёна і вобласці ўзведзены шэраг важных і прэстыжных аб'ектаў.

У сваім родным Жлобіне і райцэнтрах вакол ПМК-71 зарэкамендавала сябе найлепшым чынам. Больш чым палову ўсіх работ па добраўпарадкаванні перад рэспубліканскім сельскагаспадарчым святам «Дажынкі» ў Жлобіне выканалі менавіта спецыялісты прадпрыемства. Бульвар Металургаў, парк у раёне вуліц Барташова і Факанава, плошча перад Палацам металургаў, добраўпарадкаванне вуліц і сквераў, лыжароллерная траса і шмат чаго яшчэ — гэта справа рабочых рук спецыялістаў калоны.

Начальнік цэха па вытворчасці тратуарнай пліткі і поліэтыленавых труб Уладзімір ДАНЧАНКА.

Летась, гаворыць на прадпрыемстве, самай прэстыжнай і капіталаёмістай замовай была рэканструкцыя і пашырэнне сетак водазабеспячэння першага пускавога комплексу горада Рагачова. Сіламі ПМК-71 у аптымальныя тэрміны была праведзена рэканструкцыя станцыі абезжалезвання вады, пабудаваны дзве артэзіянскія свідравіны, новы лабараторны комплекс станцыі па абароце прамыўной вады. Зроблена прыстасаванне вадавода першага і другога ўздыму вады, які праходзіць пад ракой Друць, і шмат чаго іншага.



Бетоншчык Дзмітрый ГУРЫН.

Сёлета завершылася рэканструкцыя малочна-таварнай фермы «Папаратнае» філіяла «Маразавічы-Агра» ў Буда-Кашалёўскім раёне. Інжынерныя сеткі да трох дамоў у 22-м мікрараёне Жлобіна, пракладка вадаправода з разводкай па вуліцах у зоне прыватнай забудовы новага мікрараёна «Заходні» таксама запатрабавалі шмат значных намаганняў кадраў і высокапрадукцыйнай тэхнікі.

Многія аб'екты, за якія бяруцца будаўнікі ПМК-71, тэхнічна складаныя. Яны патрабуюць добрай інжынернай падрыхтоўкі і досведу спецыялістаў, а таксама высокакваліфікаванага выканання работ. На прадпрыемстве ганарацца тым, што атрымалася забяспечыць высокі ўзровень якасці пры здачы ў эксплуатацыю аб'ектаў.

Людзі і тэхніка прадпрыемства працуюць у любы сезон на 13—15 аб'ектах. З сярэдзіны кастрычніка мінулага года пачаліся актыўныя работы вахтавым метадам на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Па дагавору з ТАА «Бранская мясная кампанія» вялася праца па будаўніцтве ферм з пашавым утрыманнем буйной рагатай жывёлы недалёка ад населеных пунктаў: Фролаўка — Куйбышаўскага раёна Калужской вобласці, Рухань — Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці, Ёзефаўка — Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці. У кастрычніку пачалі будаўніцтва палігона цвёрдых бытавых адходаў на тэрыторыі Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. Там прыходзілася падрыхтоўваць глебу, заросшую хмызнякамі.

Аператары пульта кіравання абсталяваннем у вытворчасці бетонных і жалезабетонных вырабаў Аляксандр ГОЛЕЎ і Яўгеній СЕРАНКОЎ.

У выніку інтэнсіўнай працы выручка ад рэалізацыі тавараў, работ, паслуг за 9 месяцаў гэтага года склала 8928 тыс. руб. Рэнтабельнасць рэалізацыі работ і паслуг — 4,8%. Тэмп росту аб'ему падрадных работ, выкананых уласнымі сіламі, да ўзроўню 2016 года склаў 120,6% Сярэднямесячная заработная плата склала 891 рубель.

Развіваць расійскі кірунак лічаць перспектыўнай справай. Да таго ж, заказчык, задаволены прынятымі да эксплуатацыі аб'ектамі, і надалей аддае перавагу беларускім будаўнікам. **Намеснік дырэктара ПМК-71 Юрый ПОБАТ** адзначае, што на працягу многіх гадоў арганізацыя ўваходзіць у лік найбольш прэстыжных прадпрыемстваў Жлобіна:

— Нашы работнікі не толькі маюць дастойны заробак за сваю працу, але і магчымасць працягваць вучобу, павышаць кваліфікацыю, атрымліваць дапамогу ў пытаннях аздараўлення і г. д. Пры ўдзеле прафсаюзнага камітэта паспяхова вырашаюцца пытанні аховы працы, стварэння камфортных бытавых умоў, а таксама правядзення культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, умацавання сувязяў з падшэфнымі школамі, прапаганды здаровага ладу жыцця.

УНП 491104880

Жлобінская ПМК-71 вырабляе:
*** Асфальтабетон розных марак;**
*** Тратуарную плітку і бардзюрны камень;**
*** Поліэтыленавыя гафраваныя дрэнажныя трубы;**
*** Жалезабетонныя вырабы: кольцы для шахтавых студняў і вечкі да іх, бетонныя блокі;**
*** Аналубку, паддоны для пліткі і бардзюраў.**

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Вольга ГЕЦЭВІЧ, Святлана СУШКО, Ірына АСТАШКЕВІЧ. iost@zviazda.by. Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ і з архіваў прадпрыемстваў.

ЁЛКА З ПРАПЕЛЕРАМ

У Гродне дэманструюцца навагоднія экспанаты з тэхнічным ухілам

Арыгінальныя навагоднія кампазіцыі змайстравалі школьнікі і навучэнцы каледжаў Гродзенскай вобласці. У ход пайшлі старыя грампласцінкі, мікрасхемы, дэталі ад веласіпедаў і аўто. Найлепшыя экспанаты трапяць на заключны этап конкурсу «ТэхнаЁлка» ў Мінску.

У ліку відавочных прэтэндэнтаў — ёлка з прапелерам, якая лятае. У зале яе не запускаюць, а вось на дварэ ўжо прайшлі выпрабаванні. Ёлка лятае пры дапамозе радыёкіруючай прылады. Яе змайстравалі ў Беластавіцкім цэнтры творчасці.

Прадстаўлена і некалькі «музычных» ёлак. У сярэдзіне адной з іх зіхаціць шар, адкуль пры руху даносяцца гукі званочкаў. Аўтамабільная магнітола забяспечвае музычнае суправаджэнне іншага экспаната, прадстаўленага навучэнцамі Гродзенскага электратэхнічнага каледжа.

Ёсць мадэлі, можа, не такія «наварочаныя», але вельмі арыгінальныя. Вока чапляецца за ёлку з плоскім контурам, на якой паўсюдна прасвідраваны дзіркі для маленькіх лямпачак. Здаецца, што зіхацяць навагоднія шары. Дарэчы, большасць прыгажунь аформлена каляровымі агеньчыкамі.

Некаторыя ёлкі зроблены з сэнсам. Напрыклад, навучэнцы Ваўкавыскага аграрнага каледжа знайшлі ключы ад ведаў, якія дапамаглі стварыць сімвалічную кампазіцыю. А яшчэ тут можна ўбачыць, які шлях праходзіць святло, каб запаліць агеньчык на ёлцы. У Гродзенскім дзяржаўным каледжы тэхнікі, тэхналогіі і дызайну гэты працэс паказалі пры дапамозе міні-АЭС. Ёсць тут і турбіна, і генератар, і рэактар. Варта толькі ўключыць тумблер, як станцыя дасць энергію для святочнай ілюмінацыі святлодыёднай ёлачкі.

Усе больш модным становіцца рэтра. Дызайнам з бліскучых дыскаў ужо мала каго здзівіш, а вось ёлка з вініламі — выклікае захапленне. Тым больш калі яна ў рост чалавека.

— Мы бачым, што многія рэчы атрымліваюць «другое жыццё», — зазначае **загадчык аддзела Гродзенскага абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці Людміла РЭЕР.** — Тут знайшлі ўвасабленне і нейкія будаўнічыя адходы, і старая тэхніка. Вось гэта акуратная ёлачка зроблена з металічнай сеткі, а стаіць яна на аўтамабільным рулі, з дапамогай якога круціцца.

Навучэнцы будаўнічага ліцэя зрабілі навагоднюю прыгажуню з мантажнай пены. Будаўнічую ідэю ўвасобілі і прадстаўнікі Гродзенскага політэхнічнага каледжа. Яны, акрамя пены-снега, дапоўнілі ёлку сняжынкамі з цвікоў і макетамі шматпавярховікаў. А з Зэльвы прывезлі аб'ёмную ёлку, сабраную са старых металічных свяцільнікаў.

— У конкурсе «ТэхнаЁлка» некалькі намінацый, у тым ліку і на арыгінальнае тэхнічнае рашэнне сімвала будучага года, — тлумачыць Людміла Рэер. — Металічныя і драўляныя сабакі не толькі здзіўляюць сваёй канструкцыяй, але могуць рухацца і нават размаўляць.

І сапраўды, адзін з такіх экспанатаў паўтарае гукі, якія чуе наўкол. Міла выглядае сабака, для вырабу якога выкарыстаны дзіцячы веласіпед, Толькі тут можна ўбачыць грознага тэхна-пса з аўтамабільных дэталяў, таксу са спружыны альбо бульдогаў з балтоў і гаек.

Творам стылю «мадэрн» можна назваць пано з шурупамі і цвікамі, якія стваряюць выяву сабакі і пафарбаваны пазалотай. Такая «карціна» падыдзе да стыльнага інтэр'ера. Дарэчы, многія экспанаты могуць стаць дапаўненнем, а можа нават і цэнтральным аб'ектам як жылога памяшкання, так і офіса. Ну хто адмовіўся б ад ёлкі ў выглядзе лёгкай драўлянай паліцы з навагоднім афармленнем? Ці ад ёлкі-шарманкі, якая зіхаціць агнямі, калі пакруціць за ручку? Магчыма, камусьці больш спадабаецца ёлка-дог, альбо ёлка-падсвечнік. Арыгінальныя экспанаты наводзяць на думку ўключыць фантазію і праявіць свае здольнасці ў вырабе навагодняй прыгажуні. Магчыма, не кожны здолее змайстраваць металічныя яловыя лапкі ці сняжынкі з цвікоў. Ёсць варыянты больш даступныя. Напрыклад, зрабіць кулькі з марожаным у форме ёлкі альбо выразаць ёлку з пенапласту і ўпрыгожыць яе агеньчыкамі. Дарэчы, тэхнічных рашэнняў безліч, аб чым сведчаць і экспанаты юных гродзенцаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

■ Гарадская гаспадарка

АХУТАЦЬ ДРЭВЫ І ЎЦЯПЛІЦЬ СЦЕНЫ Ў КРЭДЫТ

Што ў сталіцы зроблена да прыходу зімы

Змена сезонаў заўсёды сапраўднае выпрабаванне для камунальных службаў. А халодную пару года і ўвогуле можна назваць самым суровым, у прамым і пераносным сэнсе слова, перыядам. Што робіцца для таго, каб мінчане перажылі яго максімальна спакойна, расказалі прадстаўнікі камунальнай сферы сталіцы.

Зараз праходзіць нарыхтоўка пясчана-салянай і пяшчанай сумесі для апрацоўкі дарог. Новыя рэагенты сёлета ўжывацца не будуць. Што датычыцца прыборкі двароў ад снегу, то па-ранейшаму ў выпадку моцных завей камунальнікі разлічваюць на дапамогу жыхароў горада. І нездарма — мінчане становяцца ўсё больш актыўнымі і адказнымі ў гэтым плане.

— Падобная дапамога ўжо не носіць негатыўнага характару. Людзі разумеюць, што чым раней і якасней мы сумеснымі намаганнямі ачысцім дваровую тэрыторыю, тым лепш будзе для ўсіх. З'яўляецца больш адказных людзей, якіх мы называем старшымі па доме ці пад'ездзе, якія самі абсталёўваюць месцы, дзе можна захоўваць агульны прыборачны інструмент, — адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Галіна ГІЛЕВІЧ.**

Адным з самых набалелых пытанняў застаецца ўцяпленне фасадаў. У дамах, дзе работы бягучага характару не даюць выніку, уцяпленне будзе праводзіцца ў перыяд капітальнага рамонту. Але не на ўвесь фасад, як раней, а кропкава: у канкрэтных месцах, дзе праступае вільгаць. Мяркуецца, што ў будучыні работы па цеплавой мадэрнізацыі дома будуць аплачваць яго жыхары, цяпер прапрацоўваецца магчымасць уносіць патрэбную суму ў растэрміноўку або браць крэдыт на гэтыя патрэбы.

Працягваюць рыхтаваць да холаду і снегу і зялёныя насаджэнні. Пра найбольш схільныя да ўздзеяння шкодных фактараў — высаджаныя ўздоўж цэнтральных магістраляў і кальцавой аўтадарогі — клапоцяцца асабліва. Ствалы абгортваюць спанбондам, а карані хаваюць пад спецыяльную плёнку, якую ўвесну будуць выдаляць разам з верхнім пластом глебы. Вядзецца работа і на перспектыву — ужо пачалася падрыхтоўка да будучага цёплага перыяду. Напрыклад, па выбары асартыменту кветак. Са студзеня будуць праводзіцца тэндары на закупку насення.

— Тэндэнцыі ландшафтнага азелянення змяняюцца ў бок натуральнасці, каб былі зёлкавыя травы, мнагалетнікі. Можа быць, не ўсе мінчане гатовыя бачыць высокія травы, яны больш прывыклі да яркага цвіцення. Таму мы будзем паступова ствараць куткі з такімі раслінамі, каб паказаць: гэта таксама добра і прыгожа, не ўсё павінна быць яркім і квітнеючым, — расказала **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзялёнбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА.**

Калі вяртацца да цяперашняга часу, то для ачысткі вуліц у «Мінскзялёнбуда» ёсць 68 снегаачышчальных машын, 76 самазвалаў, трактары з пагрузчыкамі, акрамя таго, выстаўлена 1 460 скрынь для пяску і пясчана-саляной сумесі.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

У СТАЛІЦЫ ПАДАРАЖЭЎ ВЫВАЗ СМЕЦЦЯ

Цяпер на яго ў Мінску ўвялі дыферэнцыраваныя тарыфы

Жыхары дамоў з смеццеправодам будуць плаціць па больш высокім тарыфе ў параўнанні з тымі, хто жыве ў дамах без смеццеправодаў. Гэта прадугледжана рашэннем Мінгарвыканкама №3312.

Такім чынам, гранічныя максімальныя тарыфы на паслугі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, якія аказваюцца насельніцтву, у дамах са смеццеправодамі выраслі да 5,5235 рубля за 1 кубічны метр. У дамах без смеццеправодаў па-ранейшаму будуць плаціць 5,1143 рубля за кубаметр. Акрамя таго, выраслі тарыфы на вываз смецця для юрыдычных асоб, якія абслугоўваюць жыллёвы фонд са смеццеправодам, — да 5,5235 рубля за 1 кубічны метр.

Пры гэтым начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Марына Тоўсцік паведаміла, што «дыферэнцыраваны тарыф пасля яго «абкаткі» ў Мінску будзе ўведзены і ў іншых гарадах краіны». Сёння разлік за абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА) праводзіцца зыходзячы з кубічных метраў адходаў, паводле нарматыву, які ўсталёўваецца асобна ў кожным раёне і буйным горадзе.

Новы падыход да фарміравання тарыфу па абыходжанні з ЦКА, па словах спецыялістаў міністэрства, дазволіць выключыць магчымасць суб'ектыўнага ўстанаўлення нарматыву ўзнікнення адходаў, зробіць зразумелым налічэнне платы, а таксама стане стымулам для арганізацый ЖКГ да зніжэння выдаткаў.

Акрамя таго, міністэрства прапаноўвала пераход да дыферэнцыраванай аплаты абыходжання з адходамі ў залежнасці ад якасці аказання паслуг (у прыватнасці, наяўнасці смеццеправода, перыядычнасці вывазу, наяўнасці кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў або падваровага аб'езду). Мяркуецца, што тарыф для дамоў, дзе наладжаны раздзельны збор адходаў, будзе ніжэйшы, чым для тых, дзе ўсе адкіды трапляюць у агульны смеццеправод.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Спадчына

Капусныя вячоркі і Загаўліны

Як на Ашмяншчыне адраджаюць абрадавыя беларускія святы

Ткаць палатно, вышываць пасаг, прасці воўну... Спрадвеку беларускія дзяўчаты і жанчыны ведалі, што займацца гэтым весялей ды цікавей на вячорках. А яшчэ разам лягчэй квасіць капусту і ўваходзіць у пост. У лістападзе на Беларусі здаўна праходзілі тэматычныя вячоркі.

Загаўліны — рэгіянальнае фальклорнае свята, якое паходзіць з пасёлка Кальчуны. Гэта так званы заход у 40-дзённы Калядны (або Піліпаўскі) пост. Абрад вандруе па Ашмянскім раёне і праводзіцца ў розных мястэчках. Сёлета праходзіў у аграгарадку Кракоўка.

Па традыцыі ў «тлусты аўторак» у адной хаце збіраліся ўсе жыхары вёскі і спраўлялі «даравальную бяседу». Віняліся адзін аднаму, што «саграшылі справай ці языком». У гэты ж дзень усе весяліліся, забаўляліся ды старанна частаваліся, бо наступныя сем тыдняў трэба было пасціцца. На Загаўліны адбываўся таксама абрад «прывязванне калоды».

— Калі хлопец сватаўся да дзяўчыны, а яна яму адмаўляла, на Загаўліны моладзь жартавала з небаракі і прычэплівала яму да нагі калоду, — расказала пра цікавую традыцыю **Вольга КУЗЬМІЦКАЯ, дырэктар Ашмянскага раённага цэнтра культуры.** — Каб пазбавіцца ад яе і не цягаць на сабе, пакуль не знойдзецца нявеста, хлопцу прыходзілася выконваць пажаданні юнакоў і дзяўчат. Дзяды ўспаміналі, што менавіта так і адбывалася. І сучасная моладзь з задавальненнем адраджае гэтую традыцыю.

У народзе кажуць, што лістапад багаты на квашанку. Гаспадыні запрашалі адна адну да сябе, каб разам нашынкаваць капусту ды засаліць яе. Так атрымліваліся капусныя вячоркі.

— Мы стараемся знаходзіць у мінулым цікавыя і адметныя традыцыі, якія існавалі ў нашых продкаў, каб захаваць гэта, і ў гульнях і святах паказаць сучаснікам, — падзялілася Вольга Кузьміцкая. — На капусных вячорках, зразумела, жанчыны перш за ўсё квасілі капусту. А яшчэ з яе варылі боршч. А дзецям, каб не заміналі, прыдумвалі розныя забавы.

Гэты старадаўні славянскі абрад сёлета правялі на Станцыі Ашмяны. У тэатралізаваным прадстаўленні гаспадыня Ганна паклікала да сябе жанчын і дзетак, каб дапамаглі заквасіць капусту. Пад народныя песні ды прымаўкі, карагоды ды загадкі зрабілі капусны запас на ўсю зіму. Пагулялі ў «Перацягні лапаць», «Капусту ў каўпаку», «Трап у чыгунок». А яшчэ боршч для ўсіх навакольных зварылі ды гледачоў пачаставалі.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

«ТЫГРЫ» СТАРОГА СВЕТУ

Чым абумоўлены імклівы рост краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы?

З Бруселя адна за адной прыходзяць аптымістычныя эканамічныя навіны. Eurostat апублікаваў звесткі за трэці квартал: эканоміка Старога Свету выраслa ў ліпені — верасні на 2,5% у гадавым вылічэнні. Вядома, аднаўленне адбываецца нераўнамерна. Найбольш хуткія тэмпы — у цэнтральнай частцы кантынента і на ўсходзе. Там яны значна пераўзыходзяць як сярэднееўрапейскія паказчыкі, так і прагнозы спецыялістаў. Эканомікі Польшчы і Чэхіі выраслі на 5%, Латвіі — на 6,2%, Славакіі і Літвы — на 3,4%, а Румыніі — на рэкордныя 8,6%. Чым падсілкоўваюцца «тыгры» Старога Свету?

«ХУТКІ» ГОД

Цэнтральныя і паўднёва-ўсходнія еўрапейскія эканомікі на шляху да самага «хуткага» года за апошнія дзесяць гадоў, прагназуе Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (EBRD). 18 краін рэгіёна, сем з якіх уваходзяць у зону адзінай еўрапейскай валюты, пражылі пасля крызісу рэзкі спад, які ўзмацніўся дзякуючы праблемам еўразоны з дзярждоўгам краін-удзельніц і слабымі банкамі. У выніку большую частку мінулага дзесяцігоддзя планаванае і чаканае збліжэнне ва ўзроўнях даходаў краін Усходняй і Заходняй Еўропы прыпынілася. Зараз жа, піша Wall Street Journal, маюцца сігналы, што яно аднавілася.

У адрозненне ад асобных краін Заходняй Еўропы і ЗША, тлумачыць старшы эканаміст EBRD Сяргей Гур'еў, рэгіён не адчуў адтоку працоўных з сярэднімі даходамі ў месцы з больш высокімі заробкамі. «У нашым рэгіёне ўсё адбываецца некалькі інакш, — расказаў эксперт WSJ. — Асабліва гэта адносіцца да тых яго частак, дзе маюцца дэмаграфічныя праблемы і адбываюцца масавыя ад'езды маладых і кваліфікаваных рабочых у іншыя краіны». Насельніцтва многіх краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы хутка старэе. EBRD папярэджвае: дэфіцыт кваліфікаванай рабочай сілы ўжо ў найбліжэйшай будучыні можа пачаць запавольваць рост эканомікі. У Еўрапейскім банку рэканструкцыі і развіцця таксама чакаюць росту інфляцыі ў рэгіёне, якая застаецца ніжэйшай за ўзроўні, зададзеныя мясцовымі цэнтрабанкамі. Так, галоўны румынскі банк — National Bank of Romania — другі месяц запар падняў працэнтныя стаўкі. Аднак цэнтрабанкі іншых краін рэгіёна асцярожнічаюць і чакаюць рэакцыі на рашэнне Еўрапейскага цэнтрабанка значна скараціць са студзеня 2018 года праграму куплі дзяржаблігацый.

Паскарэнне эканамічнага росту рэгіёна, асабліва моцна пацярпелага ад крызісу і яго наступстваў, — яшчэ адна прыкмета таго, што гэты год, хутчэй за ўсё, перавысіць прагнозы і чаканні і для глабальнай эканомікі ў цэлым. Аднак EBRD папярэджвае, што развіццё сусветнай эканомікі нясе пагрозы для рэгіёна: «Мы прагназуем шматлікія рызыкі, уключаючы ўзмацненне геапалітычнага напружання, пастаянныя пагрозы бяспекі, рост папулярнасці і аўтарытэту папулістаў і антыглабалістычных поглядаў у развітых краінах і высокую ступень канцэнтрацыі крыніц глабальнага росту. Прычым амаль палова іх прыйдзецца на Кітай». У EBRD, які, дарэчы, інвесціруе сродкі ў 37 краін, пачынаючы ад Марока на Захадзе і заканчваючы Манголіяй на Усходзе, таксама лічаць, што 2017 год будзе станоўчым не толькі ў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе. Банк, напрыклад, рэзка падняў прагноз па Турцыі.

ЗАРОБКІ І ПОПЫТ

Аналітыкі тлумачаць надзвычай імклівы (па еўрапейскіх мерках) рост усходнееўрапейскіх эканомік павелічэннем заробкаў і павышэннем попыту на тавары і прадукцыю ад краін еўразоны. У першую чаргу вырас экспарт аўтамабіляў, электронікі. Нягледзячы на шэраг складанасцяў, якія ўзніклі пры ўступленні ў ЕС, тут добра развіта сельская гаспадарка. Добрую паслугу гэтым краінам робяць напрацоўкі іх сацыялістычнага мінулага.

Эканамісты адзначаюць і такі фактар, як наяўнасць нацыянальных валют: у той час як Латвія і Літва, Эстонія — у зоне еўра, Румынія, Венгрыя, Балгарыя, Чэхія, Польшча, а таксама Харватыя на еўра не перайшлі. Свае валюты дазваляюць праводзіць куды больш самастойную і гнуткую манетарную палітыку. Высокі курс еўра здольны аказваць адмоўны ўплыў на экспарт. Традыцыйна цікавыя для турызму краіны ўсходу Еўропы прыцягваюць шматмільённых гасцей яшчэ і таннасцю, што не ў апошнюю чаргу забяспечваецца мясцовымі валютамі. Праўда, адзін са складнікаў росту ўсходнееўрапейскіх дзяржаў — павелічэнне ўнутранага попыту.

Паслабленне фіскальнай палітыкі і рэкордна нізкае беспрацоўе рэзка павысілі ўнутранае спажыванне.

Атрыманае ў выніку гэтага рэзкае павелічэнне заробкаў дазволіла эканомікам дзяржаў рэгіёна абысці па гэтым паказчыку больш багатыя краіны кантынента. Напрыклад, рост эканомікі Германіі, для якой сёлетні год лепшы з 2011-га, склаў у трэцім квартале 0,8% у параўнанні з папярэднім кварталам. Аднаўленне эканомікі асабліва важна для рэгіёна, таму што апошняе дзесяцігоддзе аказалася для яго не менш цяжкім, чым для поўдня кантынента. Многія рэгіянальныя эканомікі напярэдадні глабальнага фінансавага крызісу перагрэліся падчас эканамічнага буму. Нечакана аказаўшыся ў 2008 годзе без замежных інвестыцый, улады гэтых краін былі вымушаныя праводзіць палітыку жорсткай эканоміі, якая загнала іх эканомікі ў яшчэ больш глыбокую рэцэсію і прымусіла надоўга забыцца пра мары зблізіцца з заходнееўрапейскімі краінамі па ўзроўні жыцця.

Цяпер становішча выпраўляецца, але вяртаецца і небяспека новага перагрэву эканомік рэгіёна, якія ўжо цяпер дзейнічаюць амаль на мяжы сваіх магчымасцяў. Аптымісты пярэчаць, што фактары, якія сведчаць пра перагрэў эканомікі, пакуль не аказаліся каля крытычнай аднакі. Інфляцыя на ўсходзе кантынента застаецца паблізу мэтавых паказчыкаў і ў цэлым супадае з нізкай інфляцыяй на астатняй частцы Еўропы. Гэта ўвогуле не дзіўна, калі ўзгадаць, што большасць спажывецкіх тавараў усходнееўрапейскія краіны імпартуюць. Нават у Румыніі, па прагнозах мясцовага цэнтрабанка, у пачатку наступнага года чакаецца інфляцыя на ўзроўні 3,2%, пасля чаго яна пачне знiжацца. Зноў развіваецца крэдытаванне, але і яно яшчэ даволі далёка ад узроўняў, якія выклікаюць трывогу. Не відаць прыкмет і хуткага павелічэння знешніх запазычанняў, у аснове чаго ляжыць аднаўленне экспарту ў Заходнюю Еўропу.

ДВА ВЫКЛІКІ

Тым не менш рэгіён сутыкнуўся, на думку Wall Street Journal, з двума выклікамі, якія ўяўляюць пагрозу аднаўленню. Першы звязаны з дэмаграфіяй і адносіцца не толькі да ўсіх краін рэгіёна, але і да ўсяго Старога Свету. Ва ўсіх краінах Усходняй Еўропы высокія ўзроўні міграцыі працаздольнага насельніцтва. У апошнія чвэрць стагоддзя рэгіён пазбавіўся прыкладна 20 мільёнаў чалавек — 5,5 працэнта ўсіх жыхароў. Прычым пераважная частка работнікаў, хто з'ехаў на заробкі, — моладзь, якая мае добрую адукацыю. Напрыклад, колькасць працаздольнага насельніцтва Латвіі пасля 2000 года скарацілася прыблізна на чвэрць. У гады крызісу такая міграцыя дапамагала змагацца з беспрацоўем, але цяпер інвестары ў шэрагу краін рэгіёна скардзяцца на сур'ёзны дэфіцыт працоўнай сілы.

Адначасова ўзнікла небяспека не столькі рэзкага, колькі непрапарцыянальнага росту заробкаў. Пасля 2014-га яны выраслі, паводле дадзеных МВФ, на 4,5 працэнта пры павелічэнні прадукцыйнасці працы на два працэнты. Такі разрыў паміж гэтымі двума эканамічнымі паказчыкамі можа прывесці да зніжэння канкурэнтаздольнасці і празмернага росту спажывання паліва. Гэта ж, у сваю чаргу, можа прывесці да паўторнага перагрэву эканомік.

Другі выклік звязаны з палітыкай. Прагрэс рэгіёна ў павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва ў апошнія чвэрць стагоддзя адбыўся ў немалой ступені дзякуючы жорсткім палітычным рашэнням па павышэнні прадукцыйнасці працы, лібералізацыі рынкаў, прыватызацыі актываў, скарачэнні субсідый насельніцтву і барацьбе з карупцыяй. Аднак крызіс змяніў палітычную абстаноўку ў рэгіёне. У адных краінах улады пад моцным цiскам аслабілі фінансавую палітыку і павялічылі выдаткі на сацыяльныя патрэбы. Гэта стымулявала ўнутранае спажыванне, але ніяк не дапамагло росту прадукцыйнасці. У Румыніі, напрыклад, у другім квартале гэтага года дэфіцыт бюджэту склаў 4,1%. Гэта самы высокі паказчык у Еўрасаюзе, хоць у краіне самыя значныя тэмпы росту эканомікі на кантыненце. Такое становішча таксама павялічвае рызыку перагрэву эканомікі.

Яшчэ адна палітычная пагроза звязаная з тым, што папулісцкія ўрады не прымаюць жорсткія рашэнні, якія неабходныя для павелічэння колькасці працоўнай сілы і павышэння прадукцыйнасці. Бывае і яшчэ горш, калі яны адмаўляюцца ад ранейшых дасягненняў. Эканамісты лічаць лепшым адказам на дэфіцыт працоўнай сілы правядзенне энергічнай палітыкі на рынку працы, якая будзе заахвочваць працаваць жанчын і старых, інтэграваць мігрантаў, павышаць стандарты адукацыі і паляпшаць сістэму аховы здароўя.

РУМЫНІЯ НАПЕРАДЗЕ

Мацней за ўсё гэтыя з'явы ўдараць па Румыніі, рост эканомікі якой замарудзіцца налета да 4,4%. Яшчэ зусім нядаўна гэтая краіна займала месца аўтсайдара, а зараз у Бруселя яна ў фаварытах. Еўракамісія рэзка крытыкавала Бухарэст за карупцыю і беднасць, патрабавала правядзення рэформаў і захавання правоў чалавека. Крытыка, зразумела, падзейнічала. Прынамсі, вынікі дзеянняў румынскіх уладаў навідавоку. Нягледзячы на тое, што большасць еўрапейцаў лічаць румынаў галоўнымі ўдзельнікамі працоўнай міграцыі на кантыненце, менавіта радзіма Дракулы цяпер знаходзіцца на першым месцы ў аб'ядnанай Еўропе па тэмпах росту эканомікі. Калі ў 2015-м тэмпы росту румынскай эканомікі былі 3,9%, то летась — ужо 4,8%, а сёлета, паводле прагнозаў МВФ, — 5,5%. Для параўнання: сярэдняя па ЕС адпаведныя лічбы складаюць 2,4%.

У Румыніі цяпер актыўна развіваюцца ўсе сектары эканомікі: сектар паслуг, вытворчасць, экспарт. Спажыванне летась дасягнула найвышэйшага паказчыка за дзесяцігоддзе — з моманту ўступлення краіны ў Еўрасаюз у 2007-м, а ў першай палове гэтага года павялічылася яшчэ на 8%. «Урад у 2015-м знізіў падаткі на спажыванне, — патлумачыў лонданскаму выданню Guardian галоўны эканаміст Raiffeisen Bank Romania і старшыня фіскальнага савета Румыніі Іонут Думітру. — Улады паменшылі ПДВ з 24% спачатку да 20%, а зараз і да 19%. Гэта стала моцным стымулам для росту спажывання. Акрамя таго, урад за апошнія чатыры гады падвоіў мінімальны памер аплаты працы. Моцна выраслі зарплаты і ў грамадскім сектары».

Тым не менш заробкі ў Румыніі застаюцца ніжэйшыя за сярэднееўрапейскія, што робіць яе прыцягальным месцам для аўтсорсінгу заходніх кампаній. Па ўзроўні аплаты працы Румынія знаходзіцца ў ЕС на другім месцы ад канца пасля Балгарыі — 308 еўра ў месяц. Менавіта нізкія зарплаты спыняюць ад вяртання дадому дзясяткі тысяч румынаў, якія з'ехалі на пошукі працы ў іншыя еўрапейскія краіны. У выніку адтоку працоўнай сілы ў Румыніі летась быў зафіксаваны самы нізкі ў гісторыі ўзровень беспрацоўя — 5,9% (сярэдні ў ЕС — 8,6%). Па выніках гэтага года, адпаведны паказчык, паводле прагнозаў, знізіцца да 5,4%.

Найбольш высокія тэмпы паказвае высокатэхналагічны сектар. Нядрэнная дапамога для яго імклівага развіцця — моцная навуковая аснова, закладзеная яшчэ пры сацыялізме. Спецыялісты лічаць, што IT-сектар, у якім занята каля паўтары сотні тысяч чалавек, павінен падвоіць сваю долю ў ВУП краіны і давесці яе да 2025 года да 12%. Паказальна, што па хуткасці інтэрнэту Румынія саступае толькі Сінгапуру, Ганконгу, Паўднёвай Карэі і Ісландыі. Заходнія кампаніі энергічна інвестуюць у румынскую эканоміку. Ford, напрыклад, за апошнія дзевяць гадоў уклаў звыш 1,2 млрд еўра і абвясціў аб планах наняць яшчэ каля тысячы чалавек для свайго завода ў Краёвай. Такім чынам, агульная колькасць работнікаў на румынскіх прадпрыемствах амерыканскага аўтагіганта дасягне 3700 чалавек. Пашыраюць вытворчасць у Румыніі і іншыя буйныя заходнія кампаніі, такія, напрыклад, як Siemens, Bosch, Fitbit. Па памерах даходаў найбуйнейшай кампаніяй Румыніі застаецца аўтавытворца Dacia, які належыць цяпер Renault-Nissan — 4,47 мільярда еўра (па выніках мінулага года).

Развіццё румынскай эканомікі працягвае тармазіць рэпутацыя адной з самых карумпаваных краін у Еўропе. Прагрэс у барацьбе з карупцыяй, вядома, ёсць, але пазбавіцца іміджу, які склаўся за многія гады, нялёгка. Не спрыяе хуткаму развіццю эканомікі і слабая транспартная інфраструктура. Паводле апошняга даследавання World Economic Forum Global Competitiveness Report, Румынія займае 128-е са 138 месцаў у рэйтынгу аўтадарог. Даўжыня сеткі аўтамагістраляў — усяго 747 км. Чыгунка таксама моцна састарэла.

Аднак, нягледзячы на шматлікія праблемы, перспектывы ў Румыніі станоўчыя. Спецыялісты лічаць, што прагрэс у эканоміцы працягнецца і, як мінімум, у найбліжэйшай будучыні. Паводле прагнозаў, налета тэмпы росту тут застануцца аднымі з самых высокіх у Еўропе. Краіна цалкам заслужана набывае рэпутацыю эканамічнага «тыгра». Дарэчы, ва Усходняй Еўропе амаль гэтак жа паспяховымі за апошнюю чвэрць стагоддзя сталі, напрыклад, Славенія і Чэхія. Цяпер, відаць, дайшла чарга і да бацькаўшчыны легендарнага Дракулы.

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

ДОЎГІ ШЛЯХ ДА БАЦЬКОЎСТВА

Што чакае пару, якая плануе вырашыць праблему бясплоднасці з дапамогай ЭКА?

У бясплоднасці нямала прычын. Выстаўляецца такі дыягназ у першую чаргу сямейнай пары, бо ў некаторых выпадках з іншым партнёрам у жанчыны магло б і атрымацца, як і ў мужчыны — з іншай партнёркай. Калі вырашыць праблему простымі метадамі немагчыма, медыцына прапануе дасягнуць цяжарнасці з дапамогай экстракарпаральнага апладнення (ЭКА), якому ўжо споўнілася... сорак гадоў!

За гэты час ва ўсім свеце «з прабіркі» нарадзілася нямала дзяцей, якія маюць ужо сваіх дзяцей. Некаторыя з іх пры гэтым таксама звярталіся да ЭКА. Жыццё паказвае, што людзі, нараджаныя ў выніку так званага штучнага апладнення, нічым не адрозніваюцца ад агульнай папуляцыі. Так што ярлыкі можна не навешваць, адзначаюць медыкі. І дадаюць: «Мы не ідзём супраць прыроды».

Урач-эмбрыёлаг Аксана МОРДУС за работай.

Бясплоднасць — амаль заўсёды сацыяльная, псіхалагічная, часам фізіялагічная неўладкаванасць і нярэдкая прычына распаду сям'і. У свеце з гэтай праблемай сутыкаюцца 15—20 працэнтаў шлюбных пар. У бясплоднасці шмат прычын, часам яны яшчэ і спалучаюцца ў кожнага з партнёраў і гэта моцна ўскладняе пошук спосабу лячэння.

А цяжарнасці няма?

Такі дыягназ як «бясплоднасць» ставіцца пары (абавязкова ў зарэгістраваным шлюбе!), калі на працягу года рэгулярнага палавога жыцця — без выкарыстання пры гэтым метадаў кантрацэпцыі — у іх не наступіла цяжарнасць. Такой пары патрабуецца кансультацыя спецыялістаў па бясплоднасці, якія ёсць, напрыклад, у Мінскім гарадскім клінічным радзільным доме №2. Калі ёсць патрэба ў такой працэдуры, як ЭКА, мужчыну і жанчыну накіроўваюць у кабінет дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій. Тут выдаюць ліст абследавання — якія канцэнтрацыі сперматазоідаў, іх якасць і нармальна рухавасць. Крытэрыі нормы мужчынскай спермы сёння істотна знізіліся: тое, што некалькі дзясяткаў гадоў назад лічылася глыбокай няздольнасцю пакідаць нашчадкаў, сёння ўжо адносіцца да варыянта нормы.

Адзін або некалькі?

Першыя 20 цыклаў ЭКА ў 2-м раддоме Мінска выканалі ў 2014 годзе. У 2015 — ужо 102, 2016 — каля 200, сёлета будзе каля 400. Не ўсе цыклы завяршаюцца нараджэннем дзіцяці — у большасці краін, у тым ліку і ў нашай, гаворка ідзе пра 40 працэнтаў удалых спроб.

Замарозка — рэч у такой справе вельмі неабходная.

Усе іншыя эмбрыёны, калі яны таксама добрай якасці і тэарэтычна гатовыя да падсадкі, замарожваюцца, каб у выпадку няўдалай спробы іх можна было выкарыстаць. Замарозка — рэч вельмі карысная. Не заўсёды арганізм жанчыны аказваецца гатовым да падсадкі ў той жа дзень, калі атрыманы эмбрыён. Урач можа перанесці працэдуру, калі ўбачыць, што перанос эмбрыёна ў гэтым цыкле непажаданы. Увогуле замарожаныя эмбрыёны могуць чакаць і некалькі гадоў.

Дапускаецца, паводле заканадаўства, і выкарыстанне палавых клетак донара — мужчынскіх або жаночых. Донар пры гэтым можа быць ананімны і неананімны. У першым выпадку пра донара вядомы толькі яго фенатып — колер скуры, вачэй, а неананімны — як правіла, сваяк або сваячка, якія ахвяравалі свае палавыя клеткі для далейшых маніпуляцый і падсадкі.

Малады ўзрост у дапамогу

Чым маладзейшая пара, тым вышэйшая імавернасць цяжарнасці — і натуральнай, і ў выніку ЭКА. А вось для 44-гадовай жанчыны, нават калі яна і адчувае сябе маладой, цуд можа не адбыцца. Таму што прырода задумала так, каб рэпрадуктыўная функцыя была рэалізавана ад 20 да 30 гадоў.

Кожная жанчына нараджаецца са сваім запасам яйцаклетак. Усё, што ўздзейнічае на працягу далейшага жыцця на саму жанчыну (навакольнае асяроддзе, медыцынскія прэпараты, ежа, стрэсы, перанесеныя інфекцыі, аперацыі), уплывае і на яе генетычны матэрыял. Акрамя таго, у любым арганізме з узростам назапашваюцца генетычныя паломкі. Узрост пасля 35 з'яўляецца памежным, калі паталогіі пачашчаюцца, у тым ліку і пры натуральным апладненні. Усе цяжарныя, якім споўнілася 35, павінны праходзіць генетычнае абследаванне.

У англійскай мове ёсць выдатная прымаўка: маўляў, чым не карыстаемся, тое губляем. Таму чым раней пара звяртаецца да ўрача, тым вышэйшыя шанцы на поспех. Даследаванні старэйшай рэпрадуктыўнай групы паказалі, што большая частка цяжарнасцяў наступае ў тых, хто ўжо меў дзяцей. Гэта актуальна і для натуральных цяжарнасцяў, і для ЭКА.

Само ЭКА — платнае. І ў кожнай пары атрымліваецца свой кошт гэтай аперацыі. Пры неабходнасці на яе правядзенне можна атрымаць ільготны крэдыт. Сума пералічваецца на разліковы рахунак радзільнага дома.

Тым не менш тэрмін правядзення ЭКА — ад 18 да 49 гадоў. Урэшце, бывае і так, што і ў 20-гадовых ужо выдалены матачныя трубы, але доля пацыентак, маладзейшых за 25 гадоў, вельмі малая. Колькасць спроб ЭКА не абмежавана заканадаўствам, але праводзіць 4—5 спроб можа быць небяспечна для здароўя. Лічыцца, што прэпараты ўздзейнічаюць толькі на фалікулы, што гэта не ўплывае на час наступлення клімаксу, аднак жанчына пераносіць моцную гармональную стымуляцыю, аператыўнае ўмяшанне, што можа павышаць у далейшым рызыку розных ускладненняў.

Жыццё пад мікраскопам

Кабінет дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій уяўляе сабой некалькі пакоі: планшэцік, памяшчаем туды яйцаклетку і дадаём пэўную канцэнтрацыю сперматазоідаў. У адной кропельцы іх можа быць ад дзясяткаў соцень да некалькіх мільёнаў. Лічыцца, што на адну яйцаклетку павінна прыпадаць каля 100 тысяч сперматазоідаў. Калі ад жанчыны мы атрымалі пяць клетак і ўсе плануем апладніць, то і сперматазоідаў спатрэбіцца не менш як 500 тысяч. Пасля такога змешвання ўсё гэта адпраўляецца ў інкубатар на 18 гадзін — столькі часу патрабуецца для таго, каб апладненне адбылося натуральным чынам...

На трэці дзень павінен атрымацца 6—8-клетачны эмбрыён.

Для апладнення мужчынскі геном павінен аб'яднацца з жаночым. Менавіта праз 18 гадзін можна ўбачыць, ці адбылося гэта. Пад мікраскопам эмбрыёлаг павінен разгледзець не адну, а ўжо дзве цёмныя плямкі. Калі ўсё пойдзе добра, на трэці дзень атрымаецца 6—8-клетачны эмбрыён, які можна падсаджваць.

З моманту падсадкі пачынаецца новы этап. Эмбрыён павінен прыжыцца і пачаць развівацца. У 60 працэнтах выпадкаў гэтага, на жаль, не адбываецца.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

Змест усіх паперак аднолькавы: «Божачка, дапамажы зацяжарацьі нарадзіць...»

Сам па сабе так званы пратакол ЭКА ад пачатку да канца можа працягвацца ад 12 дзён да аднаго месяца. У гэты час пацыентка прымае гармональныя прэпараты — каб атрымаць некалькі яйцаклетак, а не адну, як пры натуральным цыкле. Прэпараты, іх дозы, працягласць прымянення падбіраюцца індывідуальна. На працягу цыкла даводзіцца рабіць некалькі візітаў да доктара, падчас якіх кантралюецца рост фалікулаў (у іх знаходзяцца яйцаклеткі) у яечніках. Іх пасля забіраюць пад унутрывенным наркозам. Мужчына, адпаведна, павінен здаць сперму. З дапамогай спецыяліста адбываецца апладненне «ў прабірцы». Эмбрыён змяшчаюць у спецыяльны інкубатар, дзе створаны ўмовы, неабходныя для яго росту і развіцця. Праз тры або пяць дзён пад кантролем ультрагукавога апарата эмбрыён падсаджваецца жанчыне. Фактычна на кожным этапе можа падсцерагаць няўдача. І справа тут зусім не ў спецыялістах, а ў індывідуальных асаблівасцях кожнай клеткі...

— Калі ў нашай пацыенткі мы ўбачым пяць ці нават дзесяць яйцаклетак, то спецыяльным інструментам будзем забіраць абсалютна ўсе. Апладняць таксама будзем усе, якія нам падыходзяць па «якасці». А падсаджваць, паводле нашага заканадаўства, можна максімум два эмбрыёны, — расказвае **ўрач гінеколаг-рэпрадуктолаг кабінета дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, кандыдат медыцынскіх навук Андрэй ЛЯБЕДЗЬКА.** — Аднак пры падсадцы двух існуе высокая імавернасць шматплоднай цяжарнасці, якая сама па сабе амаль заўсёды з'яўляецца ўскладненай. Гэта небяспечная сітуацыя ў сэнсе выходжвання, заўчасных родаў. Таму ў большасці выпадкаў падсаджваем адзін эмбрыён, і да гэтага імкнуцца сёння ўсе краіны. Тры эмбрыёны пераносяцца толькі пры пэўных паказаннях, калі ёсць вялікая колькасць няўдалых папярэдніх спроб.

Істнуе ЭКА класічнае і так званае ІКСІ. Якую методыку прымяніць — залежыць ад якасці спермы і колькасці атрыманых яйцаклетак. Для класікі неабходна атрымаць больш за пяць жаночых клетак і сперматазоіды як мага лепшай якасці. Пры такім раскладзе вельмі высокая імавернасць таго, што атрыманыя клеткі, размешчаныя ў спецыяльнае, блізкае да натуральнага, вадкае асяроддзе, знойдуць падыход адна да адной і апладненне адбудзецца без усякага прымушэння. Аднак калі якасць спермы зніжана, калі яйцаклетак мала, то на дапамогу прыходзіць методыка ІКСІ. Выбіраецца самы лепшы, правільны сперматазоід і з дапамогай мікраманіпулятара пад мікраскопам праводзіцца яго ін'екцыя ў яйцаклетку.

■ Ранняя дыягностыка

У ДЗЯЦЕЙ — ДРЭННЫ ЗРОК

Налета дабрачынны праект «Я бачу!» праверыць зрок у 14 тысяч дзяцей сельскіх раёнаў Брэсцкай вобласці

Мабільныя брыгады афтальмолагаў наведваюць дзяцей непасрэдна ў школах. Для гэтага падрыхтаваны спецыяльныя аўтамабілі, набыта абсталяванне, арганізавана работа ўрачоў. Такім чынам Беларускі дзіцячы фонд і кампанія velcom зноў аб'ядноўваюць намаганні, каб у 2018 годзе брыгады ўрачоў-афтальмолагаў агледзелі дзяцей там, дзе ёсць дэфіцыт вузкіх спецыялістаў.

На працягу 2016 і 2017 гадоў праект рэалізоўваўся ў 19 раёнах Магілёўскай і 14 раёнах Гомельскай абласцей. Усяго было абследавана 25 тысяч дзяцей. Паводле слоў **намесніка дырэктара БДФ Ірыны ЧАРНЯКОВАЙ**, на Гомельшчыне праблемы са зрокам былі выяўлены ў 35 працэнтаў агледжаных дзяцей, прычым фактычна палова даведалася аб гэтым упершыню. Школьнікі праходзілі абследаванне на некалькіх апаратах, атрымлівалі рэкамендацыі, рэцэпты на медыкаменты і акуляры, а ў сур'ёзных выпадках — накіраванне на паглыбленую дыягностыку і лячэнне ў абласныя і рэспубліканскія цэнтры.

Любыя негатыўныя змяненні зроку ў дзіцячым узросце могуць прагрэсіраваць вельмі хутка. Таму важна выявіць іх на самай ранняй стадыі.

— Смартфоны, планшэты ўплываюць на дзіцячы зрок, а таму і значэнне ранняй дыягностыкі ўзрастае, — кажа **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі velcom Вячаслаў СМІРНОЎ**. — Зараз мы актыўна вывучаем магчымасці прымянення ў школах мабільнага рэфрактометра — гэта кампактная трубка, якая лёгка мацуецца да экрана смартфона. Патрабуецца толькі спампаваць мабільную праграму. А пасля дастаткова глядзець у трубку — праграма нас прадыягнастуе. Прылада гэта не медыцынская, але дазваляе правесці самую першую дыягностыку.

Міяпія, гіперметрапія, астыгматызм — тое, што сапраўды становіцца вельмі распаўсюджаным па меры развіцця грамадства, і што важна выяўляць як мага раней, каб папярэдзіць вялікія праблемы ў будучыні.

Сродкі на рэалізацыю праекта «Я бачу!» будуць сабраныя падчас восьмай дабрачыннай калядной ініцыятывы velcom «Рабіць дабро так проста!». Кожнае падключэнне на любы з тарыфных планаў «Камфорт» і «Камфорт+» з 1 па 31 снежня ператворыцца ў 5 рублёў, якія кампанія накіруе на дабрачынны рахунак са свайго прыбытку.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

Приглашение
Унитарное предприятие
Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ» проводит аукцион №136 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года

Аукцион состоится 4 января 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по 3 января 2018 года до 15.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11. Интернет: www.dvs.by.

Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.

	Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения	Площадь м²	Начальная цена продажи
	г. Минск, пр-т Независимости, 51, пом. 1		
1	БЛОК ПОМЕЩЕНИЙ:		
	Изолированное нежилое помещение №1 на 4-м этаже (под офис)	3,4	12,92
	Изолированное нежилое помещение №2 на 4-м этаже (под офис)	3,4	12,92
	Изолированное нежилое помещение №3 на 4-м этаже (под офис)	14,3	54,34
	Изолированное нежилое помещение №4 на 4-м этаже (под офис)	46,7	177,46
	Изолированное нежилое помещение №5 на 4-м этаже (под офис)	23,4	88,92
	Изолированное нежилое помещение №6 на 4-м этаже (под офис)	12,0	45,60
	Изолированное нежилое помещение №7 на 4-м этаже (под офис)	39,9	151,62
		Общая площадь 143,1	Общая цена 543,78

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет BY44BAPB30122082500180000000, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, БИК BAPBBBY2X, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ»**. Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

В связи с утерей считать недействительными бланки квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии СВ №№2103021; 2103022; 2103023; 2103024; 2103025, 2103026; 2103027; 2103028; 2103029; 2103030; 2103031; 2103032;

бланки страховых свидетельств по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ серии ВВ №№2577534; 2577535; 2577536; 2577537; 2577538; 2577539; 2577540; 2919457; 2919458; 2919459; 2919460; 2919461; 2919462; 2919463; 2919464; 2919465;

бланки страховых полисов по договору страхования, заключаемому с физическим лицом, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК №№0284223, 0284224; 0284225; 0284226; 0284227; 0284228; 0284229; 0284230 филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Могилеве.

УНП 100706519

КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что 26 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, состоится повторный аукцион по продаже земельного участка У-212 в собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в микрорайоне «Заболоть» г. Гродно с кадастровым номером 440100000002007302 площадью 0,1024 га

Начальная цена продажи: **13 485,33 рублей,** сумма задатка – **2 700 рублей.**

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №403, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **по 20 декабря 2017 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 742095. Подробности в газетах «**Гродненская правда**» (№74 от 16.09.2017 г.) и «**Звязда**» (от 16.09.2017 г.).

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

ОАО «Світанак» г. Жодино приглашает организации принять участие в переговорах для выполнения строительно-монтажных работ на объекте: «Система пожарной сигнализации ОАО «Світанак» г. Жодино, ул. 8-е Марта, 1». Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта,1 до 11.00 11.12.2017 г. За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8 (01775) 7-14-92, 7-97-74.

УНН 600038919

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. №400/С-12682 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – командный пункт), площадью 1221,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, М-6, 288-й км, 6
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422084506101000142 (назначение – земельный участок для размещения здания командного пункта), площадью 1,4552 га по адресу: Гродненский р-н, М-6, 288-й км, 6
Начальная цена продажи	105 600 руб. (сто пять тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	10 560 руб. (десять тысяч пятьсот шестьдесят рублей)
Условия аукциона	Аукцион без условий
Продавец	Сельскохозяйственный производственный кооператив имени Деньщикова, 231716, а. г. Луцковляны, тел. 914-610
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 20 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в назначенный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.07.2017 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 15 декабря 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

---

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

ОАО «Молодечненский завод металлоизделий» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот №1

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв. м
1	Помещение гальванического участка (изолированное помещение)	630/D-29945	730,7
2	Помещение сборочного участка (изолированное помещение)	630/D-29942	382,4
3	Ангар	630/С-45402	1021,5
4	Подстанция	630/С-45414	38,8
5	Котельная новая (в состав входят: котельная и склад красок)	630/С-45429	535,1
6	Сварочный (токарно-штамповочный) цех (в состав входят: сварочный (токарно-штамповочный) цех, 2 холодные пристройки и сарай)	630/С-45434	947,8
7	Ангар (сварочный участок) (в состав входят: ангар (сварочный участок) и холодная пристройка)	630/С-45438	1061,1
8	Здание трансформаторной подстанции	630/С-74599	83,8
9	Здание склада химии	630/С-74598	67,9
10	Центральная проходная	630/С-45441	46,8
11	Уборная (инв. № по бух. учету 016); ограждение территории (инв. № по бух. учету 017), кабельные линии (алюминиевая оболочка) (инв. № по бух. учету 4015), кабель (инв. № по бух. учету 4019), водопровод (инв. № по бух. учету 4020), канализация общего назначения (инв. № по бух. учету 4021), внутриплощадочные канализационные сети (инв. № по бух. учету 4023), внутриплощадочные водопроводные сети (инв. № по бух. учету 4024)		
12	Оборудование согласно перечню (75 наименований, перечень находится у организатора аукциона)		

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке, площадью **2,4130 га** (предоставлен продавцу на праве общей долевой аренды), с кадастровым номером 642000000002000542 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0345 га).

Начальная цена с НДС (20%) – 977 682,00 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 97 768,00 бел. руб.

Лот №2

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв. м
1	Склад металла (в состав входят: склад для металла и навес)	630/С-45412	679,9
2	Стеллажная эстакада, инв. № по бухучету 018	18	

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке, площадью **2,4130 га** (предоставлен продавцу на праве общей долевой аренды), с кадастровым номером 642000000002000542 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0345 га).

Начальная цена с НДС (20%) – 90 149,00 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 9 014,00 бел. руб.

Задатки в размере 10% от начальной цены перечисляются на р/с № BY23 BLBB 3012 0600 0665 6700 1001 в ЦБУ №932 ОАО «Белинвестбанк» код BLBBBY2X г. Молодечно, ул. Партизанская, 1, УНП 600066567, ОКПО 28928761, открытое акционерное общество «Молодечненский завод металлоизделий».

Новый собственник недвижимого имущества должен будет разработать проект санитарно-защитной зоны и уменьшить в установленном порядке размеров базовой санитарно-защитной зоны.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 29.07.2017 г.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16 (с изменениями и дополнениями). Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие в указанный в извещении срок следующие документы:

– заявление на участие в аукционе;

– соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах);

– копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей);

– копии учредительных документов (со всеми изменениями и дополнениями) и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования (для юридических лиц);

– копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка.

Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией представляются легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

Представителем иностранного инвестора представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

Иностранное физическое лицо предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен иметь паспорт и документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

– руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании;

– решение уполномоченного органа управления юридического лица (решение собственника, протокол общего собрания участников общества и т. д.) об участии в аукционе и приобретении объекта (в случае отсутствия (либо ограничения) полномочий руководителя по распоряжению денежными средствами юридического лица);

– иные представители – доверенность, оформленную в соответствии с законодательством.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт.

Полномочия представителя индивидуального предпринимателя должны быть подтверждены нотариально удостоверенной доверенностью.

Прием заявлений на участие в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный организатором торгов день и час, указанные в извещении о проведении аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации участников аукционов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.minsk-region.gov.by** в разделе **Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости).** Аукцион состоится **12.12.2017** в **11.00** по адресу: **Минская обл., г. Молодечно, ул. Промышленная, д. 4**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2017 в рабочие дни до 16.00** по указанному адресу. **Тел. +375 29 685-36-77**

■ Невядомая прырода

ЗОМБІ Ў РЭАЛЬНЫМ СВЕЦЕ

Грыб-паразіт падпарадкоўвае сваёй волі мурашоў

Так, і гэта ўжо не трэш-кінематограф, а чыстая праўда: у прыродзе на самай справе існуе грыбок, які ператварае іншых жывых істот у паслухмяных зомбі, і ён падкідвае вучоным шэраг сюрпрызаў. Высветлілася, што грыб-паразіт літаральна ўрастае ў цела насякомага, а менавіта мураша, і пажырае яго клеткі, робячы з гаспадара своеасаблівы «мясны даспех», піша партал «Папулярная механіка».

У бразільскіх мурашоў-цесляроў і без таго нялёгкае жыццё дапаўняе вельмі дзіўная акалічнасць: яны могуць ператварыцца ў самых сапраўдных зомбі. Гэта адбываецца дзякуючы заражэнню паразітычным грыбком, споры якога прарастаюць у цела насякомага і ўплываюць на яго нервовую сістэму. Заражаны паразітам, мураш пакідае сваё роднае гняздо і адпраўляецца блукаць у гушчар лесу, умовы якога больш падыходзяць грыбу для паўнавартаснага паспявання. Звычайна мураш чапляецца лапкамі за ніжні бок ліста, пасля чаго замірае. Грыб працягвае развівацца ўнутры яго цела, пакуль у рэшце рэшт не пройме галаўны аддзел і не вызваліць новыя споры. Увесь гэты працэс займае прыкладна дзесяць пакутлівых дзён, на працягу якіх большую частку часу насякомае застаецца ў жывых. Кашмар наяве, ці не праўда?

Таямніцы паразітычнага грыба

Навуцы ўжо даўно вядомы гэты феномен, аднак да гэтага часу навукоўцы доўга не маглі зразумець, як менавіта паразітычны грыб O. unilateralis іграе сваю ролю лялькавода. Яго часта называлі «мазгавым паразітам», аднак новае даследаванне, апублікаванае зусім нядаўна ў Proceedings of the National Academy of Sciences, абвяргае такую тэорыю. Высветлілася, што якраз мозг насякомага застаецца непашкоджаным, а кантроль за сваім гаспадаром паразіт ажыццяўляе шляхам укаранення на ўсім целе ў мышачныя валокны! Па сутнасці, заражаны мураш становіцца для грыба свайго роду «мяснымі даспехамі» і сродкам перамяшчэння, а частка клетак тканін мураша ў працэсе замяняецца на грыбныя.

Каб зрабіць гэта дзіўнае адкрыццё, Дэвід Х'юз (а менавіта ён упершыню выявіў грыб-паразіт) пачаў шырокае даследаванне, у якім узяла ўдзел міжнародная

Камп'ютарная імітацыя таго, як ніткі грыбных клетак урастаюць у мышачную тканку гаспадара.

каманда энтамолагаў, генетыкаў, праграмістаў і нейрабіёлагаў. Мэта работы — у тым, каб вывучыць клетка-выя ўзаемадзеянні паміж паразітам і яго гаспадаром у ходзе крытычнай стадыі жыццёвага цыкла першага — той, падчас якой мураш учапляецца ў ліст сваімі магутнымі мандзібуламі.

Вядучы аўтар даследавання Марыдэль Фрэдэрыксен, кандыдат у дактаранты ва Універсітэце Базельскага заалагічнага інстытута, заявіў, што грыбок вылучае тканеспецыфічныя метабаліты ў арганізм гаспадара, выклікаючы тым самым змены ў экспрэсіі генаў. Гэта таксама прыводзіць да атрафіі мышцаў ніжняй сківіцы мураша, каб той ужо ніколі не змог расціснуць іх і дазволіць свайму целу ўпасці на зямлю, — гэта выклікала б заўчасную гібель гаспадара ці падвергла б паразіта рызыцы. Зрэшты, да пачатку працы навукоўцы не ведалі, як менавіта грыбок каардынуе свае дзеянні, каб так спрытна маніпуляваць арганізмам гаспадара.

Адкрыцці і даследаванні

Для правядзення даследавання навукоўцы заразілі мураша-цесляра O. unilateralis. Пры гэтым некаторыя асобіны атрымалі дозу іншага, менш небяспечнага, грыбковага патагена, вядомага як Beauveria bassiana, — яны служылі ў якасці кантрольнай групы. Параўноўваючы дынаміку захворвання, выкліканага гэтымі двума грыбамі, даследчыкі змаглі вылучыць спецыфічныя фізіялагічныя праявы дзейнасці O. unilateralis у мурашак.

З дапамогай электронных мікраскопаў група стварыла трохмерную мадэль, якая дазваляе вызначаць месцазнаходжанне, колькасць

Мураш, заражаны паразітычным грыбам.

і актыўнасць грыбковых тканін унутры цел насякомых. Для гэтага былі ўзятыя ўзоры гэтых тканін памерам усяго 50 нм, а назіранне вялося з дапамогай прыбораў, здольных маніторыць і апрацоўваць выяву з частатой 2000 разоў за 24 гадзіны. Каб прааналізаваць вялікі аб'ём даных, навукоўцы звярнуліся да штучнага інтэлекту: алгарытм, заснаваны на глыбокім навучанні, у ходзе аналізу вылучаў адрозненні ў дзейнасці грыбковых і мурашыных клетак. Гэта дазволіла даследчыкам наглядна ўбачыць, на якой стадыі захворвання тканіны арганізма ўсё яшчэ належалі насякомым, а дзе ўжо былі ператвораныя ў грыб.

Вынікі адначасова ўражваюць і бянтэжаць. Клеткі O. unilateralis распаўсюджваліся па ўсім целе мураша. Больш за тое, яны былі ўзаемазвязаныя, ствараючы свайго роду калектыўную біялагічную сетку, якая і кантралявала паводзіны мурашак. Х'юз адзначыў, што пад канец высокі працэнт клетак у арганізме гаспадара ператварыўся ў клеткі грыба — той літаральна зрабіў насякомае часткай самога сябе.

Але самае дзіўнае заключалася ў тым, што мазгавая тканка мураша засталася... некранутай. «Звычайна паводзіны жывёл кантралююцца мозгам, які перадае сігналы мышцам, але вынікі нашага даследавання паказваюць, што паразіт кантралюе паводзіны гаспадара з дапамогай перыферычных сістэм, — тлумачыць Х'юз. — Амаль як лялькавод, які цягне за ніткі, каб кіраваць рухамі марыянеткі, грыбок таксама кантралюе мышцы мураша, маніпулюючы канечнасцямі і мандзібуламі гаспадара».

Ці магчымы ўплыў на мозг?

Дагэтуль невядома, як менавіта грыб прымушае мураша рухацца ў канкрэтным напрамку. Навукоўцы мяркуюць, што факт цэласнасці мозгу — гэта на самай справе ключ да вырашэння галаваломкі: грыб выкарыстоўвае патэнцыял мурашынага мозгу дастаткова доўга, каб той быў жывы і змог самастойна знайсці прыдатную «пляцоўку» для размнажэння паразіта. Іншая тэорыя заключаецца ў тым, што грыб ускосна ўплывае на мозг, у прыватнасці на яго сэнсарныя функцыі, каб «кіраваць» мурашамі і прымушаць іх сыходзіць у лес.

Гаймода Чарыса дэ Бекер, энтамолаг з Універсітэта Цэнтральнай Фларыды, якая не прымала ўдзелу ў новым даследаванні, упэўнена, што праведзеная праца пацвярджае той факт, што грыб можа кантраляваць гаспадара з дапамогай спецыяльных секрэцыйных злучэнняў, якія выконваюць ролю нейрамедыятараў. Пра гэта сведчаць у першую чаргу звесткі, атрыманыя пры вывучэнні грыбковага геному.

Чаму для нас гэта так важна? Разуменне механізма замбіравання адкрывае цэлы шэраг перспектыў. У першую чаргу гэта сінтэз новых біялагічна актыўных злучэнняў, якія могуць быць выкарыстаны ў якасці магутных лекавых сродкаў. Акрамя таго, навукоўцы звярнулі ўвагу на тое, што ў грыба Ophiocordyceps kimflemingiae (роднаснага грыба-паразіта) выяўляюцца прыкметы актыўнасці ў рамках «біялагічных гадзін»: адны гены грыба актыўныя ў дзённы час, іншыя — у начны. Мяркуючы па ўсім, ноччу грыб актывуе секрэцыю бялкоў, якія могуць узаемадзейнічаць з мозгам гаспадара, такім чынам забяспечваючы ўласнае дамінаванне над яго нервовай актыўнасцю. Хто ведае, можа быць, у будучыні падобны кактэйль з імплантаў і нейрамедыятараў дасць нам магчымасць кіраваць мозгам чалавека і, такім чынам, адкрываць усе сакрэты?

■ Космас

ЯК ЯНЫ ВЫГЛЯДАЮЦЬ

Пазаземнае жыццё вачыма навукоўцаў

Навукоўцы з Оксфарда правялі даследаванне і прапанавалі сваю канцэпцыю іншапланетнага жыцця, якое можа развівацца па законах, якія адрозніваюцца ад зямных.

Калі мы ўяўляем сабе патэнцыйных братоў па розуму з космасу, то падсвядома імкнёмся надаць ім антрапаморфныя рысы: невыпадкова вобраз «зялёнага чалавечка», традыцыйны сімвал прышэльца, так падобны да самага звычайнага, хай і вельмі дзіўнага чалавека. Але, вядома, сапраўдныя насельнікі іншых планет, калі яны існуюць на самай справе, могуць істотна адрознівацца ад нас з вамі. Група біёлагаў з Універсітэта Оксфарда аб'яднала ў адну сістэму шэраг тэорый пра тое, як выглядалі б іншапланецяне, калі б іх раса была сфарміравана тымі ж прынцыпамі, што і зямное бялковае жыццё, у прыватнасці прынцыпам натуральнага адбору.

Суаўтар даследавання, біёлаг Сэм Левін, адзначае, што існуе пэўная прадказальнасць эвалюцыі, якая і на самай справе можа зрабіць людзей іншых светаў падобнымі да нас, але гэта далёка не ўсе магчымыя варыянты. Большасць гіпотэз, якія былі ўключаны ў праект (які атрымаў назву «Прышэльцы Дарвіна»), заснаваныя на так званым механістычным падыходзе: выкарыстоўваючы назіранні аб развіцці жыцця на нашай планеце, навукоўцы праецыруюць тыя ж заканамернасці на іншыя нябесныя целы.

Напрыклад, вочны апарат, паводле ацэнак экспертаў, эвалюцыянаваў не менш за 40 разоў, а значыць, можна меркаваць, што на суседніх планетах гэты працэс адбываўся падобным чынам. Механістычны падыход сёння шырока выкарыстоўваецца ва ўсіх навуках, у асаблівасці як крыніца тэарэтычных ведаў у фізіцы і хіміі Сусвету. Адгэтуль жа выцякае следства таго, што ў аснову жыцця хутчэй за ўсё лягуць малекулы з высокім утрыманнем вугляроду — гэты элемент шырока распаўсюджаны і практычна ўніверсальны.

Аднак у дадзеным выпадку біёлагі вырашылі адмовіцца ад параўнання з Зямлёй і выкарыстоўвалі альтэрнатыўную версію эвалюцыйнага развіцця. Гэтая пазіцыя выгадная тым, што, напрыклад, дазваляе ацэньваць не толькі бялковае, але і крамянёвае жыццё, якое выкарыстоўвае для дыхання чысты азот. Натуральны адбор — гэта адзіны вядомы навукоўцам механізм, які дазваляе ўявіць, як у ходзе эвалюцыі жыццё прымала тыя ці іншыя формы. Аўтары, зрэшты, не праводзяць наўпроставых паралеляў з зямнымі арганізмамі: для іх жыццё заключаецца ў першую чаргу ў здольнасці істоты ўзнаўляцца і адаптавацца. Таму існаванне натуральнага адбору было прынята за аксіёму: у адваротным выпадку скласці мадэль іншапланетнага жыцця на аснове зямной навукі папросту не ўяўляецца магчымым.

Левін і яго калегі лічаць, што, як і ў выпадку з зямнымі істотамі, іншапланетныя арганізмы будуць прадстаўляць сабой



У навукова-фантастычным фільме «Прыбыццё» былі прышэльцы-гептаподы. Оксфардскія біёлагі прыдумалі іх сваякоў — «актамітаў».

Прышэльцаў часта надзяляюць чалавечымі рысамі, але з пункту гледжання навукі гэта вельмі спрэчны ход.

іерархічную структуру больш дробных сістэм, якія цесна супрацоўнічаюць паміж сабой. Гэта падобна да таго, як мільярды клетак у нашых целах утвараюць органы і тканкі. У планетарным маштабе гэта можа азначаць нават адзіную калонію, якая ахоплівае ўсе прыдатныя для жыцця рэгіёны і існуе як біясацыяльнае таварыства. У гэтым выпадку казаць пра дэталі — напрыклад пра тое, ці будзе іншапланецянін двухногім карлікам з зялёнай скурай — не ўяўляецца магчымым: вонкавае аблічча істот будзе сур'ёзна залежаць ад умоў іх роднай планеты. Аднак, па меркаванні навукоўцаў, эвалюцыйная тэорыя думае пра універсальны інструмент для таго, каб рабіць здагадкі аб характары іншапланетнага жыцця ў тым выпадку, калі даследчыкам удасца выявіць нават яе драбнюткія сляды

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «СМТ №41» г. Сморгонь, Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24

Предмет аукциона

Месторасположение: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. п. Островец, ул. Карла Маркса, д. 37

Лот №1

Наименование	Назначение	Инвентарный номер	Общая площадь
Растворный узел	Здание специализированное для производства строительных материалов	442/С-8524	148,5 кв. м

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания объекта недвижимости «Растворный узел», площадью 0,4075 га с установленными ограничениями – водоохранная зона рек и водоемов пл. 0,4075 га

Начальная цена Лота №1 с НДС 20% – 4 803,60 бел. руб.

Лот №2

Склад	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	442/С-8527	211,0 кв. м

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания объекта недвижимости «Склад», площадью 0,1206 га с установленными ограничениями – водоохранная зона рек и водоемов пл. 0,1206 га

Начальная цена Лота №2 с НДС 20 % – 17 640,00 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи	**2** рабочих дня после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **7 (семи) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 28.10.2017**

Аукцион состоится 13.12.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 11.12.2017 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Агрокомбинат «Скидельский» 19 декабря 2017 года

Вид аукциона	Открытый
Предмет аукциона	Комплекс зданий бывшей фермы «Кукини»: капитальное строение с инвентарным номером 422/С-39194 (коровник) общей площадью 460,8 кв. м, 1983 года постройки, материал стен – силикатоблок, капитальное строение с инвентарным номером 422/С-39195 (красный уголок) общей площадью 51,8 кв. м, 1965 года постройки, материал стен – кирпич, капитальное строение с инвентарным номером 422/С-39196 (свинарник) общей площадью 3131,5 кв. м, 1965 года постройки, материал стен – кирпич, капитальное строение с инвентарным номером 422/С-39197 (свинарник) общей площадью 1199,3 кв. м, 1965 года постройки, материал стен – кирпич, капитальное строение с инвентарным номером 422/С-49775 (артезианская скважина), капитальное строение с инвентарным номером 422/С-49773 (водонапорная башня), кабельные сети
Начальная цена продажи	**40 705,71 рубля (с учетом НДС 20%)**
Кадастровый номер земельного участка и вид вещного права	**425882000015000003,** право постоянного пользования
Месторасположение земельного участка	**Гродненская область, Щучинский район, Желудокский с/с, 10А**
Размер земельного участка	**6,3797 га**
Продавец	Открытое акционерное общество «Агрокомбинат «Скидельский»», 231761, г. Скидель, ул. Промышленная, д. 1, тел.: (015) 2978204, 1475508
Организатор аукциона	КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546
Дата проведения аукциона	**19 декабря 2017 года**
Время проведения аукциона	**12.00**
Место проведения аукциона	**г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403
Дата и время начала приема документов	4 декабря 2017 года 8.00
Дата и время окончания приема документов	13 декабря 2017 года 17.00
Сумма задатка	**4 602,14 рубля**
Шаг аукциона	5%

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Извещение о повторном аукционе 5 января 2018 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями»
Номер лота	1	2	3	4	5
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1
Тип помещения	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением
Общая площадь (кв. м)	3982,2	4516,7	3351,5	12954,0	3482,1
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	1,444		3,574		
Начальная цена продажи	147 734,93	167 479,57	164 681,70	291 992, 17	66 546,46
Шаг аукциона	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены
Сумма задатка	14 773,49	16 747,96	16 468,17	29 199, 21	6 654,65
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка	Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г.	Одноэтажное, состоит из 3 пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию – 1973 г.	Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес – 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие – 1876 м², бетонное покрытие – 2751 м², линия электропередачи (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию – 1972 г.	Одно- и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием – 3051,3 м², сушильные камеры – 6 шт., навес – 72 м², циклоны – 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальто-бетонное и бетонное покрытие – 4979 м², электрический кабель – 96,7 м, ливневая и фекальная канализация – 203,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г.	Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линии электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г.

Наименование объекта	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями)	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58323 «Помещение арматурного цеха»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58322 «Помещение формовочного цеха с эстакадой для принятия бетона»	Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центом с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660)
Номер лота	6	7	8	9	10
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11П	г. Пинск, ул. Калиновского, 11У	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-3	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-1
Тип помещения	Отдельно стоящее	Отдельно стоящее	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением
Общая площадь (кв. м)	539,0	1930,1	3200,6	1944,40	
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	0,1827	0,3941			
Начальная цена продажи, рублей	44 945,93	341 298,70	298 752,17	195 440,45	3 266 283,58
Шаг аукциона	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены	5% от начальной цены
Сумма задатка, рублей	4 494,59	34 129,87	29 875,22	19 544,04	326 628,36
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Сведения об объекте	Одноэтажное здание. Канализационная сеть – 73 м, водопроводная сеть – 20,4 м, бетонное покрытие – 701 м². Ввод в эксплуатацию – 1992 г.	Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной – 306 м², помещение ремонтно-механического участка – 294 м², помещение цеха доборных изделий – 1456 м², пристройка – 12 м², навес – 24 м², градирня – 33 м², два теневых навеса – 7 м², покрытие бетонное – 1030 м². Ввод в эксплуатацию – 1970 г.	Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина: 131,84 п. м, ширина: 24,27 п. м; крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г.	Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина: 13,90 п. м, ширина: 17,87 п. м; крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г.	– Помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром: площадь – 18836,2 кв. м, в том числе здание арматурного цеха – 4230 кв. м, бетоносмесительный центр – 206 кв. м; крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. – Склад готовой продукции: площадь – 14347 кв. м, 4 пролета, (материал покрытия площадки: цементо-бетон, колонны железобетонные с металлическим каркасом). Ввод в эксплуатацию – 1973 г. – Здание очистных сооружений: площадь – 205 кв. м, крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением. – 2 (два) резервуара для воды: материал – бетон; наружная площадь: 108 кв. м; объем: 300 м³. Ввод в эксплуатацию 1994 г. – Комплект гаражей: площадь – 66,8 кв. м, одноэтажное, крыша (кровля): рулонная битумная; полы: бетон; вентиляция естественная. Ввод в эксплуатацию – 2010 г. – Железнодорожный путь: протяженность – 3981,7 м. Ввод в эксплуатацию – 1971 г.
Организатор аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»				
Продавец аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»				

Аукцион состоится **5 января 2018 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале.
Перечень необходимых документов:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504 , срок внесения суммы задатка – по 4 января 2018 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов;
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.
Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.
Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.
Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 4 января 2018 года включительно, тел. 80165 37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный тел. 375 29 640-80-37

КЛАКСАН

ATLAS СВЕТУ

Тэст-драйв доўгачаканай мадэлі Geely

«Ваш аўтамабіль стаіць у заторы, дарогі перакрытыя», — са шкадаваннем паведамляе супрацоўніца аўтасалона і прапануе прысесці ў крэсла побач з уваходам. Што зробіш, прыходзіцца чакаць. За тыя паўгадзіны, што мы з фатографам прасядзелі ў салоне, 6 чалавек прыйшлі спецыяльна для таго, каб паглядзець на айчынную навінку. У чацвер у 3 гадзіны дня людзі прыехалі ў Ждановічы, каб дакрануцца да машыны, якая пакуль нават не прадаецца. Сапраўды, у беларусаў існуе павышаны інтарэс да гэтай мадэлі — і мы высветлілі, наколькі ж ён апраўданы.

Вонкавы выгляд

Трэба сказаць, што аўтамабіль з'яўляецца новым для Беларусі, але не для Кітая, дзе ён актыўна рэалізуецца. Наогул, гэтую мадэль упершыню паказалі яшчэ ў 2015 годзе пад назвай Emgrand Boyue.

Аднак дызайн мадэлі цешыць вока нават праз некалькі гадоў пасля прэм'ернага паказу. Сілуэт паркетніка намякае на дынаміку — лініі бакавога шклення імклівa звужаюцца ад пярэдняй часткі і да канца багажнага адсека. Аўтамабіль сапраўды прыцягвае ўвагу — за час тэст-драйва па сталічным праспекце Пераможцаў кіроўцы не адзін раз азіраліся на машыну.

Назва Atlas цалкам падыходзіць — вядома, што над яе стварэннем працавалі ў Кітаі, пры гэтым не апошнюю ролю адыгралі распрацоўкі шведскай Volvo. Дадайце сюды вядомую ролю беларусаў — і ўбачыце, што аўтамабіль атрымаўся мультынацыянальным.

Машына як звонку, так і ўнутры адчуваецца вялікай. Сегмент, да якога яна адносіцца, называецца C-SUV. Даўжыня аўтамабіля — крыху больш за 4,5 метра, шырыня — крыху больш за 1,8 метра. Дарожны прасвет складае 190 міліметраў, аднак наўрад ці яе будуць купляць, каб выязджаць на бездараж. У горадзе гэтага цалкам хапае, для паездак на дачу па грунтоўцы — сыдзе.

Вядома, знешні выгляд грае вялікую ролю, аднак значна важнейшая ўнутраная пабудова.

Што ж унутры?

Першае, на што звяртаеш увагу, калі спрабуеш сесці ў машыну, — цяжкія дзверы. І гэта дзіўна: калі ў большасці новых аўтамабіляў дзверы зачыняюцца лёгка і нязмушана, то тут патрэбна добрае намаганне, каб зачыніць іх да канца. Пасадка сапраўды высокая — агляд адкрываецца добры. Трохі бянтэжаць масіўныя бакавыя люстэркі, нібы ўзятыя з буйнога пазадарожніка, аднак да іх хутка прывыкаеш.

Геаметрыя прыбораў, мультымедыйнай сістэмы і блока кіравання клімат-контролем — арганічная і лёгка засвойваецца. Кіроўца на інтуітыўным узроўні можа знайсці неабходныя кнопкі — добра, што іх тут сапраўды не так шмат. Калі раней можна было панаракаць на змесціва аўтамабіляў гэтай маркі, то цяпер гэта пытанне наўрад ці нехта падыме. Ёсць і прыемныя дробязі, накшталт ніш, схаваных па баках цэнтральнага тунэля, куды можна складаць розныя рэчы — напрыклад, тыя ж ключы.

Што датычыцца мультымедыйнай сістэмы, то яе можна назваць крыху састарэлай. Нягледзячы на немалады інтэрфэйс, працуе ўсё спраўна, хоць на дотыкі сістэма рэагуе з невялікай затрымкай. Спачатку было складана падключыць мабільны тэлефон, аднак, калі разабраліся ў меню, усё атрымалася.

Засмуціў руль — хацелася б зрабіць яго больш тоўстым, абшаляваць дадатковым лапікам скуры. Атрымаўся такі кантраст: калі сам салон стварае вельмі прыемнае ўражанне, то руль — найважнейшы элемент для камфортнага кіравання — трохі адштурхоўвае. Самі матэрыялы салона — бюджэтныя, але тая ж серабрыстая накладка пад алюміній на пярэдняй панэлі выглядае добра. І калі пярэднюю панэль рэдка кранаюць, то вось з рулём сітуацыя дыяметральна супрацьлеглая. Адназначна варта было зрабіць яго больш прыемным навобмацак.

Машына падыдзе высокім кіроўцам — з ростам 189 сантыметраў як на пярэдніх, так і на задніх сядзеннях над галавой застаецца вялікі запас. Што датычыцца саміх крэслаў, то ў дадзенай камплектацыі нам дастаўся аўтамабіль з тканінным салонам. Трэба аддаць належнае — сядзець камфортна, пярэднія сядзенні нават валодаюць бакавой падтрымкай, што можа крыху збянтэжыць буйных кіроўцаў.

Ззаду месца дастаткова не толькі па вышыні, але і ў нагах. На задняй канапе могуць размясціцца трое людзей сярэдняй камплекцыі, але лепей ездзіць там удваіх. Спадабалася і тое, што для пасажыраў ззаду прадугледжана практычна роўная падлога з невялікім узвышэннем у сярэдзіне.

Багажнік невялікі — 320 літраў. Пад падлогай схаваная «дакатка» і інструмент. Пагрузная вышыня, на жаль, завялікая — складаць цяжкія рэчы будзе даволі нялёгка. Калі хочаце павялічыць аб'ём, то заўсёды можна скласці заднія сядзенні, якія адкідваюцца ў прапорцыі 2:1. Роўная падлога не ўтворыцца, нават калі зняць падгалоўнікі.

Як жа яна едзе?

Мы атрымалі аўтамабіль з аб'ёмам 2,4 літра, шасціступеньчатай каробкай пераключэння перадач, а таксама пярэднім прывадам. Па пашпарце аўтамабіль выдае 148 конскіх сіл, круцячы момант — 225 Нм. Ёсць яшчэ двухлітровы варыянт, які выдае 141 сілу і 191 круцячага. Нічога незвычайнага — гэта атмасферная бензінавыя чатырохцыліндравыя маторы. Дарэчы, у салоне расказалі, што можа з'явіцца і варыянт з аб'ёмам 1,8.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На жаль, нават пры максімальна дапушчальным аб'ёме дынаміка не радуе. Аўтамабіль, які пабываў у нас на тэст-драйве, праехаў каля 800 кіламетраў, таму «таптаць» мы не сталі. Але нават пры спакойным гарадскім руху разганяецца ён, скажам так, нетаропка. Аўтамат працуе добра, але ад машыны з такім вонкавым выглядам і салонам чакаеш куды больш спартыўнага характару. Таму ідэальна ён падыдзе людзям, якія аддаюць перавагу мернай яздзе. Дарэчы, нягледзячы на не самы ўдалы навобмацак руль, ён упэўнена і хутка адгукаецца на дзеянні кіроўцы.

Здзівіў расход паліва. Зразумела, што падчас абкаткі гэтая велічыня заўсёды трымаецца на высокім узроўні, але 14 літраў на 100 кіламетраў — гэта нямала.

У машыне даволі ціха — гукаізаляцыя на вышыні. Акрамя таго, спакойнаму характару адпавядае і плаўнасць ходу. Падвеска ў Atlas — гэта Макферсан спераду і паўзалежная, шматрычажная ззаду. Увесь гэты камплект лёгка з'ядае розныя ямы і няроўнасці, таму смела можна заваёўваць не самыя якасныя дарогі.

У нашай камплектацыі адсутнічалі пярэднія датчыкі паркоўкі, затое былі заднія. Пры паркоўцы вельмі хацелася б мець камеру задняга агляду, якая ёсць у больш поўных камплектацыях.

Наш вердыкт

Калі ішла падрыхтоўка гэтага тэст-драйва, то адразу некалькі чалавек пацікавіліся: ці пахне пластыкам у салоне? (Намякаючы на кітайскае паходжанне аўто.) Так, аўтамабіль на нашым тэст-драйве ўжо не назавеш абсалютна новым, аднак нават намёку на пластык не было чуваць. Сур'ёзная заяўка!

У цэлым аўтамабіль выйшаў крыху супярэчлівым. Глядзіце: імклівы выгляд, аднак мерны характар. Якасная пярэдняя панэль з буйным экранам, але на яе так і просіцца больш хуткая мультымедыйная сістэма. Для задніх пасажыраў сапраўды хапае месца, але ў багажнік сумак змесціцца няшмат. Немалыя габарыты, але адсутнасць камеры задняга агляду (вядома, яе можна атрымаць у іншай камплектацыі, але ж гэта ўсё грошы). Паказальны аспект: усе вокны можна апусціць у аўтаматычным рэжыме, а вось падняць можна, толькі бесперапынна ўтрымліваючы кнопку пальцам. Але тым не менш гэта цікавы аўтамабіль, на якім прыемна перамяшчацца з пункта А ў пункт Б.

Кошт пытання?

Дарэчы, гэты аспект выклікае самыя сур'ёзныя спрэчкі. Справа ў тым, што поспех мадэлі практычна цалкам залежыць ад таго, колькі грошай за яе папросяць. Чакаецца, што стартавы цэннік будзе ніжэй, чым на аўтамабілі гэтага ж класа. Аднак не варта забываць, што з добрым наборам опцый цана прыстойна павялічыцца.

І вядома, пакуль рэальнасць такая, што, пры ўсіх роўных, выбіраючы паміж «кітайцам» і нават «карэйцам», усё ж возьмуць апошняга. Пакуль яшчэ занадта нетрывалыя пазіцыі беларуска-кітайскага прадпрыемства на айчынным рынку. Ці магчыма гэта змяніць і атрымаць большую долю рынку? Так, таму што якасны тавар абавязкова знойдзе водгук у пакупніка.

Для паляпшэння сітуацыі вельмі патрэбна выгадная крэдытная праграма або варыянты лізінгу. Менавіта добрыя ўмовы продажу змогуць прыцягнуць дадатковых пакупнікоў. Акрамя таго, пакуль няясна, як гэты аўтамабіль пакажа сябе ў доўгачасовым выкарыстанні. Ці сапраўды не паўстане праблемы карозіі, бо кузаў праходзіць тры этапы антыкаразійнай апрацоўкі? За колькі можна будзе прадаць гэту машыну праз некалькі гадоў? Але першае ўражанне — хутчэй станоўчае. Будзем спадзявацца, што і ў далейшым гэты аўтамабіль пакажа сябе з лепшага боку.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

Рэдакцыя выказвае падзяку кампаніі «Geely Цэнтр Мінск» за прадстаўлены аўтамабіль.

АД ГУБЕРНАТАРСКАГА ДОМА ДА БАКАЛЕІ

Пад што прыстасоўвалі рэшткі рэлігійных збудаванняў

Мінск, які перажыў мноства войнаў і разбурэнняў, відавочна, здолеў захаваць толькі малую частку сваіх храмаў. Сярод іх былі як сціплыя драўляныя пабудовы, так і маштабныя збудаванні, упрыгожаныя работамі лепшых майстроў свайго часу. Як цэрквы, узведзеныя на грошы, сабраныя ўсім светам, так і аплачаныя шчодрай рукой мецэнатаў. І ўсё ж многія з іх не зніклі бясследна: памяшканні былі пераабсталяваны пад іншыя мэты, а цалкам цэлыя падмуркі і сутарэнні закансерваваны і схаваны пад тоўшчай зямлі.

ЗА АДНАЎЛЕННЕ ВЫПЛАЧАНА... СТАГОДДЗІ ТАМУ

Менавіта так, напрыклад, здарылася з дамініканскім кляштарным комплексам, у які ўваходзіў Касцёл Святога Тамаша Аквінскага. Яго будаўніцтва пачалося ў 1600 годзе, аднак прасоўвалася павольна. Праз чатыры гады з-пад Масквы з буйной «здабычай» вярталася дадому рыцарства Рэчы Паспалітай. Воіны-шляхцічы вырашылі дапамагчы ў будаўніцтве храма, таму самі прыдумалі збор — пэўную суму за кожнага каня, які ўваходзіў у гарадскія вароты, дзякуючы чаму палатак атрымаў назву «капытковы».



Праект аднаўлення дамініканскага касцёла Тамаша Аквінскага.

Па першапачатковым прызначэнні храм дзейнічаў да паўстання 1830 года, пасля чаго быў перароблены пад праваслаўную царкву. Праз дзесяцігоддзе будынкі кляштара прыстасавалі пад каталіцкую семінарыю. Аднак чарговае паўстанне 1863 года паставіла кропку ў яго гісторыі ў якасці культавага збудавання. У розны час яно выкарыстоўвалася як ваенны двор і пажарнае дэпо. Дзіўна, але з прыходам савецкай улады комплекс не пацярпеў, а, наадварот, быў узяты пад ахову дзяржавы. Гэта, зразумела, не выратавала яго ў гады вайны: будынак быў пашкоджаны, а паколькі меў статус архітэктурна-гістарычнай каштоўнасці, Германія выплаціла кантрыбуцыі на яго аднаўленне. Але ён не проста не быў адрэстаўраваны — у 1950 годзе касцёл узарвалі.

Прычынай стаў новы план Цэнтральнай плошчы, на якой павінны былі ўзвесці гіганцкі помнік Сталіну. Скульптура сапраўды з'явілася, але неўзабаве яе спасцігла тая ж доля, што і касцёл: у перыяд развянчання культу асобы яна знікла з пастамента ўсяго за адну ноч. Тады казалі «як скрозь зямлю правалілася». І такая версія сапраўды існуе. Скульптуру, на якой толькі гузікі па памеры нагадвалі каналізацыйны люк, было вельмі складана транспартаваць. Так што, магчыма, яе сапраўды дзесьці закапалі.

Калі гэтая тэорыя хоць бы аддалена мае дачыненне да праўды, то пад зямлёй фігура знаходзіцца не ў адзіноце. Вяртаючыся да касцёла: сам будынак разбурылі, а вось падмурак і працяглыя лабірынты пакінулі некранутымі. І пагаворваюць, што яны нават заселены. Падчас адной з войнаў дамініканцы знеслі ўсе свае скарбы ў склеп, замкнулі іх, пакінуўшы ўнутры на варце аднаго з манахаў. Яго абяцалі выпусціць, калі скончыцца варожы напад. Аднак усе носьбіты ордэна загінулі і выпусціць яго ўжо не было каму. Манах памёр ад голаду, але душа яго сцен роднага манастыра не пакінула. Відавочцы сцвярджалі, што бачылі постаць у цёмным плашчы, якая трымала ў руках свечку. Вось толькі капаў з яе не воск, а кроў... Праўда, «паказанні» сведкаў разыходзяцца ва ўсім акрамя гэтага факта: хтосьці пад накідкай бачыў высакароднага старога, хтосьці — прыгожага юнака, а хтосьці і ўвогуле — голы чэрап. У легенду можна і не верыць, але падчас раскопак пад храмам сапраўды знайшлі масавую магілу трохсотгадовай даўнасці.

Адзінае, што захавалася ад касцёла Тамаша Аквінскага акрамя сутарэнняў, — крыж, які быў усталяваны на цэнтральным фасадзе. Цяпер ён захоўваецца на Кальварыі. Дарэчы, разбурацца сабор не хацеў зусім. Званіцу расцягвалі трактарамі, прычым на зямлю яна ўпала ўсё адно цэлай — яе прыйшлося разбіваць малаткамі.

І ўсё ж надзеі на аднаўленне сабора ёсць. Па-першае, распрацаваны сучасны праект рэканструкцыі, па-другое, такі выхад прадказаў яго апошні настаяцель Рыбчынскі. Перад чарговым нападам ворагаў ён загадаў схаваць усе скарбы і сказаў, што манастыр будзе знішчаны, але потым адноўлены, таму што дамініканцы за гэта заплацілі. Дарэчы, менавіта гэты ордэн «прыдумаў» індульгенцыю і інквізіцыю, якой, на шчасце, на нашых землях не было.

ЕЗУІЦКАЯ ШКОЛА ПАД МАСКАЙ КАНСТРУКТЫВІЗМУ

Яшчэ адзін ордэн, які атрымаў на тэрыторыі Беларусі нават больш шырокае распаўсюджанне, — езуіцкі. Яго прадстаўнікоў часта параўноўвалі з маленькай арміяй: сярод братоў пануе строгая дысцыпліна, кіруе імі генерал, які падпарадкоўваецца непасрэдна толькі Папе Рымскаму. Акрамя місіянерскай дзейнасці езуіты заўсёды актыўна займаліся адукацыяй: іх школы лічыліся аднымі з лепшых у Еўропе. А яшчэ менавіта яны адкрылі першае калектарскае агенцтва.

У Мінску прадстаўнікі ордэна з'явіліся ў сярэдзіне XVII стагоддзя, а будаўніцтва школы завяршылася ў 1699 годзе. Дарэчы, гэты будынак і зараз можна ўбачыць у цэнтры Мінска, хоць па стылі ён больш нагадвае створаны ў эпоху канструктывізму, — цяпер тут размешчаны Рэспубліканскі музычны каледж. Дарэчы, езуіты прымалі ў школу ўсіх, не зважаючы на канфесію, прычым навучанне было бясплатнае. Уносіць грошы трэба было толькі за пражыванне.

У той час будынак быў адным з самых прадстаўнічых у горадзе, таму ў ім спыняліся многія шаноўныя наведвальнікі. Пацешна, што падчас руска-шведскай вайны тут па чарзе пабывалі і Пётр Першы, і Карл Дванаццаты. А пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, калі гэтыя землі адышлі да Расійскай імперыі, прыгожы будынак пераабсталявалі пад губернатарскі дом. Падчас свайго знаходжання ў Мінску ў 1821—1822 гадах менавіта тут размясціўся генерал-губернатар Мураўёў — пра гэта нам кажа памятная шыльда, на якой, дарэчы, выяўлены факел. Лічыцца, што гэта сімвалізуе прыналежнасць Мураўёва да масонскай ложы, якая ў Мінску насіла назву «Паўночны факел». Будынак, дзе праходзілі сходы, захаваўся: зараз у ім Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

Былы езуіцкі касцёл таксама працягвае сваё існаванне, толькі ўзвысіўся ў чыне — стаў кафедральным. Яго будавалі каля 35 гадоў і асвяцілі ў гонар Ісуса, Марыі і Святой Барбары — гэтая святая вельмі ўшанаваная каталікамі, да таго ж на польскім троне была правіцельніца з гэтым імем. У савецкі час касцёл чакалі гады цяжкіх выпрабаванняў, калі параўноўваць з чалавекам, — маральных, але не фізічных. Знеслі вежы, а вось фасад не кранулі — яго проста закрылі фальшывым. Унутры памяшканне падзялілі на чатыры часткі і абсталявалі спартыўны клуб. У далейшым, дзякуючы захаванаму фасаду, касцёл было досыць лёгка аднавіць.

Будынкі былых езуіцкіх школы і касцёла.

ФІЛАРМОНІЯ З ТАЕМНЫМІ ХАДАМІ

У сталіцы можна адшукаць сляды не толькі каталіцкіх ордэнаў, але і ўніяцкага. Далёка ад дамініканцаў і езуітаў адыходзіць не трэба: былы манастырскі комплекс базыльянцаў размяшчаўся на тэрыторыі цяперашняй плошчы Свабоды, і, на шчасце, яго частка ацалела да нашага часу. Будавалі кляштар у сярэдзіне XVII стагоддзя, калі было разгромлена, што наспявае вайна з Масковіяй. Таму яго ўзвялі ў форме замкнёнага чатырохвугольніка. Мужчынскія і жаночыя кар-

Уніяцкая царква Святога Духа, адноўленая як Дзіцячая філармонія.

пусы былі злучаныя падземным ходам. Не варта думаць лішняга — усё ў мэтах бяспекі. Акрамя гэтага, падземныя хады вялі да Нямігі і Свіслачы.

Ужо пасля забароны уніі ў 1839 годзе памяшканні былі прыстасаваныя пад свецкую і царкоўную гімназіі. На надбудаваных паверхах размясціліся прысутныя месцы. Тут жа знаходзіўся суд, дзе судзілі ў тым ліку і Якуба Коласа.

Уніяцкі храм, які першапачаткова быў упрыгожаны звонку яркімі фрэскамі на тэмы жыція святых, перарабілі пад праваслаўны. З гэтым месцам звязана адна з трагічных старонак лёсу Мінска.

У 1905-м адбылося абвяшчэнне Маніфеста аб свабодах. Дарэчы, да гэтага часу, калі, напрыклад, хтосьці хацеў з праваслаўя перайсці ў іншую рэлігію, на яго на тры гады заводзілі судовую справу, а таксама канфіскоўвалі маёмасць. Вядома, паслабленне жорсткіх законаў магло выклікаць толькі адну рэакцыю — радасць. Жыхары горада сабраліся на Прывакзальнай плошчы, каб адзначыць гэту падзею. Аднак збор быў успрыняты як мітынг, таму тагачасны губернатар Курлаў аддаў загад расстрэльваць натоўп: загінула 100 чалавек, 30 атрымалі калецтвы.

Горад быў абураны, а прыхільнікі рэвалюцыйных поглядаў і ўвогуле вырашылі распавіцца з губернатарам. Падахвоціліся Іван Пуліхаў і Аляксандра Ізмайловіч, якая, дарэчы, паходзіла з генеральскай сям'і. Для выканання «прысуду» быў абраны дзень пахавання ахвяр. Адпяванне адбывалася якраз у тым самым былым уніяцкім храме. Калі натоўп рушыў да выхаду, Пуліхаў стрэліў, але прамахнуўся, тады Ізмайловіч кінула бомбу, але таксама беспаспяхова. Прысутныя апамяталіся даволі хутка: дзяўчыну білі так, што ў яе лопнулі барабанныя перапонкі. Пазней яе выслалі ў Сібір. А вось Пуліхава чакала больш суровая кара: яго неўзабаве павесілі. У знак салідарнасці з пакараным зняволеныя Пішчалаўскага замка вывесілі на вокны чорныя анучы.

Сабор быў закрыты ў 1930 годзе, а яшчэ праз шэсць гадоў яго ўзарвалі. Нягледзячы на дбайную падрыхтоўку, праводзіць аперацыю прыйшлося ў некалькі этапаў, а завалы расчышчалі яшчэ два гады. Пасля на гэтым месцы былі і перасоўны заапарк, і бакалея, і нават піўны ларок. Але ў 2011 годзе касцёл быў адноўлены на сваім жа падмурку ў выглядзе, блізкім да першапачатковага. Праўда, з іншымі функцыямі: цяпер тут размяшчаецца Дзіцячая філармонія.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

Ва Уруччы адкрылі новы павільён з кавярняй і бясплатным Wi-Fi

На вул. Гінтаўта, 12 адкрыўся 51-ы па ліку сучасны гандлёвы павільён РУП «Белсаюздрук». У прасторнай гандлёвай зале плошчай 27 квадратных метраў да паслуг наведвальнікаў прапануецца шырокі выбар перыядычных выданняў, канцылярскіх тавараў, кніжнай прадукцыі. Таксама тут прадстаўлены дзіцячыя кнігі, сувеніры, цацкі і многія іншыя тавары.

Першыя пакупнікі сталічнага гандлёвага аб'екта.

Асаблівасць новага аб'екта — інтэграваная кавярня. У асартыменце 4 віды натуральнай кавы, чорны і зялёны чай па вельмі дэмакратычных коштах.

Як адзначыла **начальнік аддзела гандлю адміністрацыі Першамайскага раёна Марыя СЛАБКО,** аб'екты такога фармату задавальняюць мінчан. Да таго ж прагляд і чытанне перыядычных выданняў можна сумясціць з піццём кавы, а гэта для пакупніка вельмі зручна.

Для наведвальнікаў былі падрыхтаваныя падарункі і сюрпрызы ад кампаній і партнёраў, якія раздалі падчас урачыстага адкрыцця. Першыя сто наведвальнікаў кубачак амерыкана і эспрэса атрымалі ў якасці падарунка. А з 29 лістапада па 6 снежня будзе дзейнічаць акцыя: пры пакупцы тавару ў павільёне на агульную суму ад 3 рублёў даецца зніжка 10% у цырульні «Эдэльвейс» па вул. Гінтаўта, 12А. Таксама пры пакупцы кавы, капучына можна атрымаць бісквітнае пірожнае бясплатна. І самых маленькіх наведвальнікаў чакае сюрпрыз. У падарунак дашкаляты атрымаюць часопіс «Шустрик» выдавецтва «Шапокляк».

У пачатку наступнага года запланавана адкрыццё яшчэ трох павільёнаў з кавярнямі. У студзені — лютым яны будуць устаноўлены на вуліцах Русіянава, Вадалажскага і праспекце Ракасоўскага.

Ганна ЗАНКАВІЧ. Фота аўтара.

Спецыяліст па маркетынгу РУП «Белсаюздрук» Яўген ВЯЛІЧКА разам з начальнікам аддзела гандлю адміністрацыі Першамайскага раёна Марыяй СЛАБКО.

«Снежань. Снежна. Снегіры»

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Снежань ... старое гора канчае, новаму году новым шчасцем дарожку сцеле (прык.). **9.** Снежань ... на вокнах размалёўвае (прык.). **10.** Бясспрэчная ісціна. **11.** Журба. **12.** Карціна на палатне, якая пастаянна займае ўчастак сцяны. **13.** «Падае снег, быццам квецень густая, // Быццам над горадам ... адцвітае». З верша М. Маляўкі «Падае снег». **14.** Востраў у Інданезіі. **17.** «...ідзе, мароз трашчыць, // Цяжка птушкам бедным жыць». З верша М. Сазончыка «Госці». **18.** Студзяністая маса, якая атрымліваецца пры варцы мяса, рыбы. **23.** ... з раніцы пішчаць — будзе мароз (прыкм.). **24.** На Ганкі сядайце на ... (прык.); прысвятак Ганна адзначалі 22 снежня. **25.** Даволі холадна.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. «Мароз — ... і, пыху поўны, // Узносіць слуп на неба роўны». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («На рэчцы»). **2.** Штучнае ператварэнне снегу ў ваду. **3.** Нешта здзіўляючае сваёй незвычайнасцю. **4.** Снежань зіму пачынае, а ... канчае (прык.). **5.** Белы снег, ды не ..., добры зяць, ды не сын (прык.). **6.** Зямельная мера ў некаторых краінах. **7.** Утварэнне лёду з пачаткам зімы. **8.** Калі першага снежня ... — пагодная і ранняя будзе вясна (прыкм.). **15.** Буйная марская рыба. **16.** «Снежань. ... Снегіры // Сані шпарка імчацца». З верша Ю. Півунова «Снежань. ... . Снегіры». **19.** Закончаная частка спектакля. **20.** Рака, прыток Нёмана. **21.** Грунт пад вадой вадаёма. **22.** Хвойнае вечназялёнае дрэва.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

Праверце, калі ласка, адказы

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Месяц. 9. Узоры. 10. Аксіёма. 11. Туга. 12. Пано. 13. Сад. 14. Ява. 17. Снег. 18. Жэле. 23. Сінічкі. 24. Санкі. 25. Свежа. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Мастак. 2. Снегатапленне. 3. Цуд. 4. Год. 5. Сыр. 6. Акр. 7. Лёдаўтварэнне. 8. Пагода. 15. Ласось. 16. Снежна. 19. Акт. 20. Уса. 21. Дно. 22. Ціс.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.06	16.51	7.45
Віцебск —	9.03	16.34	7.31
Магілёў —	8.56	16.41	7.45
Гомель —	8.45	16.46	8.01
Гродна —	9.20	17.08	7.48
Брэст —	9.13	17.16	8.03

Месяц

Поўня 3 снежня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Валянціна, Дзмітрыя, Івана, Міхаіла, Сяргея.*
***К.** Альбіны, Паўліны, Пятра, Рафала, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

2 СНЕЖНЯ

1805 год — адбылася Аўстэрліцкая бітва паміж руска-аўстрыйскім войскам на чале з Міхаілам Кутузавым і арміяй Напалеона. Напалеон, прыкрыўшыся часткай сіл на правым флангу, нанёс удар галоўнымі сіламі на Працэнскія вышыні. Імклівай атакай французы авалодалі вышынямі і рассеклі руска-аўстрыйскі фронт папалам. Некалькі тысяч салдат апынуліся на лёдзе навакольных азёр, французы пачалі біць па іх карцеччу. Саюзнікі пацярпелі поўнае паражэнне. Яны страцілі 27 тысяч чалавек (трэць сваёй арміі). У баі быў паранены Кутузаў. Страты французаў склалі ўсяго 12 тысяч чалавек.

1857 год — на імя віленскага генерала-губернатара Уладзіміра Іванавіча Назімава выдадзены рэскрыпт імператара Аляксандра II аб стварэнні ў заходніх губернях губернскіх камітэтаў па сялянскіх пытаннях; такім чынам пачалася падрыхтоўка сялянскай рэформы і адмены прыгоннага права.

1897 год — нарадзіўся Іван Хрыстафоравіч Баграмян, вядомы савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. Удзельнічаў у ажыццяўленні Беларускай аперацыі 1944 года. За баявыя поспехі ў Беларускай наступальнай аперацыі і праяўленую асабістую мужнасць удастоены звання Герой Савецкага Саюза. У 1945 годзе — камандуючы войскамі 3-га Беларускага фронту. У 1958—1968 гадах — намеснік міністра абароны — начальнік тылу Узброеных Сіл СССР. Памёр у 1982 годзе. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

1902 год — нарадзіўся (ст. Пухавічы) Анатоль Вольны (Анатоль Іўстынавіч Ажгірэй), беларускі паэт, празаік, кінадраматург. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1935). Адзін з заснавальнікаў літаратурнай арганізацыі «Маладняк». Аўтар прыгодніцкай аповесці «Два», аповесці «Антон Савіцкі», кнігі фельетонаў «Суседзі». Па сцэнарыях Анатоля Вольнага пастаўленыя фільмы «Новая радзіма», «Сонечны паход», «Шасцідзясятая паралель» і інш. У 1936 годзе быў арыштаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 годзе.

1917 год — 100 гадоў таму (2—3 снежня) у Магілёве ліквідаваная стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага; 2 снежня Магілёўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт узяў стаўку пад свой кантроль; на наступны дзень яе занялі рэвалюцыйныя войскі на чале з прапаршчыкам Крыленкам, які быў прызначаны галоўнакамандуючым стаўкі замест забітага салдатамі генерала Духоніна.

1927 год — у Маскве адкрыўся XV з'езд ВКП(б), які адобрыў дырэктывы па першым пяцігадовым плане і курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Было сказана

Пімен ПАНЧАНКА,
народны паэт Беларусі:
«Пакідайце і буслу, і чайцы
Больш вады і неба на душу».

УСМІХНЕМСЯ

— А як знайсці добрага стаматолага?
— Шляхам спроб, але запомні: у цябе ўсяго толькі трыццаць дзве спробы!

Учора на прэм'еры «Жаніцьбы Фігаро» з удзелам Ларысы Гузеевай да канца першага акта ажаніўся не толькі Фігаро, але і селянін з масоўкі, рабочы сцэны і два гледачы з першага рада.

— А ты ведаеш, хто самы лепшы настаўнік спеваў?
— Літр гарэлкі.

Ён выйшаў з бара, бадзёра пастукваючы запінкамі па асфальце.

— Клянуся быць з табой у багацці і ў раскошы, у радасці і ў шчасці, у Парыжы і ў Лондане, у тваіх замках і на яхтах...
— Нявеста! Па тэксце, па тэксце...

ГЛЯДЗІ СВАЁ

На «Беларусь 3» стартуе месяц беларускага кіно

У рамках святкавання Дня беларускага кіно, які ў нашай краіне адзначаецца 17 снежня, тэлеканал «Беларусь 3» увесь першы месяц зімы прысвеціць мастацкім і дакументальным фільмам, створаным Белтэлерадыёкампаніяй і кінастудыяй «Беларусьфільм» у розныя гады.

Пачынаючы з 4 снежня канал пакажа ў эфіры беларускія кінастужкі, мультфільмы і тэматычныя праграмы. Папярэднічаць праглядам карцін будуць сустрэчы з вядомымі майстрамі кіно і мастацтва.

З панядзелка ў 12.45 пачне выходзіць цыкл хранікальна-дакументальных фільмаў «Сінематэка» пра гісторыю і развіццё беларускага кіно. Кожны выпуск будзе прысвечаны пэўнаму перыяду кінаіндустрыі Беларусі. Як змяніліся і чым сёння займаюцца акцёры, якія сыгралі любімых герояў у дзіцячых фільмах «Прыгоды Бураціна», «Пра Чырвоны Капялюшык», «Пітэр Пэн», гледачы «Беларусь 3» змогуць убачыць з панядзелка па пятніцу ў 12.20. Вядомы гісторыка-прыгодніцкі шматсерыйны фільм «Дзяржаўная граніца» глядзіце з аўторка па пятніцу ў 21.05.

Прэм'ерай снежня стане аўтарская праграма Уладзіміра Арлова «Люблю і памятаю», першы выпуск якой гледачы ўбачаць ужо 9 снежня. Вядомы беларускі рэжысёр, сцэнарыст, драматург і пісьменнік успомніць тых, з кім у свой час звёў яго лёс. Ён адкрые малавядомыя факты біяграфіі знакамітых кінематаграфістаў, пісьменнікаў, кампазітараў і акцёраў, з якімі сябраваў, працаваў і цесна меў зносіны.

У рамках праекта «Час кіно» кандыдат мастацтвазнаўства Наталля Сцяжко пазнаёміць тэлегледачоў «Беларусь 3» з вынікамі Нацыянальнага конкурсу беларускіх фільмаў, які чацвёрты раз праходзіў на Міжнародным кінафестывалі «Лістапад». Традыцыйна ў пятніцу вечарам у рамках праграмы «Час кіно» будуць паказаны дыпломныя студэнцкія работы выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

17 снежня, у Дзень беларускага кіно, гледачоў канала чакае адразу некалькі прэм'ер. Мастацкі фільм Аляксандра Анісімава «Сляды на вадзе» раскажа пра барацьбу беларускай міліцыі з бандытызмам у пасляваенныя гады. Жыццё і творчасць выдатнага кінарэжысёра, народнага артыста СССР Віктара Турава, аўтара карцін «Праз могілкі», «Я родам з дзяцінства», «Сыны ідуць у бой», «Людзі на балоце» і іншых, тэлегледачы ўбачаць у дакументальным фільме Яўгена Сяцько «Віктар Тураў. Дыханне жыцця». Працягне тэматычны эфір і дакументальны фільм «Чорны крумкач», які закране тэму ваеннапалонных Другой сусветнай вайны — адну з асноўных у творчасці кінарэжысёра Анатоля Алая. І гэта невыпадкова, бо ваеннапалонным быў і яго бацька, ваенны ўрач Іван Алай.

Тэлеканал «Беларусь 3» запрашае тэлегледачоў правесці месяц беларускага кіно разам!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4427.
Нумар падпісаны ў 19.30 1 снежня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12